Мароз і сонца: выдатнае зімовае надвор'е. Такое, па якім людзі сумавалі апошнія гады, калі зіма была больш падобная на шэрую познюю восень, што доўжыцца бясконца. Цяпер зіма ёсць, але мароз «кусаецца». СТАР 3

Для адных студэнцкія гады — самыя бесклапотныя. Для другіх жа — гэта штодзённая праца. Могуць быць і трэція — у якіх неверагодным чынам атрымлівалася спалучаць адно з другім. СТАР 4

Стаміўшыся ад беспрасветнага холаду на вуліцы, многія пачынаюць марыць пра адпачынак і цеплыню. Як знайсці кавалачак лета і прыемныя ўражанні, не выязджаючы за межы снежнай Беларусі? СТАР 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 СТУДЗЕНЯ 2013 г. СЕРАДА № 13 (27378) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СТРОГІ ПАРАДАК І ВЫКАНАННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА Ў СФЕРЫ ПАЛЯВАННЯ

Прэзідэнт Беларусі ўчора правёў рабочую паездку з міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Уладзімірам Цалко, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што запрасіў міністра для таго, каб з першых вуснаў пачуць заключэнне па законапраекце «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання», які прыняты парламентам. Гэтым дакументам уносяцца дапаўненні і змяненні ў законы «Аб ахове навакольнага асяроддзя», «Аб раслінным свеце» і «Аб жывёльным свеце».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўдзяляе гэтай тэме вялікую ўвагу. «Вы ведаеце пра мае адносіны да навакольнага асяроддзя, прыроды. Я аб гэтым вымушаны быў нават гаварыць у кароткім навагоднім звароце да беларускага народа. Гэта вечная каштоўнасць, дадзеная нам зверху, — адзначыў Прэзідэнт. — Але мяне апошнім часам насцярожваюць некаторыя нядобрыя тэндэнцыі ў гэтых адносінах, пачынаючы ад нашых паляўнічых, асабліва пачынаюць засвечвацца высокапастаўленыя службовыя асобы ў гэтым, мякка кажучы, «малазаконным» паляванні, калі плацяць непасрэдна егерам і іншае, забываюць аб тым, што ў нас устаноўлены жорсткі ў гэтых адносінах парадак. Але гэта не толькі прэтэнзіі да вас, гэта, перш за ўсё, прэтэнзіі да Інспекцыі (Дзяржінспекцыя аховы жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце Беларусі)».

«Я хачу, каб усе ведалі, што гэта сітуацыя ў нас пад кантролем. Калі ласка, ездзіце на паляванне, у нас сёння дастаткова звяроў, нават некаторыя скардзяцца, што залішняя колькасць. Але павінен быць жорсткі парадак», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў занепакоенасць тым, што ў Беларусі з'явілася шмат розных паляўнічых гаспадарак, да работы якіх іншым разам узнікае нямала пытанняў. «З'явілася вельмі шмат паляўнічых гаспадарак, у тым ліку прыватных, і ўгоддзяў, якія належаць калгасам, саўгасам і прадпрыемствам, і там у нас праблем значна больш, чым у традыцыйных паляўнічых гаспадарках і ўгоддзях», — адзначыў Прэзідэнт.

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, ці вырашаюцца змяненнямі ў законе існуючыя ў гэтай сферы праблемы і ці не абыходзяцца яны бокам.

Паводле слоў Уладзіміра Цалко, законапраект быў распрацаваны з улікам прынятых апошнім часам нарматыўна-прававых дакументаў, рэгулюючых гэту сферу. Акрамя таго, заканадаўства прыводзіцца ў адпаведнасць з міжнародным правам у галіне аховы навакольнага асяроддзя, жывёльнага і раслінага свету і тымі абавязацельствамі, якія Беларусь узяла на сябе, падпісаўшы міжнародныя дагаворы.

Прэзідэнта ў першую чаргу цікавіла, ці не будзе гэтымі змяненнямі аслаблена ахова жывёльнага і раслінага свету, што ад гэтага атрымаюць жыхары Беларусі. Міністр запэўніў, што прыродаахоўнае заканадаўства ў гэтым плане нічога не страціць, але яно стане прасцейшым у прымяненні, спрашчаюцца некаторыя нормы, выключаюцца асобныя артыкулы, у якіх сёння ўжо няма неабходнасці.

Па выніках рабочай сустрэчы Уладзімір Цалко паведаміў, што кіраўнік дзяржавы падпісаў названы Закон.

Што датычыцца рэгулявання паляванне і рыбалоўства, па гэтым пытанні падрыхтаваны асобны праект указа, які цяпер знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта. У ім адлюстраваны раней дадзеныя кіраўніком дзяржавы даручэнні.

ЗАПАВЕДНІК ЧАКАЕ ПЕРАЎТВАРЭННЯ, ЗУБРЫ — ДОГЛЯДУ І АХОВЫ



Прэзідэнт Беларусі падпісаў указ пра пераўтварэнне Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка, у якім гаворыцца пра змяненне межаў, рэжыму аховы і выкарыстання тэрыторыі. Будзе ўсталявана ахоўная зона па перыметры межаў запаведніка шырынёю ў адзін кіламетр, у якой уводзяцца забароны на вядзенне некаторых відаў гаспадарчай дзейнасці. У тым ліку на паляванне і прамысловы адлоў рыбы, скідванне ў водныя аб'екты забруджаных сточных водаў, правядзенне суцэльных высечак лесу і іншыя віды гаспадарчай дзейнасці, якія могуць негатыўна паўплываць на прыродныя комплексы запаведніка.

— Вельмі спадзяёмся, што з гэтым пераўтварэннем ахова дзікай прыроды ўнікальнага запаведніка (дарэчы, самага буйнога ляснога масіву ў паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі) стане яшчэ лепшай і што запаведная тэрыторыя будзе для дзікіх жывёл сапраўдным домам, у якім яны будуць не часовыя госці, а сталыя гаспадары, — выказвае свае спадзяванні **вядучы супрацоўнік аддзела экалогіі фаўны навуковага аддзела запаведніка кандыдат біялагічных навук Таццяна ДЗЯРАБІНА** (на фотаздымку).

Што датычыць зубрынага статку Палескага запаведніка, па назіраннях навукоўцы, пагалоўе штогод павялічваецца і дасягнула амаль 90 асобін. Гэтаму спрыяе 25-гадовая адсутнасць антрапагеннага ўздзеяння. Яшчэ вельмі радуе навукоўцаў запаведніка, што тут прыжыліся коні Пржавальскага і вялікая колькасць звяроў і птушак-чырванакніжнікаў.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль БРАТАШ, дырэктар «Газпрамнафта-Белнафтапрадукт»:

«Сёння рознічны рынак нафтапрадуктаў у краіне недастаткова насычаны. Па колькасці АЗС на 10 тыс. чалавек насельніцтва мы значна адстаём ад суседніх краін. Так, калі ў нас прыходзіцца 0,8 АЗС на 10 тыс. чалавек, то ў Расіі і Польшчы — 1,8 АЗС. У Аўстрыі ж гэты паказчык і зусім дасягае 3,4 АЗС на 10 тыс. чалавек. У той жа час па ўзроўні аўтамабілізацыі Беларусь знаходзіцца ў ліку лідараў. У краіне на 1 тысячу чалавек прыходзіцца 270 аўтамабіляў, тады як у Расіі і Польшчы — 230 і 243 адпаведна. Што немалаважна, у спажыўцоў нафтапрадуктаў у Беларусі растуць патрабаванні да іх якасці, узроўню сэрвісу і даступнасці АЗС. Над гэтым мы працуем».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 6°
Віцебск	– 10°
Гомель	– 9°
Гродна	– 9°
Магілёў	– 9°
Мінск	– 9°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.01.2013 г.

Долар ЗША	8640,00	▲
Еўра	11540,00	▲
Рас. руб.	286,00	▲
Укр. грыўня	1063,38	▲

ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ І НОВЫ ПОГЛЯД НА САЦЫЯЛЬНУЮ СФЕРУ

Інфармацыйныя тэхналогіі за апошнія 20 гадоў сталі не толькі неад'емным элементам дзейнасці традыцыйных галін эканомікі і асновай новых галін, але і краевугольным каменем сучаснай палітыкі, масавых камунікацый, культуры. Пра тое, як Беларусь рэалізуе патэнцыял новых тэхналогій і якія магчымасці можа атрымаць, часопісу «Проблемы управления» расказаў міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі. «Звязда» знаёміць сваіх чытачоў з яго меркаваннем па гэтай праблематыцы.

Развіццё інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій у свеце прывяло ў пачатку XXI стагоддзя не толькі да пераўтварэння пад іх уплывам усіх сфер дзейнасці чалавека, але і да фарміравання новых галін эканомікі, а таксама якаснага змянення самой жыццядзейнасці чалавека.

З аднаго боку, гэты працэс спарадзіў нямала міфаў і калянавуковых ідэалагічных канструкцый, звязаных з перабольшаннем значэння тых або іншых тэхналагічных рашэнняў. Так, яшчэ і сёння, але асабліва — на заранку станаўлення «лічбавай эканомікі», былі папулярныя яўна нерэалістычныя ацэнкі новай эканомікі, што ўзнікала, як нерэсурсаёмістай, дэцэнтралізаванай, якая дае вялізныя магчымасці самазанятасці і гэтак далей.

З часам, аднак, высветлілася, што для стварэння буйных і паспяховых бізнэс-структур у лічбавым сектары патрэбны вялізныя грошы, а паўсюднае ўкараненне лічбавых рашэнняў у традыцыйныя індустрыі зрабіла іх значна больш капіталаёмкімі. СТАР 4

■ Сустрэча без абцасаў

«ВЫХОДЗІЦЬ ЗАМУЖ ТРЭБА ПА КАХАННІ!»

Фота Надзеі БУЖАН

Як выхаваць Жанчыну ў самым высокім сэнсе гэтага слова: Мадонну, якой будуць прысвячаць вершы, цалаваць рукі і дарыць кветкі? І чаму так важна выбраць прафесію па душы? Пра гэта і не толькі гутарым з дырэктарам адзінай у Беларусі гімназіі, дзе вучацца толькі дзяўчынкі. Людміла Вітальеўна ТАЛМАЧОВА прызналася, што толькі з прыходам у Жодзінскую жаночую гімназію даведалася, што яе матуля таксама навучалася ў падобнай установе.

ПРА КАНДАЛІЗУ РАЙС, ЧОРНА-БЕЛЫ ФОТАЗДЫМАК І СЕМ'ЯЗНАЎСТВА

Я заканчвала звычайную жодзінскую школу. Калі б у той час у горадзе была жаночая гімназія, то, не раздумваючы, выбрала б яе. Навучанне ў раздзельных школах лічыцца прэстыжным у Еўропе і Амерыцы. Кандаліза Райс, Маргарэт Тэтчэр і іншыя паспяховыя жанчыны скончылі менавіта жаночыя гімназіі. Вельмі шмат іх і ў краінах постсавецкай прасторы, а ў Беларусі толькі адна... А да 1956 года, між іншым, ва ўсім СССР была раздзельная адукацыя. СТАР 3

■ Завочная прамая лінія

ПЕРАЛОМУ МОЖНА ПАЗБЕГНУЦЬ

Ці можна выявіць астэапароз на ранніх этапах? З якога моманту неабходна задумвацца аб даследаванні мінеральнай шчыльнасці косцяной тканкі? Як засцерагчыся пераломаў, калі косці ўжо ломкія? На гэтыя і іншыя вашы пытанні, шаноўныя чытачы, адкажа **прафесар, доктар медыцынскіх навук, кіраўнік Мінскага гарадскога цэнтра прафілактыкі астэапарозу Эма Уладзіміраўна РУДЭНКА**.

Пытанні пакідайце, калі ласка, па рэдакцыйным нумары **8 (017) 287 18 29 да 28 студзеня**.

Адказы будуць надрукаваны на старонках газеты «Звязда».

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ТУРЦЫЯ АТРЫМАЛА НЯМЕЦКІЯ І ГАЛАНДСКІЯ КОМПЛЕКСЫ PATRIOT

У Турцыю 21 студзеня даставілі 4 батарэі зенітных ракетных комплексаў Patriot: дзве з Германіі і дзве з Нідэрландаў. ЗРК Patriot даставілі ў турэцкі порт Іскендэрун морам. На нямецкім караблі ў Турцыю таксама прыбыў кантынгент з 300 ваеннаслужачых для забеспячэння ЗРК. Шэсць батарэй ЗРК Patriot пры падтрымцы 350 вайскоўцаў Турцыя плануе размясціць на поўначы ад сірыйскай мяжы. Як раней заяўлялі прадстаўнікі НАТА, ЗРК плануецца выкарыстаць выключна для абароны паветранай прасторы Турцыі і прыкрыцця 80-кіламетровай зоны ўздоўж сірыйска-турэцкай мяжы. Супраць размяшчэння ЗРК на мяжы з Сірыяй, дзе працягваецца грамадзянская вайна, выступалі Расія, Іран і Сірыя.

ААН ПРАДКАЗАЛА РЭКОРДНЫ РОСТ СУСВЕТНАГА БЕСПРАЦОЎЯ

Колькасць беспрацоўных у свеце дасягне рэкорду ў 2013 годзе. Пра гэта паведамляе Agence France-Presse са спасылкай на даклад Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), якая ўваходзіць у склад ААН. Па прагнозах МАП, у гэтым годзе колькасць беспрацоўных вырасце па ўсім свеце на пяць мільёнаў да 202 мільёнаў чалавек. Па прагнозах МАП, у 2014 годзе колькасць беспрацоўных вырасце яшчэ на тры мільёны, а да 2017 года паказчык дасягне 210,6 мільёна чалавек. Працэнт беспрацоўных ад усяго эканамічна актыўнага насельніцтва планеты будзе трымацца на ўзроўні ў шэсць працэнтаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЛІТВА ЗАМАРОЗІЛА ЗВЯЗАНЫЯ СА СПРАВАЙ МАГНІЦКАГА РАХУНКІ

Літва замарозіла рахункі шэрагу кампаній, на якія, як меркавалася, паступалі сродкі ад крадзяжоў, выяўленых раней юрыстам фонду Hermitage Capital Сяргеем Магніцкім.

Магніцкі ў 2007 годзе выявіў у Расіі схему крадзяжу бюджэтных сродкаў, да якіх, па яго даных, мелі дачыненне супрацоўнікі сілавых структур. У маі 2011 года стала вядома, што ў Credit Suisse замарожаныя рахункі некаторых расійскіх чыноўнікаў, як мяркуецца, мелі дачыненне да выяўленых Магніцкім крадзяжоў. У 2012 годзе Hermitage Capital звярнуўся ў пракуратуры шасці краін (Латвіі, Літвы, Эстоніі, Аўстрыі, Кіпра і Фінляндыі) з просьбай замарозіць рахункі ў банках, праз якія раней, як мяркуецца, праводзіліся выкрадзеныя грошы. У Літве ў сувязі з гэтым былі замарожаны рахункі ўсіх афшорных кампаній, якія ажыццяўлялі транзакцыі праз банк Ukio bankas. Гэтыя рахункі кіраваліся з Расіі і Украіны, дзе дзейнічаюць філіялы вышэйзгаданага банка. Усяго праз гэтыя рахункі было пераведзена каля 13 мільёнаў долараў.

КАРОТКА

Запасы гатовай прадукцыі ў прамысловасці Беларусі па стане на 1 студзеня 2013 года знізіліся і склалі ў фактычных цэнах Br22,2 трлн, або 56,5% сяреднямесячнага аб'ёму вытворчасці.

21 студзеня на аўтамабільных дарогах рэспубліканскага значэння ў Беларусі было задзейнічана 519 снегаачышчальнікаў і 388 пескасолеразмеркавальнікаў. Для ўтрымання магістралей у належным стане таксама было арасходавана 8 тыс. тон песка-саляной сумесі і 500 тон чыстай солі.

Да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года ў Мінску плануецца ўстанавіць каля 400 новых грамадскіх пунктаў доступу ў інтэрнэт па тэхналогіі Wi-Fi. Цяпер у Мінску ўстаноўлена 712 стацыянарных пунктаў доступу Wi-Fi. За паўтара года іх колькасць плануецца павялічыць больш як у 1,5 раза.

Паклоннікі міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне» назвалі «Litesound» лепшымі выканаўцамі за апошнія 10 гадоў. Група атрымала міжнародную прэмію «EUROSTAR AWARD-2012» на конкурсе, які штогод праводзіцца адным з папулярных сайтаў «Еўрабачання».

Крэдытная запазычанасць фізічных асоб Беларусі за 2012 год павялічылася на Br8,2 трлн, або на 25,6%, і на 1 студзеня 2013 года дасягнула Br40,2 трлн.

Адна дзяўчына расказала мне, што вельмі хоча, каб у яе было шмат дзяцей. Сямёра як мінімум. І аказалася, што далёка не ўсе здольныя зразумець такую мару...

ЯК ВЫ ЛІЧЫЦЕ: НАЯЎНАСЦЬ У СЯМ'І БОЛЬШ ЗА ТРАІХ ДЗЯЦЕЙ — ГЭТА ВАР'ЯЦТВА ЦІ ШЧАСЦЕ?

Тамара ЛІСІЦКАЯ, празаік, тэлерадыёвядучая, маці траіх дзяцей:

— Гэта вар'яцкае шчасце! Гэта шумна і клапотна. Але калі хочацца, каб было шмат дзяцей, то не трэба сумнявацца і думаць, як гэта будзе выглядаць для старонніх. Няхай лічаць вар'ятамі, яшчэ якімі-небудзь... Галоўнае, каб вы не пашкадавалі аб тым, што не дазволілі сабе такое шчасце, як шматдзетнасць, калі была магчымасць.

Сяргей ФІЛІМОНАЎ, аўтар тэлепраграмы «Відзьма-нявідзьма»:

— Нават і не ведаю, як мне адказаць на вашае пытанне. Таму што ў нашай сям'і ніколі не было столькі дзяцей... І мне невядома, шчасце гэта ці што... Запытаўся б у дзеда, ды ён даўно памёр. У яго шчаслівай сям'і было шасцёра дзяцей. Адно магу сказаць, што колькасць дзяцей у сям'і, на маю думку, ніяк не ўплывае на стан «шчасце-няшчасце». Гэта пачуццё складаецца зусім з іншых рэчаў. Са стасункаў паміж людзьмі, з таго, што адбываецца ў дзяржаве, ці ёсць у людзей магчымасць зарабіць сваёй працай, ці здолее дзяржава забяспечыць тым бацькам, тым дзецям годны ўзровень жыцця, які адпавядае сучасным патрабаванням. Ці дастаткова грошай, каб гадаваць тых дзяцей. Ці дастатковы ўзровень інтэлекту, каб выхаваць дзяцей і яны выраслі без комплексаў. Ну, і гэтак далей. Шмат вонкавых умоў, ды яшчэ ўсяго, што тычыцца асабістых якасцяў бацькоў. Размова бясконцая ды неканкрэтная. Будзеш разважаць-разважаць, а як сутыкнемся з рэчаіснасцю, дык усе тэорыі накрыюцца медным тазам.

Марына КАЗАК, бухгалтар ТАА «Артокс Медыя»:

— Я не лічу, што гэта вар'яцтва. У мяне ёсць родная сястра, без якой сваё жыццё я не ўяўляю! Калі мы былі маленькімі (а гэта пастаянныя гульні, якія-небудзь ідэі), нам заўсёды было весела, цікава. Нам ніколі не было ўдваіх сумна. Зараз мы пасталелі, у кожнай ёсць свая сям'я, і мы добра ўсе разам сябруем. Гэта цудоўна, што ў мяне ёсць такі родны чалавек, як сястра. І маці вельмі рада, што ў яе ёсць мы. Што ж датычыцца «больш за трое дзетак», то ў гэтым выпадку ў мяне ёсць выдатны прыклад. У маёй стрыечнай цёткі пяцёра дзяцей! Гэта настолькі дружная і шчаслівая сям'я! Дзеці вельмі добрыя і спагадныя. Гэту сям'ю «вар'яцтвам» я ніяк не магу назваць. Безумоўна, бываюць сітуацыі, калі сям'я не ў сілах вырасціць і выхаваць больш за дваіх дзяцей. І прычыны на тое бываюць розныя. Але ж калі ёсць магчымасць і жаданне, то можна і чацвёра, і пяцёра!.. Праз свой малады ўзрост я змагла адказаць толькі прыкладамі з жыцця. Гэтыя прыклады ў мяне асацыююцца толькі са шчаслівымі сем'ямі. Сама я замужам, і мой муж вельмі хоча, каб у будучыні ў нашай хаце дзіцячы смех быў чуваць не менш чым ад траіх дзетак.

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ПРЭЗІДЭНТ ДАРУЧЫЎ МАКСІМАЛЬНА СПРАСЦІЦЬ ПРАЦЭДУРУ АДВОДУ ЗЯМЕЛЬ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даручыў максімальна спрасціць працэдуру адводу зямель, пакінуўшы для разгляду на ўзроўні кіраўніка дзяржавы толькі адвод значных зямельных участкаў. Такую задачу ён паставіў 22 студзеня ў час сустрэчы са старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Георгіем Кузняцовым, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

У цэнтры ўвагі быў разгляд праекта закона аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на важнасць гэтага пытання, паколькі рашэнне аб адводзе канкрэтных зямельных участкаў пад будаўніцтва, для іншых мэт, прымаецца Прэзідэнтам і ўяўляе сабой вялікі аб'ём работы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што неабходна прадоўжыць сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта выпрацоўку сістэмы прыняцця такіх рашэнняў. «Хутчэй за ўсё, нам трэба вось такія рашэнні, якія датычацца часовага адводу зямель, адводу зямель пад лініі электраперадач і да таго падобныя аб'екты, інакш кажучы, нязначных адводаў і якія не падлягаюць ніякаму сумненню, аддаць на ўзровень аблвыканкамаў. Я не супраць. Трэба разгледзець гэта пытанне», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Але істотныя плошчы зямельных угоддзяў: лясных угоддзяў, лугоў, пашы і гэтак далей — вось гэты адвод павінен знаходзіцца пад кантролем Прэзідэнта. Гэта адназначна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы даручыў прадугледзець у гэтым плане максімальнае спрашчэнне, пакінуўшы для разгляду на ўзроўні Прэзідэнта толькі адвод значных зямельных участкаў. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў чыноўнікаў аб недапушчальнасці злоўжывання ўладай пры прыняцці такіх рашэнняў. «Я хацеў бы пачуць каментарый да гэтага закона, перш чым я яго падпішу, па ўсіх змяненнях, якія вы ўносіце, з той мэтай, ці не пасадзейнічае гэта таму, што ў нас ізноў пачнецца разбой пры адводзе зямель», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён прывёў прыклад такіх непрадуманых рашэнняў: «Калі трэба ферму пабудаваць, значыць, на новым месцы, за край свету ад канкрэтнага населенага пункта, куды трэба праводзіць дарогу, электрычнасць, прыродны газ, інакш кажучы будаваць інфраструктуру. Нясём вялікія затраты. Гэта ненармальна». «Прытым па кар'ерах паглядзіце. Як толькі мы «ўніз» аддаём гэтыя рашэнні, з'яўляецца вялізная колькасць кар'ераў па краіне. Я, пралятаючы на верталёце, гэта ўсё бачу. Таму тут таксама разбою быць не павінна, калі будзем гаварыць аб часовым адводзе зямель. Гэта наносіць непапраўную шкоду нашай краіне», — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў больш жорстка ставіцца да адводу і прадастаўлення сельскагаспадарчых зямель для несельскагаспадарчых мэт, аднаўляючы ўзамен адведзеных раўнацэнныя, роўнавялікія плошчы. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы даручыў звяртаць больш пільную ўвагу на прадастаўленне паляўнічых угоддзяў і зямельных участкаў для будаўніцтва аб'ектаў нерухомай маёмасці на тэрыторыі паляўнічых угоддзяў.

НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАННЯ

Гэтая сфера абслугоўвання насельніцтва ў нашай краіне даволі актыўна развіваецца. Перад галіной пастаўлены смелыя задачы па тэхнічным пераўзбраенні спецыялізаваных прадпрыемстваў і ўвогуле па мадэрнізацыі вытворчасці, паведаміла ўчора на адкрыцці выстаўкі «Беллегмаш» у Мінску намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На адной пляцоўцы разам з выстаўкай «Беллегмаша» арганізаваныя і тэматычныя выставы «Адзенне. Абутак. Тэкстыль», «Усё для швейніка», «Працоўная вопратка», «Хімчыстка і пральня», «Чысціня і гігіена». У гэтым маштабным мерапрыемстве прымаюць удзел каля 90 кампаній з 10 краін.

Сваю прадукцыю на выставе прапануюць сусветныя лідары па праграмным забеспячэнні фірмы «Lectra» з Германіі, вытворцы тэкстыльнага і швейнага абсталявання з Нідэрландаў і Італіі, буйныя спецыялізаваныя кампаніі з Чэхіі, Польшчы, Кітая, Расіі і іншыя.

На пляцоўках міжнароднай выставы прадстаўлена шмат самага сучаснага прафесійнага абсталявання і машын для тэкстыльнай прамысловасці і вырабу абутку. Спажыўцам прапануецца азнаёміцца з цэлымі комплексамі для прыбірання, таварамі-навінкамі гігіены і санітарыі, абсталяваннем і сродкамі для хімчыстак, спецвопраткай і спецабуткам.

Сапраўды аб'ёмна тут прадстаўлена спецыялізаваная прадукцыя і новыя распрацоўкі перадавых беларускіх брэндаў. Удзельнічаюць на выставе і такія структуры, што пастаўляюць на рынак розныя спецыялізаваныя хімічныя сродкі. «Выкарыстоўванне сучаснага абсталявання, новых тэхналогій і матэрыялаў стварае перадумовы для таго, каб айчынныя прадпрыемствы бытавога абслугоўвання ажыццяўлялі сапраўды якасныя і прафесійныя паслугі для насельніцтва нашай краіны», — адзначыла спадарыня Наркевіч.

Яна ўпэўнена, што на форумах такога ўзроўню беларускім бокам ствараюцца самыя спрыяльныя ўмовы для паспяховага супрацоўніцтва розных бізнэс-структур, калі ажыццяўляецца пошук партнёраў і інвестараў або падпісваюцца пагадненні на пастаўку абсталявання, сучасных тавараў і тэхналогій.

Арганізатары выстаў запланавалі правесці ў гэты час мноства прыкладных мерапрыемстваў. Гэта будуць спецыялізаваныя семінары, «круглыя сталы», прэзентацыі, майстар-класы і дэманстрацыі тэхналагічных навінак.

Генеральны дырэктар кампаніі TEXITA Франка Трэпа спецыяльна прыляцеў у Мінск на выставу з Італіі:

— Мы прадаём у вашай краіне абсталяванне для тэкстыльнай прамысловасці. На тэрыторыі былога Саюза мы прысутнічаем ужо больш за 14 гадоў. Каля 10 гадоў таму адкрылі сваё прадстаўніцтва ў Мінску. Зараз наша кампанія не толькі прадае абсталяванне, але і вядзе пошук максімальна спрыяльных для вашай краіны тэхналогій, якія потым паспяхова ўкараняюцца ў вытворчасці.

За апошні час галоўнымі партнёрамі кампаніі TEXITA сталі вядомыя тэкстыльныя прадпрыемствы ў Оршы, Баранавічах і Віцебску.

Адказваючы на пытанні карэспандэнта «Звязды» Франка Трэпа адзначыў, што за апошнія гады працаваць у Беларусі стала значна лягчэй. Пра гэта сведчыць той факт, што летась кіраўнік кампаніі TEXITA наведваў Мінск 14 разоў.

— Зараз я стаў своеасаблівым кансультантам сярод сваіх калег з Італіі, якія супрацоўнічаюць з вашай краінай, — паведаміў Франка Трэпа.

Сяргей КУРКАЧ.

«ХТО НЕ РАЗУМЕЕ СЛОЎ, АТРЫМАЕ ПА ГАЛАВЕ...»

Так метафарычна ахарактарызаваў пазіцыю Нацбанка адносна банкаўпарушальнікаў Сяргей ДУБКОЎ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі, калі расказваў пра новую рэдакцыю Банкаўскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Яна нарэшце ўступіла ў сілу. Абмеркаванне змяненняў ідзе ўжо даўно. Аднак Нацыянальны банк яшчэ раз патлумачыў асноўныя палажэнні новага дакумента. «Звязда» друкуе найбольш карысныя і цікавыя для чытачоў каментарыі.

БОЛЬШАЯ ПРАЗРЫСТАСЦЬ КРЭДЫТАВАННЯ

Сяргей Дубкоў размеркаваў асноўныя навацыі не з пункту гледжання прыярытэтнасці, а з пункту гледжання перспектыўнасці. Па-першае, гэта электронныя грошы. «Упершыню ў заканадаўстве зафіксавана паняцце электронных грошай. Гэта паказвае, што беларускія банкі эфектыўна з імі працуюць. Мала таго, гэта найбольш перспектыўны кірунак развіцця банкаўскага бізнэсу». Па-другое, карткі. Адбылося не толькі змяненне фармуліроўкі: не банкаўская пластыкавая картка, а плацежная картка. Акрамя гэтага, Нацыянальны банк спрасціў і фармалізаваў многія пытанні па выкарыстанні картак, што будзе спрыяць развіццю безнаяўных плацяжоў. «І гэтыя навацыі не з'яўляюцца ўнікальнымі. Яны зараз адбываюцца паўсюль. Калі ацэньваць развіццё адпаведнай інфраструктуры, то Беларусь можа супастаўляцца, напрыклад, з Германіяй». Па-трэцяе, банкаўская камісія ў крэдытах. Гэта, напэўна, найбольш сенсацыйнае нововвядзенне. Прынамсі, яно больш за ўсё цікавіць людзей. Банкі ўжо ў чацвёртым квартале 2012 года пачалі пераходзіць на поўную працэнтную стаўку, без камісій. Цяпер жа, пасля ўступлення ў сілу новага Банкаўскага кодэкса, усе банкі абавязаны даваць толькі поўную працэнтную стаўку. Нацыянальны банк прымаў такую норму для таго, каб зрабіць крэдытаванне больш празрыстым. «Насельніцтва павінна ведаць аб'ектыўную інфармацыю аб працэнтных стаўках, а таксама яно павінна ўмець карыстацца рознымі фінансавымі інструментамі».

«ЗВЯЗДА» НАГАДВАЕ

Нумар тэлефона Кантакт-цэнтра Нацыянальнага банка Беларусі — (8-017) 306-00-02. Туды можна звярнуцца з любымі пытаннямі, што знаходзяцца ў кампетэнцыі Нацбанка, у тым ліку датычных новай рэдакцыі Банкаўскага кодэкса.

Для гэтага, акрамя новага кодэкса, будзе працаваць зацверджаны 17 студзеня план сумесных дзеянняў органаў дзяржаўнай улады і ўдзельнікаў фінансавага рынку па павышэнні фінансавай адукаванасці на 2013-2018 гады. «Пасля прыняцця адпаведнай праграмы можна будзе казаць пра тое, што Беларусь завяршыла фарміраванне сістэмы павышэння фінансавай адукаванасці». Пра попыт на фінансавую інфармацыю сведчыць запатрабаванасць кантакт-цэнтра Нацбанка (за паўгода туды звярнулася больш за 5 тысяч юрыдычных і фізічных асоб). Дарэчы, Сяргей Дубкоў лічыць, што «поўная працэнтная стаўка, магчыма, «прахалодзіць» тых людзей, якія прымаюць вельмі хуткія рашэнні пры атрыманні крэдытаў. У дачыненні да грошай нельга так легкадумна сябе паводзіць. Трэба мець выразнае ўяўленне пра свае фінансавыя магчымасці, пра сваю плацежаздольнасць».

КАМІСІІ ЗАСТАНУЦЦА ТОЛЬКІ ПА СТАРЫХ КРЭДЫТАХ

Зразумела, што банкі могуць паспрабаваць знайсці спосабы абыходу новай безкамісійнай нормы. Аднак Сяргей Дубкоў заявіў: «Можна падмануць і нас, і сябе, але на вельмі кароткі прамежак часу. Пасля будуць вельмі сур'ёзныя наступствы такіх паводзін, у тым ліку рэпутацыйныя, ад размовы да пазбаўлення ліцэнзій. Тыя, хто не разумее слоў, атрымліваюць па галаве. Гэта калі прамым тэкстам. Тым больш ёсць такі інструмент, як абмежаванне максімальнай працэнтнай стаўкі па крэдытах». Дарэчы, камісіі ў крэдытах застануцца толькі па старых крэдытных дагаворах, у новых гэта ўжо незаконна.

ДЭВАЛЬВАЦЫЯ І СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ

Мікалай ЛУЗГІН, першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі, адказаў на некалькі пытанняў, не звязаных непасрэдна з Банкаўскім кодэксам. Так, ён расказаў, што, згодна з асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі, да канца года стаўка рэфінансавання прагназуецца на ўзроўні 13-15%. «Калі і як яна будзе змяняцца, тут выразных крытэрыяў няма». Наконт дэвальвацыі Мікалай Лузгін сказаў наступнае: «Пры інфляцыі, якая запланавана на гэты год 10-12%, відаць, павінна быць нейкая невялікая дэвальвацыя. Але калі яна будзе плаўнай і будзе рост даходаў насельніцтва, нічога страшнага не адбудзецца».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ Парламенцкі дзённік

Дэпутаты падтрымалі ідэю крымінальнай адказнасці даўжнікоў

Такая прапанова прагучала падчас выязнога пасяджэння Пастаянай камісіі ніжняй палаты парламента

На прыкладзе Фрунзенскага раёна горада Мінска — самага буйнога па колькасці жыхароў не толькі ў сталіцы, але ва ўсёй Беларусі — парламентарыі азнаёміліся з практыкай прымянення жыллёвага заканадаўства. Пастаянная камісія па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве на чале са старшынёй Уладзімірам ПУЗЫРЭЎСКІМ наведала мікрараён Каменная Горка, разлікова-касавы цэнтр абслугоўвання насельніцтва і правяла пашыранае пасяджэнне з удзелам кіраўніцтва адміністрацыі раёна, міністэрства ЖКГ, камунальных службаў і жыллёва-будаўнічых кааператываў.

РАЗМОВА ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Трэба сказаць, што з 5 членаў камісіі няма ніводнага навічка ў гэтай сферы, а трое — былыя кіраўнікі камунальных службаў. Усе яны добра ведаюць праблемы ЖКГ, таму размова адразу склалася на ўзроўні прафесіяналаў. Недахоп садкоў і школ у новабудоўлях, праблема прыбірання вуліц, якія здаюцца ў эксплуатацыю пазней за жылыя дамы, непрадуманыя транспартныя развязкі і дваровыя тэрыторыі, парушэнне правоў жыхароў шматпавярховых дамоў з боку ўладальнікаў нерухомасці, інертнасць старшынь жыллёвых кааператываў, адмова акумуліраваць сродкі на капітальны рамонт таварыствамі ўласнікаў новых дамоў і наступствы гэтага, калі дамы перастаюць быць новымі... Парламентарыі засыпалі спецыфічнымі пытаннямі не толькі дырэктара ЖРЭА №2 Фрунзенскага раёна горада Мінска Сяргея КАНДРУЦКАГА, але і дырэктара ЖЭСа, і спецыяліста службы «Адно акно».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Чысціня і прыгажосць — справа не толькі спецыяльных службаў, але і кожнага з нас.

У сваю чаргу, жыхары раёна пыталіся ў дэпутатаў, як уздзейнічаць на нядобрасумленных будаўнікоў, дзе шукаць дапамогі пры навядзенні парадку на вуліцы, а супрацоўнікі камунальных службаў прапанавалі прыцягваць да крымінальнай адказнасці тых, хто адмаўляецца аплачваць камунальныя паслугі. Уладзімір Пузырэўскі падтрымаў прапанову. Старшыня камісіі таксама звярнуў увагу на своечасовасць Указа Прэзідэнта Беларусі №13 ад 6 студзеня 2012 года, які датычыцца аказання дзяржпадтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) ці набыцці жылых памяшканняў. Пакуль невядома, колькі такіх кватэр здаецца ў наём у Каменнай Горцы, аднак старшыня Пастаяннай камісіі агучыў лічбу 20% — столькі пабудаванага з дзяржпадтрымкай жылля, па яго сведчанні, здаецца ўнаймы. «Вось вам дзяржпадтрымка: людзі пабудавалі і адразу ж зарабляюць на гэтым грошы», — сказаў дэпутат.

НОВАЕ Ў «ПЛАЦЁЖКАХ»

Наталля КАЧАН, начальнік упраўлення юрыдычнай справы і кадраў Міністэрства ЖКГ нагадала ўдзельнікам пашыранага пасяджэння пра новаўвядзенні Жыллёвага кодэкса, які ўступае ў сілу з 2 сакавіка 2013 года. «Ужо сёння звароты грамадзян паказваюць, што некаторыя нормы ўспрымаюцца неадназначна, і яны, хутчэй за ўсё, будуць зменены», —заўважыла яна.

Аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі ў новым дакументе прысвечана асобная глава. Цяпер плата для ўласніка будзе складацца з платы за тэхнічнае абслугоўванне, бягучы рамонт, капітальны рамонт, камунальныя паслугі. Дагэтуль плацяжу за бягучы рамонт не было. Ён будзе ўносіцца не штомесяц, а за фактычна выкананыя работы. Напрыклад, пасля рамонту пад'езда плата пэўны перыяд будзе ўключацца ў плацежныя лісты.

Наймальнік, акрамя пералічаных плацяжоў, будзе яшчэ плаціць і за карыстанне жылым памяшканнем. «Многія лічаць, што гэта нейкі новы плацеж. У нас пытаюцца пра тое, ці варта з-за гэтага прыватызаваць кватэру, — пракаментавала Наталля Качан. — Але гэта не новы плацеж, ён існуе і ў 65 артыкуле дзейнага кодэкса. Іншая справа, што гэта плата будзе ўведзена пасля ліквідацыі перакрыжаванага субсідзіравання. Гэта значыць, юрыдычна яна існуе, але сёння фактычна яна роўная нулю. Колькі яна будзе складаць з 2 сакавіка, пакуль сказаць цяжка — пытанне прапрацоўваецца».

АБМЕН ПА ПРЫМУСЕ

Згодна з дзейным кодэксам, калі наймальнік не плаціць за камунальныя паслугі на працягу 6 месяцаў, ён спачатку атрымлівае выканаўчыя надпісы, потым запазычанасць з яго спаганяецца ў судовым парадку; у выпадку, калі спаганяць няма з чаго (заробак адсутнічае), ён можа быць пераселены ў меншае жыллёвае памяшканне тыпавых спажывецкіх якасцяў. На практыцы знайсці такое жыллёвае памяшканне праблематычна.

У новым кодэксе прадугледжана магчымасць высялення наймальнікаў у іншы населены пункт, у жыллё нетыпавых спажывецкіх якасцяў. Гэта значыць — не добраўпарадкаванае.

Кодэкс прадугледжвае магчымасць прымусовага абмену жылога памяшкання неплацельшчыка з чалавекам, які мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэта значыць, выканкам будзе прапаноўваць «чаргавікам» кватэры другаснага жыллёвага фонду большай плошчы, гаспадарамі якіх доўгі час не ажыццяўлялася плата за камунальныя паслугі.

З'явіўся і артыкул, які прапісвае меры да несумленных уласнікаў жылля. Спачатку ЖЭС будзе папярэджваць такога чалавека і прапаноўваць пагасіць пазыку. Калі просьба застанецца не задаволенай, выканкам можа на працягу года прад'явіць іск у суд з прымушэннем да адчужэння жыллёвага памяшкання. Яшчэ год — тэрмін, у які павінна адчужэнне адбыцца. У адваротным выпадку кватэра прадаецца з публічных таргоў, а гэта азначае, што ўласніка кватэры трэба будзе некуды часова перасяліць, потым на выручаныя грошы, за вылікам пазыкі, купіць яму іншую кватэру.

«Безумоўна, працэдура вельмі доўгая і складаная, — прызнала Наталля Качан. — Спачатку меркавалася, што пасля 6-месячнай пазыкі дзяржава купляе ўласніку іншую кватэру, і ад розніцы кошту спаганяе пазыку. Аднак норму не падтрымала Генеральная пракуратура, бо ўбачыла парушэнне канстытуцыйных правоў на ўласнасць. Думаю, нават у такой рэдакцыі норма будзе мець эфект, бо гэта моцнае псіхалагічнае ўздзеянне для ўласніка. Арганізацыямі ЖКГ за 11 месяцаў 2012 года былі прад'яўлены ў суды 333 іскі аб высяленні за нявыплату і за парушэнне права карыстання жылымі памяшканнямі. З іх задаволена 96. Гэта не сведчыць толькі пра тое, што ў астатніх выпадках суд адмовіў, але і пра тое, што ў людзей знайшліся грошы, і грамадзяне пагасілі пазыкі да разгляду справы ў судзе».

СЛУЖБОВАЕ ЖЫЛЛЁ

У дзейным кодэксе пералічаны катэгорыі грамадзян, якія не падлягаюць высяленню са службовага жылля без прадастаўлення іншага жылога памяшкання. У новым кодэксе прадугледжана, што ўсе гэтыя катэгорыі грамадзян не могуць быць выселены без прадастаўлення іншага жылля са службовага, калі такое было дадзена да 8 красавіка 2006 года (да ўступлення ў сілу Указа №565). Калі чалавек атрымаў службовае жыллё да гэтай даты, адпрацаваў 10 гадоў, застаўся без працы з-за скарачэння, з'яўляецца інвалідам, пенсіянерам і г.д., ён не можа быць выселены.

ЖЫВУ ПАКУЛЬ ПРАЦУЮ

Згодна з новым кодэксам, жыллё ў інтэрнаце з моманту ўступлення закона ў сілу (пасля 2 сакавіка 2013 года), будзе давацца толькі на тэрмін працоўных адносін. Гэта значыць, пры звальненні работнік, незалежна ад яго стажу, узросту і стану здароўя, абавязаны вызваліць жыллёвы пакой у інтэрнаце.

ВЫСЯЛЕННЕ БЫЛЫХ СВАЯКОЎ

У новым кодэксе прадугледжана норма, якая дазваляе выселіць з кватэры былых сваякоў, што не маюць сваёй долі ў праве ўласнасці, без прадастаўлення іншага жыллёвага памяшкання, нават калі былы сваяк мае непаўналетніх дзяцей. «Напрыклад, вы жывяце ў кватэры былога мужа, які набыў яе да шлюбу або атрымаў у спадчыну, — каментавала Наталля Качан. — Праз год пасля ўступлення новага жыллёвага кодэкса ў сілу былы муж можа вас выселіць разам з вашымі дзецьмі».

Не зусім зразумела пакуль, як будуць абараняцца ў гэтым выпадку правы дзяцей.

ЗВЕРКА ПАКАЖА

На 1 студзеня 2012 года ў краіне на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, знаходзілася больш за 849 тысяч чалавек, у тым ліку ў Мінску — амаль 273 тысячы. Выканкамы не паспяваюць штогод зверыць усіх, хто знаходзіцца на ўліку, аднак да 2 красавіка сёлета павінна адбыцца зверка ўсіх «чаргавікоў». Хутчэй за ўсё, колькасць іх будзе значна зменшана. Будзе, напрыклад, ліквідавана магчымасць стаяць у жыллёвай чарзе Мінска тым, хто працуе ў сталіцы і мае жыллё ў Мінскім раёне.

Па выніках выязнога пасяджэння дэпутаты склалі да кіраўніцтва міністэрства ЖКГ два дзясяткі пытанняў і шэраг узнятых праблем узялі на асаблівы кантроль.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПАСЛЯ ЗАЙЦА — БАБЁР І ВЫДРА

У гэтую нядзелю ў лясах будзе мнагалюдна: паляўнічыя змогуць сабрацца на закрыццё сезона палявання на зайца-беляка і зайца-русака.

— Пакуль жа здабываць можна жывёл любога полу і ўзросту ў светлы час сутак зброевым спосабам, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі, з падыходу, з засады, загонам, пры дапамозе гладкаствольнай паляўнічай зброі і патронаў з дробам. Дазваляецца паляваць з сабакамі ўсіх груп, а таксама паляваць бяззброевым спосабам з выкарыстаннем хартоў і лоўчых птушак, — нагадаў **старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслиннага свету Вадзім ВАРАБЕЙ**.

А ўжо з 1 лютага аматараў палявання чакае новы сезон — на бабра і выдру. Доўжыцца ён, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, будзе да 1 сакавіка. Здабываць можна жывёл любога полу і ўзросту. Паляванне будзе дазволена ў светлы час сутак бяззброевым спосабам з выкарыстаннем пастак (акрамя петляў), сачкоў, капканаў №5-7.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЛАРУСКІЯ ПРАГРАМІСТЫ ЎВАЙШЛІ Ў СУСВЕТНУЮ ЭЛІТУ

Згодна з рэйтынгам анлайн-праекта арганізатара спаборніцтваў па праграмаванні TopCoder (ЗША), па выніках 2012 года Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт увайшоў у намінацыі «алгарытмічнае праграмаванне» ў пяцёрку мацнейшых ВНУ свету.

Гэты рэйтынг з'яўляецца самым аўтарытэтным сярод прафесіяналаў у вышэйназванай сферы. Ён ранжыруе тры катэгорыі: індывідуальны залік удзельніка, вышэйшую навучальную ўстанову і краіну. Анлайн-спаборніцтвы праводзяцца ў 11 намінацыях. Найбольш папулярныя намінацыі «алгарытмічнае праграмаванне», «прыкладное праграмаванне, праектаванне», «прыкладное праграмаванне, распрацоўка», «даследчае праграмаванне» і «графічны і вэб-дызайн».

БДУ ў алгарытмічным праграмаванні, згодна з рэйтынгам TopCoder, абышоў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт, Варшаўскі, Шанхайскі і Пекінскі ўніверсітэты, Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі, а таксама і Стэндфардскі ўніверсітэт.

У выніковым заліку спаборніцтваў праграмісты з розных беларускіх ВНУ забяспечылі нашай краіне шостую пазіцыю ў рэйтынгу. Між іншым, яшчэ пяць гадоў таму Беларусь займала 12-ю пазіцыю, а Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — 17-е месца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЕЛІ ВІТАМІНЫ... І НАБЫВАЛІ ТЭЛЕВІЗАРЫ

У меню жыхароў нашай краіны летась з'явілася больш садавіны, рыбы, кандытарскіх вырабаў, яек і круп, а самымі «прагрэсіўнымі» ў плане росту колькасці спажывання сярод нехарчовых тавараў сталі касметычныя тавары, тэлевізары і ніжняя бялізна.

Белстат прыводзіць лічбы, якія тлумачаць сітуацыю. Паводле гэтых даных, прадпрыемствы рознічнага гандлю ў мінулым годзе садавіны рэалізавалі на 44,8% больш, чым у 2011-м, рыбы, ракападобных і малюскаў — на 13,2% больш; аб'ём продажу кандытарскіх вырабаў з цукру павялічыўся на 9,5%, а яек і круп — на 9,5 і 8,8% адпаведна. Мінулагодняя сума грошай, якую беларусы «ахвяравалі» крамам, набываючы прадукты харчавання, напоі і тытунёвыя вырабы, склала 95,3 трыльёна рублёў. У той жа час касметычных тавараў, у параўнанні з 2011 годам, купілі на 31,7% больш, тэлевізараў — на 30,7%, а колькасць прададзенай бялізны павялічылася на 30,1%.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ЛЕТАСЬ У КРАІНЕ БЫЛО ПАБУДАВАНА 55,5 ТЫСЯЧЫ НОВЫХ КВАТЭР

Паводле звестак Белстата, у 2012 годзе на будаўніцтва жылля выкарыстана 21,3 трлн рублёў інвестыцый у асноўны капітал, што складае 14 працэнтаў да агульнага аб'ёму інвестыцый. Галоўнымі крыніцамі фінансавання жыллёвага будаўніцтва з'яўляюцца ўласныя сродкі насельніцтва (каля 47 працэнтаў гэтых інвестыцый) і крэдыты банкаў (34,1 працэнта).

Арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці за мінулы год было ўведзена ў эксплуатацыю 4 млн 484,7 тыс. кв. м агульнай плошчы жылля, што складае 106,8 працэнта да прадугледжанага задання на год і 81,8 працэнта да ўзроўню 2011 года.

Для тых, хто стаіць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, летась уведзена ў эксплуатацыю 2 млн 560,7 тыс. кв. м, або 57,1 працэнта ад агульнага аб'ёму пабудаванага жылля. У параўнанні з 2011 годам увод у эксплуатацыю жылля для гэтай катэгорыі грамадзян сёлета паменшыўся на 938,1 тыс. кв. м. Увогуле для чаргавікоў летась з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 2 млн 307,3 тыс. кв. м жылля. У сельскай мясцовасці ўведзена ў эксплуатацыю 962,8 тысячы кв. м жылля.

Як падлічылі спецыялісты Белстата, больш за ўсё жылля было пабудавана ў сталіцы Беларусі — 1 млн 47,7 тысячы кв. м, у Мінскай вобласці — 910,4 тысячы, у Брэсцкай вобласці — 649,2 тысячы, у Гомельскай — 571,9 тысячы, у Гродзенскай — 521,6 тысячы, у Віцебскай — 402,5 тысячы, у Магілёўскай вобласці — 381,4 тысячы кв. м.

Сяргей КУРКАЧ.

ЧАГО ІШЛІ?

Двое маладых жыхароў Брэсцкай вобласці нелегальна перайшлі мяжу і ледзьве не замерзлі ва ўкраінскіх лясах. Чаго іх панесла па звярыных сцежках у суседнюю дзяржаву, пакуль невядома.

Ужо на тэрыторыі Украіны яны зразумелі, што заблудзіліся, і выклікалі па тэлефоне дапамогу. Іх знайшлі толькі раніцай недалёка ад вёскі Годынь Ратноўскага раёна. Парушальнікі атрымалі абмаражэнні. Іх даставілі ў Ратноўскую раённую бальніцу. Неабачлівым турыстам, жыхарам Камянецкага раёна, цяпер пагражае ампутацыя некалькіх пальцаў ног, а затым — штраф за парушэнне памежнага рэжыму.

Яна СВЕТАВА.

КВАДРАЦЫКЛ НА ЛЁДЗЕ

Работнікі Гарадоцкай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і раслиннага свету склалі адміністрацыйны пратакол на жыхара пасёлка Шуміліна, які перасоўваўся па лёдзе вадаёма на квадрацыкле.

Кіроўца, імкнучыся пазбегнуць адказнасці за парушэнне, праігнараваў патрабаванне дзяржінспектара пад'ехаць да берага і паспрабаваў знікнуць. Аднак пазней быў затрыманы. І цяпер яму пагражае штраф адразу за два адміністрацыйныя парушэнні — уезд і перасоўванне па вадаёме, пакрытым лёдам, на механічным транспартным сродку і за непадпарадкаванне законнаму патрабаванню службовай асобы пры выкананні ёй сваіх паўнамоцтваў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЗ ШАНЦАЎ НА ПОСПЕХ

Зборная Беларусі прайграла зборнай Харватыі ў 1/8 фіналу чэмпіянату свету па гандболе.

Матч з харватамі для беларусаў сапраўды аказаўся самым цяжкім на сёлетнім першынстве. Бронзавыя прызёры лонданскай Алімпіяды выглядалі мацней за нашых хлопцаў ва ўсім. Асабліва гэта тычыцца рэалізацыі ўласных момантаў. Балканцы закідвалі амаль усё, што маглі. А вось гульня ў беларускага варатара Віталя Чарапенькі яўна не атрымлівалася. 33:24 — звышпераканаўчая перамога аднаго з прэтэндэнтаў на п'едэстал. Беларусы вяртаюцца дадому.

Тарас ШЧЫРЫ.

РАЗВІЦЦЁ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА ПРАЗ СІСТЭМУ ФРАНЧАЙЗІНГУ

Паводле інфармацыі Мінэканомікі, 14 лютага ў Мінску адбудзецца форум «Франчайзінг Беларусь 2013».

Гэтая падзея ажыццяўляецца ў межах мерапрыемстваў Праграмы дзяржаўнай падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў нашай краіне на 2013—2015 гады.

Плануецца, што ў форуме прымуць удзел замежныя кампаніі (франчайзеры), інвестары, нацыянальныя кампаніі, кіраўнікі асацыяцый франчайзінгу Расіі і Украіны. На форуме будзе праводзіцца інфармаванне паспяховых беларускіх кампаній аб магчымасці стварэння каналаў збыту прадукцыі праз сістэму франчайзінгу, наладжванне сувязяў з замежнымі партнёрамі. Мяркуецца азнаёміць удзельнікаў форума з вопытам развіцця франчайзінгу ў Расіі, Украіне, Казахстане і краінах Прыбалтыкі.

Сяргей КУРКАЧ.

«ВЫХОДЗІЦЬ ЗАМУЖ ТРЭБА ПА КАХАННІ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1- й стар.)

Для мяне было адкрыццём, што мае бацькі вучыліся ў раздзельных школах. Я даведалася пра гэта, толькі калі прыйшла працаваць сюды. Зусім выпадкова. Перабірала хатні архіў і звярнула ўвагу, што на чорна-белым школьным фотаздымку маёй мамы няма ніводнага хлопчыка. І толькі тады заўважыла ўнізе подпіс — жаночая гімназія горада Мінска. Цяпер гэты фотаздымак захоўваецца ў музеі нашай гімназіі. Калегі таксама пераглядзелі бацькоўскія фотаздымкі, і аказалася, што многія з іх — дзеці бацькоў, якія не ведалі змешаных школ.

У раздзельнай адукацыі шмат «плюсоў». Не сакрэт, што стыль выкладання для дзяўчынак і хлопчыкаў павінен быць розны. Гэта звязана з асаблівасцямі ўспрыняцця. Напрыклад, на ўроках фізікі нам, дзяўчынкам, трэба спачатку патлумачыць, а пасля паказаць, а хлопчыкам наадварот. У звычайных школах педагогі, як правіла, робяць стаўку на хлопчыкаў. Таму тую ж фізіку паспяхова засвойваюць толькі дзяўчынкі з мужчынскім складам розуму. Мы ж робім акцэнт менавіта на фізіялагічных і эмацыйных асаблівасцях дзяўчат. І гэта дае свой вынік.

За 21 год існавання жаночай гімназіі мы выхавалі ажно 14 стыпендыятаў спецыяльнага Прэзідэнцкага фонду. Штогод больш за 90% нашых выпускніц паступаюць у самыя прэстыжныя ВНУ. Лічым гэта заслугай раздзельнай адукацыі.

Сярод нашых выпускніц ёсць княгіня ў Швецыі, нямала супрацоўніц міністэрстваў, жонкі святароў (хоць мы даём свецкую адукацыю, а не царкоўную). Дзяўчаты, якія вучыліся ў жаночай гімназіі і жывуць у Жодзіне (ці паблізу — у Барысаве, Смалявічах), як правіла, хочуць, каб і іх дочкі таксама атрымалі жаночую адукацыю.

Акрамя агульнаадукацыйных і чыста «жаночых» заняткаў, у нас у гімназіі ёсць такі важны прадмет, як сем'язнаўства. На гэтым уроку расказваем дзяўчаткам пра асаблівасці мужчынскай і жаночай псіхалогіі, даём жыццёвыя парады, якія могуць спатрэбіцца ў будучыні. Добра было б увесці гэты прадмет як адзін з прадметаў на выбар і ў звычайных школах. Я не прыхільніца гвалтоўных метадаў. Калі зрабіць яго абавязковым, то, хутчэй за ўсё, ён будзе ўспрымацца як абавязалаўка. Але ўсё залежыць, безумоўна, ад настаўніка.

Пра перакос, 250 дачок і святы абавязак

Калі стваралася гімназія, быў невялікі перакос. Гімназістак больш рыхтавалі да сямейнага жыцця. У апошнія гады мы крыху змянілі канцэпцыю жаночай адукацыі, зрабілі большы ўпор на інтэлект. Цяпер выхоўваем не толькі добрых жонак і ахвярных маці, але і высокаінтэлектуальных дзяўчат. Дзяўчына, якая выйшла з гімназіі, павінна быць самадастатковай.

У нас навучаецца ўсяго 250 дзяўчат. У гэтым я бачу толькі плюсы. Чым менш дзяцей, тым лягчэй убачыць эмацыйныя змены ў кожным і, калі трэба, прыйсці на дапамогу. У вялікіх школах можна ўпусціць нейкія моманты.

У адрозненне ад вялікіх школ, у нас усё па-сямейнаму. Кожная гімназістка — усе яны для мяне як дочкі — лёгка можа падбегчы да дырэктара на перапынку і папрасіць парады. І мой кабінет для іх — не страшнае месца, куды выклікаюць выключна «на дыван». У нас па гімназіі (вы, пэўна, заўважылі) вельмі шмат яркіх канап, дзе гімназісткі могуць пасядзець, пашушукацца — як паміж сабой, так і з псіхолагам, класным кіраўніком.

Тут працуюць неабыякавыя людзі, якія прыйшлі ў прафесію, бо любяць дзяцей, а не з-за таго, што быў меншы прахадны бал у інстытуце. Абыякавыя ў нас не затрымліваюцца. Ім проста будзе некамфортна ў калектыве. Бо мы хварэем душой за кожнае дзіця: калі дзяўчынцы няма дапамогі ў сям'і, то мы — другая сям'я, якая павінна ёй дапамагчы.

У нас вучацца дзеці ў тым ліку і з няпоўных сем'яў. Наша задача — прывіць ім сямейныя каштоўнасці, патлумачыць, як важна мець поўную сям'ю, каб у будучыні яны не паўтарылі лёс сваіх маці. Ёсць сярод бацькоў і адзінокія таты. Тут наогул наш святы абавязак працаваць з гэтымі дзяўчынкамі. Мы павінны навучыць іх добрым манерам, гатаваць, шыць, правільна весці гаспадарку, ствараць утульнасць у доме.

Пра ўрок, БелАЗ і вялікае няшчасце

Практычна ўсё маё жыццё — кіраўніцтва. 9 гадоў адпрацавала намеснікам начальніка аддзела адукацыі Жодзінскага гарвыканкама, была намеснікам дырэктара трох розных школ. Да гэтага ж, як жонцы ваеннаслужачага, даводзілася шмат пераязджаць. Таму працавала і выхавальніцай у дзіцячым садку, і ў групе прадоўжанага дня. Хоць па спецыяльнасці я — настаўніца матэматыкі.

Урок — гэта 45 хвілін святога часу для стасункаў з дзецьмі. Не люблю, калі мяне адцягваюць падчас урока на нейкія адміністрацыйныя справы, і не дазваляю гэтага рабіць. Толькі ў экстранных выпадках. Бо, як паказвае практыка, большасць пытанняў могуць пачакаць паўгадзіны.

У дзяцінстве я была завадзілай, атаманам у кампаніі суседскіх дзяцей. Якасці кіраўніка, пэўна, закладзеныя ўва мне на генным узроўні. Мой тата — лаўрэат дзяржаўнай прэміі — быў галоўным інжынерам БелАЗа. Дзед у Маскве вельмі высокія пасты займаў.

Як дырэктару мне прыносіць найбольшае задавальненне, калі мае гімназісткі дабіваюцца нейкіх поспехаў: перамагаюць у конкурсах, алімпіядах, спаборніцтвах. Вось нядаўна дзяўчынка правезла з Еўропы кубак па самба. Прынесла яго, паказвае — і такое адчуванне, што я гэты кубак атрымала. Для мяне вельмі важна, што дзеці самарэалізоўваюцца. Вельмі прыемна, калі выпускніцы на вечары сустрэч кажуць, што задаволены выбарам прафесіі, што цяпер разумеюць, колькі ім дала гімназія. Радуюся, калі былыя гімназісткі ствараюць добрыя сем'і.

Мой сын — гэта маё дасягненне. Вельмі задаволена, што ён выбраў прафесію настаўніка. Хоць спачатку я яго вельмі адгаворвала, бо ведала, якая зарплата ў школе. Тым не менш, сын — таленавіты педагог, працуе ў адной з мінскіх гімназій, выкладае гісторыю і замежную мову. У конкурсе «Малады настаўнік Мінска» заняў 4 месца. Яго вельмі любяць дзеці, таму будзе шкада, калі ён сыдзе з гэтай прафесіі.

Тлумачым дзяўчатам, што вельмі важна выбраць любімую прафесію. Бо хадзіць на нелюбімую працу — гэта вялікае няшчасце, якое абавязкова адаб'ецца ў тым ліку і на сям'і.

Пра грымучую сумесь, тыльды і нерэалізаваныя жаданні

Няпроста быць жанчынай-кіраўніком. Бо гімназія — гэта не толькі дзеці і настаўнікі, гэта яшчэ і вялікая гаспадарка. І тут самае галоўнае, каб, калі сярод ночы пачуецца званок, што трубы прарвала ці што іншае, муж гэта разумеў.

Быць мужам жанчыны-кіраўніка не менш складана, чым жонкай ваеннага. У нашай сям'і ў гэтым плане грымучая сумесь. Мой муж быў камандзірам ваеннай часці. Пэўна, таму мы разумеем і падтрымліваем адзін аднаго. Да ўсяго мы яшчэ і аднакласнікі. Як дзяўчыну муж заўважыў мяне толькі на выпускным вечары. Я ж звярнула на яго ўвагу крыху раней. Мы, дзяўчаты, усё бачым крыху раней, чым хлопцы *(смяецца)*.

Жаніцца і выходзіць замуж трэба па каханні. Не па разліку. І пры гэтым памятаць, што даруслага чалавека перавыхаваць нельга. Таму трэба выбіраць сабе тую палавінку, з недахопамі якой ты зможаш мірыцца. «Сцерпіцца — злюбіцца», лічу, гэта няправільна. І выходзіць замуж толькі таму, што прыйшоў час, таксама не варта.

— Якой, на думку дырэктара жаночай гімназіі, павінна быць сучасная беларуская дзяўчына?

— Мілай, добрай, разумнай, з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, якая пастаянна імкнецца да самаадукацыі і самаўдасканалення, ведае, як сябе паднесці з лепшага боку, з добрымі манерамі, не ганарыстай.

— Што са зробленага на гэтай пасадзе асаблівая нагода для гонару?

— Тое, што гімназія паспяхова прайшла дзяржаўную акрэдытацыю: пацвердзіла свой статус жаночай і не перайшла ў шэраг звычайных школ. Гэта не толькі мая заслуга, гэта вялікае дасягненне ўсяго нашага дружнага калектыву.

— Дэвіз, якім кіруецеся па жыцці?

— Іх некалькі *(усміхаецца)*. У педагогіцы мой дэвіз: **«Я працую для дзяцей, а не дзеці народжаныя для таго, каб даць мне працу».** Імпануе мне і дэвіз нашай гімназіі: **«Мы вучымся не для школы, а для жыцця».** Я таксама пераканана, што **нельга зрабіць чалавеку балюча на карысць сабе, ці, іншымі словамі, на чужым няшчасці шчасця не пабудуеш.**

Талент — ад Бога. Але яго трэба своечасова разгледзець. І гэта задача бацькоў, большасць з якіх за штодзённымі клопатамі пускаюць усё на самацёк і не назіраюць за сваімі дзецьмі. Я лічу, што калі яны далі жыццё маленькаму чалавеку, то проста абавязаны знайсці час, каб дапамагчы яму выявіць свае здольнасці. Даць магчымасць паспрабаваць сябе ў розных гуртках і, як толькі заўважылі, што дзіцяці нешта падабаецца і гэта ў яго добра атрымліваецца, фінансава падтрымаць, стварыць умовы для развіцця дома. Часам, проста набыўшы фарбы, можна раскрыць талент.

Часам бацькі спрабуюць рэалізаваць свае нерэалізаваныя жаданні праз дзіця. Так, мая мама ў свой час не змагла паступіць у музычную школу, бо не было магчымасці набыць музычны інструмент. Таму яна, не раздумваючы, і адправіла мяне вучыцца іграць на фартэпіяна. Я пакутавала тры з паловай гады. І ўрэшце кінула «музыкалку», бо гэта было не маё. Навязваць сваё жаданне ў прафесіі, гуртках няправільна. У кожнага дзіцяці свой талент, і задача бацькоў яго заўважыць і развіць, а не думаць, як сябе дарэалізаваць.

Надзея ДРЫЛА.
Фота Надзеі БУЖАН.

АКАЗВАЦЬ САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ БУДУЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎСТАНОВЫ

Як вядома, новым законам аб сацыяльным абслугоўванні, які ўступіў у сілу з 1 студзеня гэтага года, прадугледжана ўвядзенне ў сацабслугоўванне дзяржаўнага сацыяльнага заказу. Пастановай Савета Міністраў ад 27 снежня 2012 года № 1219 падрабязна распісаны механізм яго ўкаранення.

Нагадаем, што сутнасць дзяржаўнага сацыяльнага заказу заключаецца ў тым, каб далучыць розныя арганізацыі (у тым ліку недзяржаўныя некамерцыйныя) і індывідуальных прадпрымальнікаў да аказання сацыяльных паслуг і рэалізацыі праектаў, накіраваных на дапамогу ў вырашэнні сацыяльных праблем людзей, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

У якасці дзяржаўнага заказчыка выступяць мясцовыя Саветы дэпутатаў, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган або ўпаўнаважаная імі арганізацыя. Яны будуць фарміраваць дзяржаўны сацзаказ, арганізоўваць працэдуру правядзення конкурсу, заключаць дагаворы на яго выкананне, аказваць выканаўцам інфармацыйную і кансультатыўную падтрымку. На іх таксама ўскладаецца кантроль за якасцю, парадкам і ўмовамі аказання паслуг і расходаваннем выдзеленых з бюджэту сродкаў.

Выканаўцам дзяржсацзаказу (які будзе вызначацца на конкурснай аснове) можа быць юрыдычная асоба або індывідуальны прадпрымальнік, якія заключылі з дзяржзаказчыкам дагавор на яго выкананне. Не змогуць выступаць у якасці выканаўцы дзяржсацзаказу арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, на маёмасць якіх накладзены арышт, якія прадставілі пра сябе непраўдзівую інфармацыю, ці прадстаўнікі якіх уключаны ў склад конкурснай камісіі, а таксама юрыдычныя асобы ў працэсе рэарганізацыі і ліквідацыі, ІП — на стадыі спынення дзейнасці або прызнаныя ва ўстаноўленым парадку банкрутамі.

Вызначаць, якія сацыяльныя паслугі і сацыяльныя праекты найбольш актуальныя, будуць таксама на месцах, папярэдне ацаніўшы сацыяльна-дэмаграфічныя асаблівасці рэгіёна і яго фінансавыя магчымасці.

Спецыялісты Мінпрацы і сацабароны ўпэўнены, што ўвядзенне дзяржсацзаказу дазволіць укараніць найноўшыя тэхналогіі сацыяльнага абслугоўвання і пашыраць віды сацыяльных паслуг. Як сцвярджаюць прадстаўнікі міністэрства, з'яўленне канкурэнтных адносін у гэтай галіне павысіць якасць і даступнасць сацпаслуг.

Святлана БУСЬКО.

■ Стыхія

ГАЛОЎНАЕ — НЕ ЗМЕРЗНУЦЬ!

Мароз і сонца: выдатнае зімовае надвор'е. Такое, па якім людзі сумавалі апошнія гады, калі зіма была больш падобная на шэрую познюю восень, што доўжыцца бясконца. Цяпер зіма ёсць, але мароз «кусаецца».

Уначы 22 студзеня ў Магілёўскай вобласці было ад 17 да 22 градусаў ніжэй за нуль, удзень трымалася каля мінус 16. Паводле прагнозаў сіноптыкаў, пакуль не чакаецца аслабленне марозу. Таму выпадае ўцяпляцца, сачыць за людзьмі, якія патрабуюць апекі, — малымі, старымі, хворымі і бяздомнымі.

У школах Магілёўскай вобласці пакуль не ідзе размова аб спыненні навучальнага працэсу. Санітарныя службы звычайна прымаюць такія рашэнні, калі слупок тэрмометра апускаецца да мінус 25 градусаў.

— Аднак у школах і дзіцячых садках клапоцяцца пра дзяцей, каб яны не пазамярзалі, і разам з мясцовымі органамі кіравання школы пільна сочаць за падвозам, каб транспарт заводзіўся і хадзіў спраўна, каб малыя нідзе не сталі на марозе, — пракаментавала **начальнік арганізацыйна-педагагічнага аддзела ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Іна КАЗЛОВА.**

Калі маразы не аслабнуць,то ў пачатковых класах можа быць уведзена вольнае наведванне заняткаў. Але і цяпер, зазначыла Іна Казлова, шмат дзяцей хварэюць на прастуду і застаюцца дома, таму ў класах не вельмі шматлюдна.

У Магілёве і Бабруйску працуюць **цэнтры часовага (начнога) знаходжання людзей без пастаяннага месца жыхарства**. У сельскіх раёнах падобную дапамогу бяздомным акажуць у аддзяленнях кругласутачнага знаходжання для састарэлых людзей і ў медыцынскіх установах, дзе ёсць сацыяльныя ложкі.

У Магілёве цэнтр часовага знаходжання для бяздомных разлічаны на 22 месцы. У мінулую марозную ноч там было 7 пастаяльцаў, сярод якіх 1 жанчына. Звычайна людзі падыходзяць а 20-й гадзіне, п'юць цёплы чай, вячэраюць і могуць адпачываць да 8 раніцы.

Удзень пастаяльцы гэтага цэнтра **харчуюцца ў хрысціянскай дабрачыннай арганізацыі «Табея»**. Там гатуюць добры абед на 60 чалавек, якія прыходзяць па накіраванні гарадскіх сацыяльных службаў. Аднак у любым выпадку, сказаў **кіраўнік «Табеі» Павел БРОДАЎ,** кожнаму чалавеку, які галодны і змерз, тут дадуць цёплую вопратку і абутак, і не адмовяць у магчымасці паесці і сагрэцца.

Людзям з абмарожаннямі аказваюць дапамогу ў апёкавым аддзяленні Магілёўскай бальніцы №1. Там цяпер лечыцца 21 чалавек, за апошнія марозныя суткі паступілі тры чалавекі. Пацыенты і маладыя, і сталага веку, аднак большасць сярэдняга ўзросту ад 30 да 50 гадоў. Ёсць сярод іх і 3 жанчыны.

— На жаль, не ўсім удаецца пазбегнуць аперацыі па ампутацыі, прынамсі пальцаў ці частак канечнасцяў, — расказвае пра жудасную рэчаіснасць **загадчык апёкавага аддзялення Юрый БЕЙЗЕРАЎ.** — Як гэта ні сумна, але асноўная прычына такіх пакутаў — алкаголь. Калі чалавек п'яны, ён не кантралюе сябе, страчвае асцярожнасць, не заўважае холаду і атрымлівае абмарожанні. Прыкладна палова выпадкаў заканчваецца траўматычнымі аперацыямі.

На вуліцах у маразы становіцца меней транспарту. У некаторых аўтамабілі на такім марозе не заводзяцца. У аўтобусах на прыпынках не адчыняюцца ўсе дзверы, а дворнікі захутаны ў цёплае адзенне па бровы. Здаецца, што, прызвычаіўшыся да цёплых зімаў, людзі не вельмі камфортна адчуваюць сябе на свежым зімовым паветры і выходзяць з цёплых дамоў неахвотна.

Сродкі масавай інфармацыі нагадваюць, **як паводзіць сябе на холадзе:** усё элементарна — апранацца цяплей, не затрымлівацца на вуліцы надоўга, ужываць гарачую ежу і напоі (не моцныя!). Пры першых прыкметах абмарожання трэба расцерці змерзлыя канечнасці, сагрэцца, рухацца.

Цяпер час радавацца зіме, але і быць асцярожнымі, каб не змерзнуць!

Ілона ІВАНОВА.

БУДЗЕ МАДЭРНІЗАЦЫЯ — БУДЗЕ І ЗАРПЛАТА

Пра вынікі года і перспектывы вобласці ішла гаворка на сустрэчы старшыні Брэсцкага аблвыканкама Канстанціна Сумара з журналістамі

Косаўская «жамчужына» — палац Пуслоўскіх — ператвараецца ў сваю адраджэнне. І першая чарга рэканструкцыі скончана. На пагорку вымалёўваюцца абрысы велічнага бела-руковага будынка, які крыху нагадвае старадаўнія замкі. Сцены гатовы. Наперадзе — унутраная апрацоўка і пракладка інжынерных сетак. І хоць палац у стадыі свайго адраджэння, турысты яго не абмінаюць. Побач адноўлены сядзібны домік Касцюшкі. І большасць наведнікаў музея, вядома, уздымаецца на высокі палацавы ўзгорак, каб зірнуць на авеяны легендамі палац Пуслоўскіх. Экскурсію для журналістаў па ваколіцах палаца правёў намеснік старшыні Івацэвіцкага райвыканкама Аляксандр Веліка-селец. Паводле яго слоў, на **працягу гэтага года тут** плануецца асвоіць шэсць мільярдаў рублёў. Відавочна і іншае: ад эфектыўнасці эканомікі залежыць і колькасць сродкаў, якія можна накіроўваць на падобныя праекты.

Прэс-канферэнцыя **старшыні Брэсцкага аблвыканкама Канстанціна СУМАРА** была выязной. Спачатку журналістам прапанавалі грунтоўную экскурсію па Івацэвіцкім раёне.

У СВК «Квасевічы» гаспадары паказалі «старую новую» ферму. Цікава, што раней гэта быў адзін з самых слабых калгасаў раёна. А зараз ён займае пазіцыі перадавога сельгаспрадпрыемства. Жывёлагадоўля забяспечвае паступленне дзвюх тон грашовых сродкаў на рахунак гаспадаркі, і таму яе развіццё стаіць на першым плане.

Завершана рэканструкцыя другой чаргі фермы «Квасевічы» на 200 кароў — там устаноўлена шведскае абсталяванне. Рэканструкцыя першай чаргі на 400 галоў жывёлы была праведзена раней. На мадэрнізацыю фермы гаспадарка выдаткавала 3 млрд 700 млн рублёў уласных сродкаў.

Кукурузакалібровачны завод — новае прадпрыемства ў раёне. Яго ўвялі ў строй у 2009 годзе па праграме імпартазамяшчэння. Цяпер каля 100 тон перапрацаванага насення кукурузы штодзённа паступае з завода ў гаспадаркі вобласці і за яе межы. Падлічана, што эканомія на закупцы насення за год склала 20 мільёнаў еўра.

На праектную магутнасць плануе выйсці **сёлета** новы цэх ДСП і ламініраваных пліт ААТ «Івацэвічдрэў». Гэта суперсучаснае прадпрыемства. Нядаўна здадзены ў строй інтэрнат для працаўнікоў, і месцаў у ім ужо не хапае.

Падчас брыфінгу кіраўнік вобласці падвёў асноўныя эканамічныя вынікі года і акрэсліў некаторыя перспектывы. Сярод набыткаў Канстанцін Сумар адзначыў рост дабаўленай вартасці ў сферы сельскай гаспадаркі. Рост склаў 108 працэнтаў у параўнанні з леташнім і сфарміраваў пятую частку ўсяго зароблена валавога прадукту вобласці. Гэта самы значны ўклад сельскай гаспадаркі ў эканоміку сярод рэгіёнаў вобласці.

Брэсцкая вобласць — аграрная. І калі зноў узнікла пытанне наконт самай нізкай, паводле статыстыкі, зарплаты па краіне, губернатару соты раз давялося тлумачыць некарэктнасць параўнання лічбаў. Ёсць вобласці, ільвіную долю бюджэту якіх фарміруюць некалькі прадпрыемстваў-гігантаў. Там, дзе ёсць нафтаперапрацоўка, буйное машынабудаванне, вядома, узровень зарплаты на парадак вышэйшы, чым у аграрным сектары ці на прадпрыемствах раённага ўзроўню Таму зарплату трэба параўноўваць па галінах, а не па рэгіёнах. А фактарамі забеспячэння росту зарплаты названы мадэрнізацыя прадпрыемстваў рэальнага сектара, актывізацыя знешняга попыту, павышэнне прадукцыйнасці працы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Івацэвіцкі раён.

ЯК ЗІМУЮЦЬ АЗІМЫЯ?

Цыклон, з якім звязаны моцныя ападкі, што прайшлі ў паўночных і цэнтральных абласцях Беларусі, Гомельшчыну практычна не захапіў, расказала інжынер-сіноптык Гомельскага абласнога цэнтра па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя Наталля ЮРЧАНКА.

— Мы апынуліся на перыферыі гэтага цыклону. Большая частка першай дэкады студзеня аказалася вельмі цёплай, у асобныя дні тэмпература была вышэй за 0. Па Гомельшчыне перавышэнне нормы складала 6-8 градусаў. Гэта не характэрнае для студзеня надвор'е, бо норма складае -6 -7 градусаў. Самае марознае надвор'е было 18-19 студзеня, якраз на Хрышчэнне — ад -11 да -15. На Гомельшчыне на працягу апошніх 20 гадоў прывыклі, што зімы ў нас цёплыя. Гэта толькі апошнія тры гады пераважае зімовы характар надвор'я. Сёлета з пачатку снежня на ўсёй тэрыторыі стварылася ўстойлівае снежнае покрыва. Гэта ненамнога перавышае норму. Вышыня снегу вагаецца ад 12 см у Лельчыцах да 29 см у Брагіне.

— Тое, што снег на Гомельшчыне ляжыць ужо амаль 2 месяцы, можа стварыць не вельмі спрыяльныя ўмовы для раслін, — адзначае **інжынер-аграметэаролаг Гомельскага абласнога цэнтра па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя Людміла ПАТЭНКА.** — Дастаткова працяглы перыяд расліны знаходзяцца пад снегам. І таму верагоднасць таго, што яны аслабелі за гэты час, даволі вялікая. Снежнае покрыва абумоўлівае павышаны расход раслінамі запасных пажыўных рэчываў і прыводзіць да зніжэння іх зімаўстойлівасці. Вызначаць жыццяздольнасць мы будзем 25 студзеня. Паглядзім, як расліны перазімавалі ў снежні-студзені.

Дарэчы, на апаратнай нарадзе ў аблвыканкаме ішла гаворка пра тое, што снег у рэгіёне лёг не на мерзлую зямлю. Таму цяпер пад ім ствараецца тэмпературны фон, пры якім магчыма ўзнікненне эфекту «кропкі расы». Паветра з зямлі сутыкаецца з халоднай паверхняй. Частка яго кандэнсуецца, і вільгаць, якая змяшчаецца ў ім, застаецца на пасевах азімых. Гэта правакуе развіццё небяспечнага для раслін грыбка снежнай цвілі. Асаблівую трывогу выклікаюць пасевы рапсу. Менавіта таму старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік даручыў адпаведным арганізацыям падрыхтавацца да магчымага перасявання азімых.

Тым часам у прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС адзначылі, што здарэнні, якія адбываліся на Гомельшчыне апошнім часам, ніяк не звязаны з нізкімі тэмпературамі паветра і перапалам печак. На мінулым тыдні на Гомельшчыне адбылося 18 пажараў, у якіх чатыры чалавекі загінулі. Прычыны пажараў розныя. Дарэчы, супрацоўнікі органаў дзяржаўнага пажарнага нагляду за мінулы тыдзень абследавалі больш за 5 тысяч домаўладанняў, яшчэ ў 1,5 тысячы дамоў пабывалі назіральныя камісіі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВЯЛІКІ СНЕГ — ВЯЛІКІЯ КЛОПАТЫ

У ноч на 22 студзеня ў Брэсце намяло шмат снегу. Першым на гэта рэагуе грамадскі транспарт. У «Брэстаблгідрамеце» паведамілі, што снежнае покрыва ў Брэсце, Пінску, Драгічыне вырасла за ноч на 7-8 міліметраў, што складае ад 60 да 80% дэкаднай нормы ападкаў. У іншых раёнах снег невялікі.

— Дарожнікі працуюць фактычна ў кругласутачным рэжыме, — паведаміў **генеральны дырэктар «Брэстаблдарбуда» Пётр СКАРАБАГАЦЬКА.** Калі за суткі 16 студзеня выпала практычна дэкадная норма снегу, на яго расчыстцы працавала больш за 120 адзінак тэхнікі, цяпер крыху менш. На дапамогу дарожнікам прыходзяць сельгаспрадпрыемствы — гэта дазваляе падтрымліваць 13 тысяч кіламетраў дарог мясцовага значэння ў належным для гэтага часу стане.

А ў абласным цэнтры снег прынёс шмат клопатаў. Калі вуліцы расчышчаюцца тэхнікай у асноўным па графіку, то дворнікі не паспяваюць рабіць гэта на замацаваных тэрыторыях. Як заўважыў **дырэктар Брэсцкага прадпрыемства «Камунальнік» Мікалай БРАШКО,** у горадзе не хапае дворнікаў. Вялікая цякучка кадраў і пастаянныя вакансіі не спрыяюць зладжанай і аператыўнай рабоце. Таму камунальнікі заўсёды звяртаюцца да гараджан з просьбай расчышчаць стаянкі для ўласных аўтамабіляў. Але суайчыннікі не вельмі ахвотна адзываюцца на заклікі.

Святлана ЯСКЕВІЧ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ І НОВЫ ПОГЛЯД НА САЦЫЯЛЬНУЮ СФЕРУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зразумела, новы бізнэс у сферы інфармацыйных тэхналогій пачыналіся з малога — але так было ва ўсіх галінах эканомікі: у сектарах новага тэхналагічнага ўкладу, якія зараджаліся, сур'ёзных вынікаў можна было дабіцца, пачынаючы з вельмі сціплых стартавых пазіцый.

Высветлілася таксама, што пры агульным эканамічным крызісе «лічбавы» бізнэс (dot-coms, дот-комы) зусім не дэманструе больш высокую выжывальнасць і што ў лічбавай эканоміцы ў перыяд крызісу таксама цяжка знайсці працу, як і ў папярэдні перыяд. У сваю чаргу, у эканоміцы гэтага часу — бурнага эканамічнага росту — з занятасцю насельніцтва таксама ўсё ў парадку.

Больш за тое, калі паглядзець на вытокі сучаснага глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу, то нельга не прызнаць, што яго вытокі — якраз у залішняй захопленасці развітога свету міфам пра «новую эканоміку». Менавіта пасля «здзімання» шматлікіх «бурбалак», якія ўтварыліся на хвалі ўсеагульнага «лічбавага» энтузіязму 1990-х гадоў, у ЗША ў 1999 годзе быў адменены Закон Гласа—Сцігала, уведзены пры Франкліне Рузвельце ў мэтах недапушчэння зліцця камерцыйных і «інвестыцыйных» (спекуляцыйных) банкаўскіх структур і паўтарэння фінансавых катастроф, накшталт Вялікай Дэпрэсіі. Таму цалкам заканамерна, што менш чым праз 10 гадоў пасля адмены гэтага акта свет быў уцягнуты ў фінансава-эканамічны крызіс, непараўнальна больш глыбокі, чым Вялікая Дэпрэсія.

Іншымі словамі, энтузіязм першых дзесяцігоддзяў існавання «новай эканомікі» не апраўдаўся. «Лічбавая» сфера не стала панацэяй, а пачала сама жыць паводле законаў фінансавага капіталізму.

З іншага боку, ставіць пад сумненне той факт, што інфармацыйныя тэхналогіі рэзка змянілі жыццё людзей, сусветную эканоміку, палітыку, фінансы, дыпламатыю, медыясферу, было б абсурдным. Паводле звестак адной з самых аўтарытэтных у свеце кансалтынгавых службаў Oxford Economics, лічбавая эканоміка ў 2013 годзе дасягне памеру 20,4 трыльёна долараў, што складзе 13,8% ад сусветнага гандлю. Інфармацыйныя тэхналогіі ляжаць у аснове ўсіх без выключэння кіраўніцкіх рашэнняў сучаснасці, заснаваная на IT камунікацыя робіць магчымым існаванне самых магутных суб'ектаў сучаснай эканомікі, палітыкі, культуры — транснацыянальных прамысловых, гандлёвых і фінансавых карпарацый, палітычных партый, медыя-карпарацый.

Таму галоўная задача ў сучасных умовах — паспяхова выкарыстоўваць патэнцыял інфармацыйных тэхналогій у інтарэсах суверэннага развіцця Беларусі.

Якую ролю інфармацыйныя тэхналогіі могуць адыграць у развіцці нашай краіны?

Беларусь, будучы краінай з адкрытай эканомікай, арыентавана, у першую чаргу, на тыя віды дзейнасці, якія дазваляюць нарошчваць экспарт інфармацыйных паслуг. Самым дакладным (хоць і не зусім рэпрэзентатыўным) паказчыкам, які характарызуе гэты напрамак развіцця сферы ІТ, з'яўляецца інфармацыя аб аб'ёмах экспарту прадукцыі кампаній — рэзідэнтаў Парку высокіх тэхналогій. У студзені—верасні 2012 года ён склаў 215,8 млн долараў, або 4,5% ад агульнага экспарту паслуг.

Адначасова расце значэнне «лічбавай эканомікі» і ўнутры краіны. Так, у першым паўгоддзі 2012 года рынак інтэрнэт-рэкламы павялічыўся на 20% у параўнанні з адпаведным перыядам 2011 года. Агульны аб'ём яго склаў 2,7 млн долараў. Для параўнання, у цэлым рынак рэкламы ў краіне ацэньваецца ў 66-67 млн долараў. Гэта значыць, інтэрнэт-рэклама складае каля 8% ад рынку рэкламы.

Аднак не меншую ролю адыгрываюць інфармацыйныя тэхналогіі ў сацыяльным развіцці краіны, дзе іх патэнцыял толькі пачынае выкарыстоўвацца. Найперш гэта датычыцца масавай камунікацыі як паміж уладай і насельніцтвам, так і паміж самімі грамадзянамі.

Лічбавыя тэхналогіі сёння хутка становяцца новай базай працы ўсіх відаў сродкаў масавай інфармацыі, забяспечваючы павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі. Гэты працэс, безумоўна, пачынаецца перш за ўсё з рэспубліканскіх СМІ, якія валодаюць больш магутнай матэрыяльнай і кадравай базай. На яго рэалізацыю накіраваны, у тым ліку, тыя пераўтварэнні, якія цяпер ажыццяўляе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Найперш гэта датычыцца стварэння ўзбуйненых інфармацыйных структур або, як мы іх называем, медыяхолдынгаў на базе вядучых рэспубліканскіх газет. Мы скончылі стварэнне Выдавецкага дома «Звязда», які аб'яднаў рэспубліканскую беларускамоўную масава-палітычную і літаратурна-мастацкую прэсу. Такім чынам мы хочам кансалідаваць творчы патэнцыял беларускамоўных выданняў, нашай сучаснай літаратуры. Гэты холдынг павінен стаць інтэлектуальным цэнтрам выпрацоўкі і рэалізацыі ініцыятыў у сферы нацыянальнай літаратуры, культуры, у гуманітарнай сферы ў цэлым. Наш вопыт паказвае, што ў Беларусі маецца сур'ёзны грамадскі заказ на асэнсаванне і абмеркаванне гэтай праблематыкі, асабліва — у асяродку творчай інтэлігенцыі.

Лічбавыя тэхналогіі сёння хутка становяцца новай базай працы ўсіх відаў сродкаў масавай інфармацыі, забяспечваючы павышэнне эфектыўнасці дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі.

Яшчэ больш маштабная рэарганізацыя чакае сегмент цэнтральнай грамадска-палітычнай прэсы. У адну ўстанову плануем аб'яднаць рэдакцыі газет: «Советская Белоруссия», «Народная газета», «Рэспубліка», «Белорусская нива», «Знамя юности». Базай для такога аб'яднання будзе вядучае выданне краіны — «Советская Белоруссия».

Мы чакаем, што дзякуючы гэтаму зліццю на інфармацыйнай прасторы з'явяцца два суб'екты, якія будуць валодаць дастатковым рэсурсным патэнцыялам для таго, каб ісці ў нагу з часам і даносіць дзяржаўны пункт гледжання на падзеі праз увесь спектр сродкаў масавай камунікацыі, якія даступныя на сённяшні дзень або будуць даступныя ў бліжэйшай будучыні. Гаворка ідзе не толькі аб узмацненні прысутнасці нашых СМІ ў інтэрнэце, сацыяльных сетках. Мы спадзяёмся, што па меры больш глыбокага пранікнення інфармацыйных тэхналогій у жыццё рэгіёнаў на аснове супрацоўніцтва мясцовых улад, мясцовых згуртаванняў і ўзбуйненых рэспубліканскіх СМІ з'явіцца магчымасць зрабіць суб'ектамі інфармацыйнай палітыкі тыя ўнікальныя, самабытныя згуртаванні, якія сёння ў вялікай колькасці існуюць у рэгіёнах. У кожным раёне нашай краіны ёсць групы людзей, якія жывуць гісторыяй, культурай, прыродай свайго рэгіёна. Знайсці такіх людзей, падтрымаць іх, вывесці іх на рэспубліканскае або, пры дапамозе інтэрнэту, на міжнароднае інфармацыйнае поле — вось просты і правільны шлях да вырашэння многіх задач рэгіянальнага развіцця, якія сёння ставіць кіраўнік дзяржавы. Самі людзі з месцаў, іх згуртаванні могуць і павінны расказаць пра сябе, паказаць сябе свету, тым самым садзейнічаючы і прыцягненню турыстаў, павышэнню прывабнасці жыцця ў адпаведным рэгіёне, перашкаджаючы адтоку насельніцтва з яго ў буйныя гарады і гэтак далей.

У рамках гэтай жа стратэгічнай лініі прадугледжана скарачэнне колькасці рэдакцый абласных газет да адной у кожнай вобласці, а таксама аптымізацыя выданняў органаў дзяржаўнага кіравання з выключэннем дублюючых звенняў.

З аднаго боку, за гэтымі захадамі стаяць, безумоўна, меркаванні эканоміі. Патрабаванне аб аптымізацыі ведамасных СМІ выказаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, і яно будзе выканана. Усе выданні, без якіх можна абысціся ў папяровым выглядзе, будуць пераведзены ў электронны фармат або ліквідаваны. Ведамасная інфармацыя будзе публікавацца, перш за ўсё, на сайтах адпаведных структур.

Па ідэі, калі выданні, якія пераводзяцца ў электронны фармат, раней выклікалі непадробную цікавасць аўдыторыі, то пры іх пераводзе ў інтэрнэт узрастае і іх папулярнасць, і іх магчымасці па ўзаемадзеянні з мэтавай аўдыторыяй.

За мінулыя некалькі гадоў сумесна з мясцовымі ўладамі і рэдакцыямі мы дабіліся таго, што кожная раённая газета, усе абласныя і гарадскія масава-палітычныя выданні прадстаўлены ў «сусветнай павуціне». Сёння перад мясцовымі газетамі стаіць задача зрабіць сваю прысутнасць у інтэрнэце больш эфектыўнай, актывізаваць работу ў сацыяльных сетках. З гэтай мэтай намі сумесна з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны ўрэгулявана пытанне аб увядзенні ў штат рэдакцый дзяржаўных газет пасады «Рэдактар інтэрнэт-рэсурса».

З мэтай павышэння эфектыўнасці прысутнасці дзяржаўных медыя ў інтэрнэце сёння вядзецца работа па распрацоўцы партала дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Галоўная яго задача — стаць пунктам уваходу ў дзяржаўную беларускую медыяпрастору. На партале будуць класіфікаваныя СМІ па перыядычнасці выхаду, геаграфічным прынцыпе, тэматыцы, будзе даступны архіў публікацый за дастаткова працяглы перыяд.

Паводле нашай задумы, гэты рэсурс павінен стаць не толькі адзіным пунктам уваходу ў інфармацыйную прастору Беларусі, але і самастойнай магутнай рэдакцыяй. Перад ёй будзе стаяць задача па стварэнні і прасоўванні ўласнага кантэнту, аказанні дапамогі рэгіянальным СМІ ў павышэнні эфектыўнасці іх работы ў сеціве. Сістэма кіравання партала будзе забяспечана неабходным інструментарыем і для падрабязнага аналізу папулярнасці тых або іншых артыкулаў, паводзін аўдыторыі.

Яшчэ адным буйным праектам з'яўляецца стварэнне так званай «віртуальнай прыёмнай» — Адзінага дзяржаўнага партала для звароту грамадзян, ідэя запуску якой была ўхвалена Прэзідэнтам краіны. Дзякуючы наяўнасці партала як адзінага пункту прыёму ўсіх звароткаў грамадзян будзе ў многім вырашана праблема звароткаў, якія

Галоўная задача ў сучасных умовах — паспяхова выкарыстоўваць патэнцыял інфармацыйных тэхналогій у інтарэсах суверэннага развіцця Беларусі.

накіроўваюцца грамадзянамі не туды. Акрамя таго, гэтая сістэма дазволіць аналізаваць увесь паток звароткаў, якія паступаюць у дзяржаўныя органы, выяўляць найбольш праблемныя пункты і сферы. Па сутнасці, гэта сур'ёзны крок на шляху да рэалізацыі ідэі «электроннага ўрада».

Трэба адзначыць, што сур'ёзная работа па ўзмацненні інтэрнэт-вяшчання вядзецца цяпер у Белтэлерадыёкампаніі. Флагман нашага тэлебачання рыхтуецца перайсці ад фрагментарнага інтэрнэт-вяшчання на аснове «экранных» матэрыялаў адпаведных тэлеканалаў да стварэння паўнацэннага інтэрнэт-тэлебачання, адаптаванага да трансляцыі праз сучасныя тэхналагічныя платформы.

Дарэчы, змяненні закрануць і само тэлебачанне. У змястоўным плане Прэзідэнтам нядаўна былі агучаны новыя, прынцыпова больш высокія патрабаванні да работы тэлевізійных медыя. Гэта датычыцца як інфармацыйнай эфектыўнасці, так і эканамічнай. Паказальна ў гэтым плане, што Белтэлерадыёкампанія будзе вырашаць задачы стварэння і прасоўвання свайго інтэрнэт-тэлебачання ва ўмовах значнага скарачэння свайго штату. Тым не менш упэўнены, што прафесіяналам, якія працуюць у гэтай структуры, па сілах вырашаць задачы, якія перад імі ставіць кіраўнік дзяржавы.

Усё гэта тым больш актуальна, што з 2013 года Беларусь пачынае ўкараняць эфірнае наземнае лічбавае тэлебачанне. Цэнтралізаваны пераход на «лічбу» пачнецца з Асіповіцкага раёна (у Асіповічах аналагавае тэлебачанне адключаць 1 жніўня 2013 года). Пры гэтым ёсць усе падставы чакаць, што ў бліжэйшы час будзе запушчаны другі, а магчыма, і трэці мультыплекс, гэта значыць, у эфіры ўсім грамадзянам будуць даступныя 16 або 24 тэлеканалы. Як вы разумееце, гэта сур'ёзна змяняе медыярынак, павышае канкурэнцыю. Скончыць гэты пераход Беларусь павінна да 2015 года.

Трэба адзначыць, што разам з эфірным наземным лічбавым тэлевізійным вяшчаннем у Беларусі актыўна развіваюцца сеткі перадачы звестак, якія дазваляюць рэалізаваць канцэпцыі інтэрактыўнага тэлебачання або тэлебачання па запыце (накшталт сервісу Zala, які прапануе РУП «Белтэлекам»). Асноўнай тэндэнцыяй развіцця тэлебачання пад уплывам гэтых тэхналогій з'яўляецца стварэнне тэлеканалаў для ўсё больш вузкіх аўдыторый, а таксама персаналізацыя спажывання медыя-кантэнту з улікам ладу жыцця гледача. Па сутнасці, гаворка ідзе аб тым, што ўжо заўтра на аснове трансляцыі ў сетках перадачы звестак можа з'явіцца адукацыйны тэлеканал, які адначасова прадстаўляе праз інтэрнэт паслугі дыстанцыйнага рэпетытара (або т'ютара) і забяспечвае паўнацэнную персанальную адукацыю дзіцяці. Або, напрыклад, стварэнне медыцынскага канала, які транслюе ў сетках перадачы звестак і ўключае персанальныя кансультацыі праз інтэрнэт. Думаю, у нашай краіне ўжо цяпер ёсць нямала людзей, гатовых плаціць за падобны сэрвіс, а ў бліжэйшай будучыні іх будзе станавіцца толькі больш. Гэта значыць, дзякуючы інфармацыйным тэхналогіям на аснове гэтых паслуг магчыма фарміраванне новай эканомікі сацыяльнай сферы і ператварэнне сацыяльнай сферы з традыцыйна «расходнай» у тую, якая вырабляе і прыносіць рэальны прыбытак.

Яшчэ адзін маштабны і шматабяцальны праект такога кшталту рэалізуецца цяпер у нашай краіне — гэта Нацыянальная электронная бібліятэка Беларусі. Яе першачарговая задача — аблягчэнне доступу грамадзян да інфармацыі, якая змяшчаецца ў бібліятэчных фондах краіны. Канчатковая мэта нашай работы над гэтым праектам — атрымаць дакладную электронную копію фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і ўсёй бібліятэчнай сістэмы краіны, якая пастаянна абнаўляецца, са зручным для карыстальніка інтэрфейсам, сістэмай натуральнага рэзервавання, захавання звестак. Па сутнасці, гэта найбольш магутная інфраструктура рэгіянальнага развіцця, на аснове якой будзе магчыма рэалізаваць мноства адукацыйных, культурных, навукова-даследчых і іншых праектаў, якія далучаюць карыстальнікаў з усіх куткоў краіны, а таксама і замежжа. Гэта вялізны ўклад не толькі ў будучыню, але і ў павышэнне якасці жыцця нашых людзей ужо сёння.

Такім чынам, пры правільным дзяржаўным падыходзе на аснове сучасных інфармацыйных тэхналогій магчыма не толькі арганізацыя новых і рэарганізацыя існуючых галін эканомікі, але і якаснае пераўтварэнне сацыяльнай сферы. Прычым гэтае пераўтварэнне не толькі звязана з павышэннем узроўню камфорту грамадзян, але і праз стварэнне лічбавых інфраструктур агульнага карыстання адкрывае шлях да рэалізацыі сацыяльнай палітыкі новага тыпу, якая ператварае сацыяльную сферу з «расходнай» у прадукцыйную.

«Проблемы управления», № 4 (45), 2012 г.

■ Мая праўда

ЛЕПШАЯ ТЭОРЫЯ — ПРАКТЫКА

ПАСПЕЦЬ ПАБЫЦЬ СТУДЭНТАМ

Напярэдадні Таццянінага дня журналісты «Звязды» вырашылі прыгадаць свае студэнцкія гады. Тэма гэтая, напэўна, невычарпальная, бо колькі людзей, столькі і думак, уласных гісторый. Для адных тыя часы — самыя бесклапотныя, калі, як той казаў, «ад сесіі да сесіі жылі студэнты весела». Для другіх жа час вучобы ў вышэйшай навучальнай установе — гэта штодзённая праца над канспектамі і падручнікамі. Могуць быць і трэція — шчасліўчыкі — у якіх нейкім неверагодным чынам атрымлівалася спалучаць адно з другім. У нашым жа выпадку ў спрэчцы сышліся чалавек, які асабліва не шкадуе ад адсутнасці паўнацэннага студэнцкага жыцця, і яго апанент, які, каб выпала магчымасць пражыць усё наноў, можа, нешта б змяніў у сваім стаўленні да вучобы і побыту будучага дыпламаванага спецыяліста...

Асабіста ў мяне няма вялікай настальгіі па студэнцкіх гадах. Вы ўжо даруйце... Я маю на ўвазе непасрэдна вучобу, лекцыі, экзамены, залікі. Хіба што асобныя моманты прыгадваць прыемна. Сітуацыя можа здацца парадаксальнай, але, быўшы студэнтам, мне хацелася найперш... працаваць. Таму я ўдзячны тым часам за тое, што ўсё ў маім жыцці склалася тады так, як яно склалася. Вядома, трэба рабіць папраўку на факультэт — журналістыкі. На ім выкладаюць тэорыю, а праца ў рэдакцыях якраз і павінна замацаваць яе, таму на нашым факультэце заўсёды віталася, калі студэнт падпрацоўваў ці нават паўнавартасна працаваў у газеце, на радыё або тэлебачанні.

Я не наракаю, а проста канстатую: сама вучоба ўспрымалася мной у пэўным сэнсе як праца. На першым курсе былі цяжкасці з месцам у інтэрнаце. Балазе, у сталіцы жыла стрыечная сястра. Але паколькі да дома была гадзіна язды, ды і сябры дзяцінства засталіся ў пасёлку, лёс быў вырашаны... Штодня пад'ём у мяне быў у 5.50 раніцы. Трэба было паспець на другі на ліку аўтобус у раскладзе — на 6.38. Гадзіна язды на тагачасных «ЛАЗах» да сталіцы, потым яшчэ гадзіна — на тралейбусе па Партызанскім праспекце — да факультэта. Прыязджаў хвілін за 40 да пачатку заняткаў. Можна было схадзіць у студэнцкую сталоўку (проста каб час заняць) або пагартаць канспекты. Аднакурснікі, якія ўставалі значна пазней, часам здзіўляліся, чаму я так цёпла адзеты... Зімой у прамёрзлым наскрозь аўтобусе (а яны заўсёды набіваліся ўшчыльную) галоўным было не трапіць на крэсла над заднімі коламі. Яно было, калі хто памятае, нязручна высокім і на ім было вельмі горача. А праз гадзіну трэба было зноў выходзіць на холад... Нават пасля заканчэння вучобы я яшчэ доўга адыходзіў ад тых «ЛАЗаў», на якіх ад'ездзіў пяць гадоў запар... А часам магло быць і так. Я па завядзёнцы падымаўся ў 5.50, адзяваўся, снедаў і... зноў ішоў класціся спаць. Напярэдадні (справа ж маладая) можна было вярнуцца позна ўначы з танцаў, таму сіл ніякіх не было... У аўтобусе да горада ці назад драмала ці не палова пасажыраў: такіх жа студэнтаў, як і я. Але студэнцкія гады мне помняцца найперш іншым.

...Ужо з пачатку другога курса мы з сябрам пачалі даволі актыўна «вандраваць» па рэдакцыях яшчэ старога Дома друку. Спрабавалі нешта прапаноўваць як няштатнікі: нататкі, фотаздымкі. Практычна тады я пачаў пісаць заметкі і для «Звязды». Прычым адносіў іх не сам, а перадаваў праз аднакурсніка, які ўжо падпрацоўваў у рэдакцыі. Чаму? Я быў цалкам упэўнены, што старэйшае беларускамоўнае выданне — гэта нешта недасяжнае. «Звязда» — гэта як пік журналісцкай кар'еры, вяршыня памкненняў. І, напэўна, павінны прайсці гады, каб я змог падумаць пра магчымасць папрасіцца туды... А дзеля гэтага трэба працаваць, набываць вопыт. Памятаю, так і сказаў выкладчыку на адным з заняткаў. Не маючы намеру пакрыўдзіць яго: ні тады, ні зараз. Сказаў тое, у чым быў упэўнены.

...Памятаю, на нейкіх практычных занятках нам трэба было скласці нешта вершаванае. Ну, я і выдаў з юнацкім максімалізмам.

Складападзелы, націск, гукі?
Прабачце, але якія мукі!
Павінен я займацца іншым,
Каб потым працаваць
І не быць лішнім!

«Сяргей, вы сапраўды так лічыце?» — здзіўлена спытаў выкладчык. Я шчыра адказаў, што так. Таму што ў гэты самы час, у літаральным сэнсе слоў, за вокнамі нашай аўдыторыі мянялася гісторыя.

Журфак тады месціўся ў будынку наргаса па вуліцы Свярдлова. У двух кроках ад плошчы, якую пазней назавуць плошчай Незалежнасці. Быў красавік... За вокнамі ў гэты момант з мноства мінскіх заводаў — прама з цэхаў — да Дома ўрада калонамі ішлі рабочыя... І я лічыў, што наша месца — як будучых журналістаў — якраз там, сярод гэтых людзей... Пару мы, вядома, дасядзелі. А потым усё роўна разам збеглі з заняткаў на плошчу. Фатаграфавалі на чорна-белую стужку твары, прыслухоўваліся да размоў рабочых... Калі нарэшце да тых, хто забраўся перад Домам урада, выйшаў Кебіч, аднымі з яго першых слоў былі: «Алё, народ...» Працяг патануў у абураным воклічы мноства прысутных...

Праз два з паловай гады вучобы я, як і многія мае аднакурснікі, ужо пачаў стала працаваць. У інфармацыйным агенцтве. Прыступкі «кар'ернай лесвіцы» замільгалі адна за другой. Толькі на гэта мала звярталася ўвагі. Зрэшты, як і на зусім невялікі заробак. Краіна будавала ўласную незалежнасць, цікавых падзей хапала, шмат што адбывалася ўпершыню. А калектыў быў збольшага маладым, нам было цікава разам, было прыемна адчуваць, што мы сумесна робім нейкую агульную сур'ёзную справу, абыходзячы канкурэнтаў. Мы радаваліся нашым поспехам, яшчэ больш праглі вопыту і... пакрысе ўцягваліся ў працу, адчуваючы за яе адказнасць (таму часам мяне моцна здзіўляюць цяперашнія студэнты адсутнасцю актыўнасці, настойлівасці). У нас былі ўласныя карэспандэнты ва ўсіх абласных цэнтрах, у многіх раённых гарадах, у Маскве, Санкт-Пецярбургу... Мы адпраўлялі стужкі навін у краіны Балтыі, ва Украіну. Нашы навіны друкаваліся ва ўсіх беларускіх газетах, гучалі па радыё і на тэлебачанні. Часам мы траплялі нават у расійскія тэленавіны. І тэта рабілі мы — студэнты! Дарэчы, з таго нашага моладзевага калектыву выйшла нямала добрых спецыялістаў, чые імёны зараз на слыху ў журналісцкім асяродку. Гэтак жа як і сярод маіх аднакурснікаў ёсць медыяперсоны: папулярная пісьменніца-тэлевядучая, шэраг пазнавальных тэлежурналістаў, нават лідар вядомай рок-групы. Практычна ўсе яны пачалі працаваць, калі былі студэнтамі.

...На факультэце заўсёды былі выкладчыкі, якіх студэнты вельмі паважалі і лекцыі якіх стараліся не прапускаць. І было сорамна, калі так — з-за працы — часам атрымлівалася... Напрыклад, аднойчы наш кіраўнік знік на цэлы тыдзень. Карэспандэнты, падпісчыкі, арэнда, дагаворы — з усімі гэтымі пытаннямі супрацоўнікі пачалі звяртацца да мяне, нават значна старэйшыя па ўзросце... Паўтаруся, праца была не выключна дзеля грошай. Лішнімі яны не былі, але гэта быў хутчэй дадатак да стыпендыі і дапамогі ад бацькоў. Ды і адукацыя тады была бясплатнай, за адпрацоўку лекцыі і пераздачу экзаменаў студэнты таксама не плацілі.

...Дакладна ведаю, што некаторыя студэнты, нават маючы магчымасць штодня вяртацца (як і я) дадому, свядома выбіралі інтэрнат. Каб быць далей ад бацькоў, жыць і бавіць час «па-даросламу». Ці не хапіла мне інтэрнацкага жыцця? Вучыцца, працаваць і жыць у інтэрнаце было б складана. Калі мне не хапала нечага, я проста часам наведваў аднакурснікаў у іх «часовым доме». Вось што з задавальненнем прыгадваю, дык гэта «яблыкі» ў Клецкім раёне на першым курсе і «бульбу» ў Лагойскім — на другім. І мне нават крыху шкада цяперашніх студэнтаў, пазбаўленых такіх успамінаў...

...Мяне запрасілі працаваць у «Звязду» праз некалькі месяцаў пасля заканчэння ўніверсітэта. З таго часу я тут. У старэйшай беларускамоўнай газеце прайшла амаль палова майго свядомага жыцця. Недасяжнае стала рэальным...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Авось у мяне якраз настальгія па студэнцкіх гадах ёсць. Адчуваю, што з-за працы з першых гадоў навучання нешта недаслухала, нешта недавучыла, ды і што казаць, не даадпачыла па-студэнцку. Безумоўна, цяпер у мяне багаты вопыт за плячыма: маладым спецыялістам пасля заканчэння ўніверсітэта ў рэдакцыі мяне ніхто называў і не падумаў нават, бо яшчэ падчас вучобы я была тут «сваёй». Ды і ведала, магчыма, больш, чым астатнія мае аднакурснікі (дзякуючы, безумоўна, працы на журналісцкай «кухні»). Але, азіраючыся цяпер назад, думаю, нешта б змяніла ў сваім мінулым, каб такая магчымасць надарылася. Бо сапраўднае студэнцтва бывае раз у жыцці і праходзіць вельмі хутка.

Пра цяжкасці студэнцкага жыцця я стала задумвацца ўжо пры паступленні. А самы яскравы ўспамін з яшчэ «нестудэнцкага» перыяду прыгадваецца адзін: пакуль мае аднакласнікі пасля выпускнога пайшлі сустракаць світанак, мяне сонную пасадзілі ў аўтобус «Горкі—Мінск», каб паспела на падрыхтоўчыя курсы. Бо паступіць мне хацелася абавязкова ў БДУ і абавязкова на журфак.

Першы час засваення ведаў быў складаны. Хоць мне, медалістцы, вучыцца было не прывыкаць, але ўніверсітэт усё ж такі не школа. Ды цяжка было і псіхалагічна: я з'ехала на далёка ад роднага дому, дзе адзіную дачку заўсёды апякалі бацькі; я трапіла ў вялікі незнаёмы горад, да якога трэба было прыстасоўвацца. Мяне не пасялілі ў інтэрнат, трэба было здымаць пакой, а за гэты пакой трэба было плаціць немалыя грошы. Разумела, што бацькам было цяжкавата мяне «трымаць», спрабавала зарабіць хоць якія грошы, таму хадзіла па рэдакцыях, актыўна шукала падпрацоўкі... Дарэчы, пра інтэрнат. Лічыцца, што ты так і не «паспытаў» студэнцкага жыцця, калі не пажыў у інтэрнаце. За ўвесь час навучання я ні дня не пражыла ў ім, але, думаю, у некаторых сітуацыях менавіта там было б прасцей. Найперш гэта датычыцца падрыхтоўкі да залікаў і іспытаў, ды і проста да семінарскіх заняткаў. Калі не паспеў нешта запісаць на лекцыі ці ўвогуле яе не наведаў — абавязкова знойдзецца чалавек, у якога гэты запаветны канспект будзе. Ці, напрыклад, патрэбная кніга. Нам трэба было чытаць вялікую колькасць мастацкай літаратуры — беларускай, рускай, замежнай. Зручней было, безумоўна, прайсціся па інтэрнаце і знайсці патрэбнае, чым ехаць у бібліятэку, дзе не заўсёды было тое, што шукаеш. А як весела праходзіць апошняя ноч перад залікам у інтэрнаце (усё ж пару разоў у сяброўкі мне даводзілася заставацца)! У пакоі збіралася чалавек пяць-шэсць, і ўсе распавядалі адзін аднаму адказы на пытанні, нешта ўдакладнялі, тут жа «лезлі» ў падручнікі, спрачаліся... Нават самаму непадрыхтаванаму студэнту за гэту самую ноч можна было пасля здаць іспыты як мінімум на «здавальняюча». Ды і весялей у інтэрнаце, што не кажы. Праўда, можа быць і занадта.

Бачу па сваіх аднакурсніках — інтэрнацкае сяброўства застаецца на доўгія гады. Ведаю, зараз сяброўкі «па пакоі» не толькі падтрымліваюць трывалыя сувязі, але нават ездзяць адна да адной у госці, хоць адна жыве на Брэстчыне, другая — на Гомельшчыне. А колькі шчаслівых пар склалася ў калідорах інтэрната! Вось, напрыклад, мае аднакурснікі Саша і Віка: пазнаёміліся ў інтэрнаце на першым курсе, сустракаліся, пасля пятага — пажаніліся.

...«Маё» студэнцкае жыццё скончылася напрыканцы другога курса, бо жаданне працаваць, набірацца вопыту, унікаць у прафесію было мацнейшым жадання сядзець на лекцыях. Ды і па выбранай мной спецыяльнасці фотакарэспандэнта на факультэце было вельмі мала прадметаў, таму вырашыла: «Практыка, практыка і яшчэ раз практыка!» Памятаю вырашальны момант для сябе: у калідоры вучэбнага корпуса мы з сяброўкай доўга спрачаліся — куды пайсці на практыку. Нават амаль што на пальцах не выкідвалі. Я настойвала на «Звяздзе», сяброўка — на «Рэспубліцы». Ніхто адзін аднаму не скарыўся. І гэта быў лёс, бо менавіта пасля практыкі ў «Звяздзе» я, як і ты, Сяргей, працую тут да гэтага часу.

Зрэшты, цікавая заўвага: як толькі пачала актыўна працаваць, мае адзнакі сталі рабіцца з кожным днём усё лепш. Цяпер думаю, што падчас працы стала больш звяртаць увагу на стан сучаснай журналістыкі, шмат чытаць, мець зносіны са старэйшымі, больш вопытнымі калегамі... З'явіўся свой пункт погляду, хоць невялікі, ды досвед... Поўнасцю згаджуся: соромна да гэтага часу перад некаторымі выкладчыкамі, што з-за працы не атрымлівалася прыходзіць на іх заняткі. А калі гэтыя заняткі былі яшчэ і вельмі цікавымі... Хоць я заўсёды старалася папярэдзіць, калі з'язджала ў камандзіроўку, пасля — «адпрацоўвала» (нейкімі цікавымі дакладамі, пісьмовымі работамі). Здаралася, што тут таіць, і крыху хітрыць: на 5 курсе выкладчык па літаратурна-мастацкай крытыцы даў заданне напісаць спачатку рэцэнзію, а пасля інтэрв'ю з вядомымі беларускімі крытыкамі. Замест таго, каб зрабіць, «як усе», я прынесла фотапартрэты гэтых асоб. Залік мне паставілі, а вось рэцэнзіі пісаць, напэўна, я ўжо ніколі не навучуся...

Дзякуй Богу, амаль усе выкладчыкі ставіліся з разуменнем, падтрымлівалі, многае прабачалі. Памятаю, як адзін з іх сказаў: «Бегункова! У вас і сапраўды вельмі актыўнае, рэпарцёрскае прозвішча!» Пасля гэтых слоў «бегаць» за навінамі я стала яшчэ больш шпарка...

Напэўна, калі падчас вучобы нешта недавучыш, не пачытаеш — пасля ўжо наўрад ці дойдуць рукі. Яшчэ студэнткай абяцала сабе, што ўсё ж такі нарэшце дачытаю Умберта Эка і Джэйн Осцін, давучу стылі і напрамкі жывапісу. Цяпер жа бачу — з-за працы часу на гэта не хапае...

Сёння я не толькі працую фотакарэспандэнтам. Яшчэ неяк нечакана нават для самой сябе стала, як той казаў, па той бок «барыкад» — выкладчыкам. І заўсёды падтрымліваю тых, хто пачынае ўжо ў студэнцкія гады працаваць па спецыяльнасці, час ад часу дазваляю сысці з заняткаў. Але абавязковая ўмова — папярэджанне. І доказ таго, што студэнт не проста «гуляе», а сапраўды працуе. Дарэчы, заўважыла: тыя студэнты, што імкнуцца хутчэй спасцігнуць прафесію, заўсёды стараюцца і заняткі не прапускаць, і на працы паспець. Таму цяпер, калі час ад часу да мяне звяртаюцца маладыя па ўзросце знаёмыя, кабы даведацца, што гэта за прафесія — «журналіст», я спачатку пытаю: «Хочаш вельмі хутка пасталець?» Бо пры выбары гэтай прафесіі ты становішся не студэнтам. Ты хутка становішся дарослым.

... Студэнцкія гады прайшлі вельмі хутка — нават не паспела азірнуцца. Але заўсёды ёсць другі шанц — прайсці яшчэ раз гэтыя гады са сваімі дзецьмі...

Марына БЕГУНКОВА

■

■ Пішам, гаворым

З'ЕХАЦЬ, СЫСЦІ

Калі глядзець на пададзеныя дзеясловы безадносна да кантэксту, дык пытанняў і заўваг яны, бадай, не выклікаюць. І сапраўды, гэта словы звыклыя, даўнія, празрыстыя будовай, часта ўжывальныя ў мове сучаснікаў. Кожнае з іх мае акрэсленае кола значэнняў (паводле Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы, 1977—1984): першае — 7, другое — 15.

У прыватнасці, дзеясловы *з'ехаць, сысці* ўжываюцца адпаведна, калі трэба выказаць значэнне «выехаць, паехаць адкуль-небудзь (звычайна далёка або надоўга)» ці «пайсці куды-небудзь (звычайна на некаторы час)». Праілюструем.

Але на гэты раз Іра *з'ехала* **на нейкую вучобу.** (К. Цвірка)**. Дзяўчына была вымушана** *з'ехаць* **з Капыля, дзе скончыла школу, да бацькоў у вёску Бабоўня** («Звязда» 30.06.2012)**. Так і не бачылі з таго часу дзеда.** *Сышоў* **у ноч і знік (М. Лынькоў).**

Апошнім часам у моўнай практыцы нярэдка назіраюцца выпадкі недакладнага ўжывання згаданых слоў. Разгледзім некалькі тыповых прыкладаў.

Навучаўся ён [Уладзіслаў Дмахоўскі] спачатку ў Вільні, потым у Парыжы, *з'ехаць* **на радзіму ў 1862 г. яго прымусіла смерць бацькі** («Наша слова» 1.08.2012)**. Працавала [жанчына] на мясцовым маслазаводзе [у Клімавічах], а калі выйшла на пенсію, то з'ехала на радзіму [у Сімферопаль]** («Звязда» 21.04.2012). У гэтых сказах павінна быць іншае слова: *паехаць* або *вярнуцца*.

Надоечы, каб хоць трохі развеяцца, адпачыць, ён узяў «адгул», у спецыяльную сумку пасадзіў ката, сеў у электрычку, паехаў на лецішча. Паглядзеў там на лес, пагаварыў з суседзямі, сабраў ягад... А сабраўся *з'язджаць* **— няма [ката]** («Звязда» 2.08.2012). З кантэксту добра відаць, што вылучанае слова неправамерна ўжыта замест *ад'язджаць, вяртацца*.

Жанчыны кажуць пачакаць, што вось-вось таннае малако прывязуць, але я *сыходжу* («Народная воля» 25.25.2012). Паводле сэнсу тут падыдуць словы *адыходжу, адыходжуся, іду* і нават *пайшоў*.

«Павячэраеце з намі?» — з нейкай кранальнай цеплынёю запыталася ў мяне спадарыня Марыя. І гатаваць *сышла* («Дзеслоў» 2012. № 4). Насамрэч гаспадыня *пайшла, выйшла* рыхтаваць вячэру.

У варунках двухмоўнасці складанасць словаўжывання павялічваецца ад таго, што часам рускаму дзеяслову, як, напрыклад, *уйти, уехать,* адпавядае не адзін, а некалькі беларускіх. І, натуральна, аўтар вуснай і пісьмовай мовы (ці сказаць інакш, моўца і пісьмоўца) аказваюцца перад неабходнасцю выбару найбольш прыдатнага слова ў гэтым кантэксце. Але вынік бывае не заўсёды ўдалы. Часта выкарыстоўваюць *сысці, з'ехаць*. Гэта паказвае на тое, што запачаткоўваецца тэндэнцыя выціснуць гэтымі словамі кадыфікаваныя беларускія адпаведнікі (іх некалькі) рускіх дзеясловаў *уйти* (уходить), *уехать* (уезжать). Няхай чытачы газеты «Звязда» пераканаюцца ў гэтым, назіраючы моўныя факты з тэкстаў беларускіх СМІ (дзеля эканоміі месца падамо сказы без пашпартызацыі).

З Паўлам Радзюкевічам пагаварыць не атрымалася, бо ён якраз *з'ехаў* **за межы краіны ў адпачынак; Тут [у барысаўскім клубе БАТЭ] я рабіў першыя крокі, адгэтуль** *з'ехаў* **у Еўропу; [Бацькі паэта], як і многія тагачасныя беларускія сяляне яшчэ задоўга да Першай сусветнай вайны** *з'ехалі* **ў Прыбалтыку ў пошуках заробку; Жанчына... нават адмовілася ад агляду работнікамі хуткай медыцынскай дапамогі. У суправаджэнні сына выратаваная** *з'ехала* **дадому.** Дзеяслоў *з'ехаць* заняў месца традыцыйных у падобных кантэкстах слоў *паехаць, выехаць* (у апошнім сказе патрабуецца такая замена: *паехала* ці *вярнулася*).

А вось ілюстрацыі неналежнага ўжывання дзеяслова *з'язджаць*. **Да суботы паспрабуйце завяршыць бягучыя справы і вярнуцца дамоў з камандзіроўкі, калі вы** *з'язджалі;* **У ліпені пасол** *з'язджае,* **адпрацаваўшы тут [у Беларусі] тры гады.** Дакладнасць можа быць дасягнута ў першым сказе словамі: *выязджалі, ад'язджалі, ездзілі,* у другім — *ад'язджае*. Параўнаем: **Вечарам [быў] на прыёме ў пасла Турцыі Шуле Соймал; яна** *ад'язджае***, развітальны (грандыёзны!) банкет** («Дзеслоў» 2012. № 4).

Асобна пакажам адыход ад літаратурнай нормы пры ўжыванні дзеяслова *сысці*. **Урад сышоў у адстаўку ў сувязі з развалам парламенцкай кааліцыі большасці; Але многія ваенныя праз год-два пасля распаду СССР і яго Узброеных Сіл** *сыходзілі* **на пенсію** (сустракаецца таксама назоўнік сыход (на пенсію); **У выніку Эберхардт** *сышоў* **на радыё; Кантралёры** *сышлі* **ў пакой для ператрусу.** Прапануем варыянты правак (паводле паслядоўнасці сказаў): *пайшоў* у адстаўку; *выходзілі* на пенсію, *выхад* на пенсію; *пайшоў* на радыё; *пайшлі* (зайшлі) у пакой.

Яшчэ прыклад. **Кіроўца** *сышоў* **з месца аварыі, пакінуўшы мёртвага пасажыра.** Хіба ж мог хлопец-няўдатнік у такой сітуацыі спакойна, памалу ісці, сыходзіць. Напэўна, ён *уцёк* ці, кажучы бліжэй да рускай мовы, *збег*.

Не ведаю, як іншымі, а мною, беларускамоўцам на працягу доўгіх гадоў — адмалку да старасці — у словах *з'ехаць, з'язджаць, сысці, сыходзіць* у кантэкстах, накшталт выпісаных з СМІ, заўважаецца зніжаная ацэнка, хоць слоўнікі літаратурнай мовы яе не адзначаюць. Можа, таму і кідаюцца мне ў вочы (і рэжуць вуха) паданалізныя дзеясловы ў сучасных тэкстах.

Як бачым з прыведзеных вышэй прыкладаў, няма дастатковых падстаў адступацца ад рэкамендацый лінгвістаў-лексікографаў. Увогуле ж выявіць, прадугледзець усе грані словаўжывання наўрад ці могуць і мовазнаўцы. Значыць, пры выбары слоў, выбудоўваючы спалучэнні і сказы, стваральны тэкст, аўтары павінны быць больш пільнымі.

Алесь КАЎРУС

■ Дзеля памяці

ДЛЯ ЎНУТРАНАГА СЛУЖБОВАГА КАРЫСТАННЯ...

Голас мужыцкай праўды

Гісторыя — гэта тое з мінулага, што зафіксавана праз пэўныя крыніцы, факты, падзеі. Яно існуе ў свядомасці чалавека, грамадства, народа як сведчанне таго, што гэты чалавек, грамадства ці народ асаблівы і непаўторны. І не важна, прайшло 20 гадоў ці 150 — калі тэма дагэтуль жывая, то значыць, сама падзея можа быць да канца не вывучана, не асэнсавана, не зроблены з яе пэўныя высновы, не расстаўлены ўсе кропкі па месцах. Такая падзея ў беларускай гісторыі — паўстанне, якое разгарэлася пасля адмены прыгоннага права на землях, якія належалі Расійскай імперыі.

Сяляне чакалі волі і мелі надзеі. І шляхта мела надзеі і думала аб праве на волю для народа ці народаў. Яны мелі надзеі быць сабой — сялянамі ці шляхціцамі, але людзьмі, якія заявілі пра свае памкненні і спадзяванні. І гэта быў той час, калі сярод розных галасоў (палякаў, літоўцаў, украінцаў і рускіх) загучаў голас беларусаў — праз газету «Мужыцкая праўда», якой выйшла ажно 7 нумароў. Гэта не мала, калі ўлічыць той час і ўмовы, у якіх дзейнічалі апантаныя ідэяй людзі... І нават калі б гісторыя не захавала нам іх імёны, сам факт, сама спроба неяк сябе асэнсаваць і вызначыць была прыкметнай з'явай, памяць пра якую пранеслі б пакаленні... У ноч з 22 на 23 студзеня 1861 года ў Варшаве пачалося паўстанне, падзеі якога разгарнуліся не на адзін год. Падчас гэтага паўстання гучалі ідэі раўнапраўя грамадзян незалежна ад саслоўя, нацыянальнасці і веравызнання, абмяркоўвалася магчымасць выкупу зямлі сялянамі. І калі адны колы паўстанцаў хацелі аднаўлення незалежнасці Польшчы (страчанай пасля падзелаў Рэчы Паспалітай), то другія імкнуліся заявіць пра інтарэсы іншых народаў. Як адзін шляхціц з Гродзеншчыны па імені Кастусь. І, можа быць, сёння ён бачыцца рэвалюцыянерам і радыкалам у некаторых пытаннях, але гісторыя захоўвае імёны тых, хто ўмее адмовіцца ад прыватнага дзеля грамадскага, ад асабістага дзеля справы агульнай, важнасць якой потым падмацавана ўсім развіццём жыцця. І калі, магчыма, не было яшчэ беларускага народа як носьбіта пэўнай свядомасці, то час паўстання 1861-1863 гадоў стаў тым момантам, калі ідэя прагучала, каб развівацца пазней. Сёння беларускі народ ёсць, і справядлівасць таго, што ён варты сваёй дзяржавы, сцверджаная. Спрыялі ці не гэтаму падзеі 150-гадовай даўніны ці як спрыялі, — гэта глеба для аналізу хутчэй навукоўцаў. Таму што, калі народ саспеў і самасцвердзіўся, то ён не ставіць пад сумнеў і тое, што нехта гэтаму ў свой час паспрыяў, і любы народ будзе шукаць і адзначаць у сваёй гісторыі тых асоб, якія лічылі за гонар ад яго імя прамаўляць, разумеючы, чым рызыкуюць. І як тут казаць, што яны не героі?..

У засеках бібліятэчных сховішчаў: фенаменальныя дакументы аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі аб падзеях 1863—1864 гг.

Так склалася, што лёс гістарычных падзей падобны да лёсу пэўнага чалавека. У адным выпадку ён роўны, просты, зразумелы, у другім — мудрагелісты, заблытаны. Маюцца падабенствы і ў іх характары. Адна падзея, як экстраверт, — цалкам адкрытая свету, другая нагадвае інтраверта, сканцэнтраванага ўсярэдзіну сябе самога. Таму і атрымліваецца, што пра першую ведаеш больш падрабязна, а пра другую толькі эпізадычна. Дакладным прыкладам апошняга варыянту ў гісторыі Беларусі XIX ст. выступае паўстанне 1863-1864 гг., якое да сённяшнага дня не раскрыла нашчадкам усіх сваіх сакрэтаў. Тым не менш, даследчыкі старанна імкнуцца пракрасціся ў таямніцы 1863-1864 гг., дзе актыўнымі і вернымі памагатымі для іх з'яўляюцца крыніцы. Менавіта яны пракладваюць шлях у патаемныя куточкі душы сівой даўніны.

Нягледзячы на тое, што па гісторыі паўстання расійскімі дарэвалюцыйнымі і савецкімі гісторыкамі, а таксама сучаснымі беларускімі навукоўцамі надрукавана 10 зборнікаў дакументаў, у засеках архіўных і бібліятэчных сховішчаў цудоўным чынам сустракаюцца фенаменальныя тэматычныя матэрыялы. Не апошняе месца сярод уладальнікаў такіх скарбаў займае і аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі (далей — АРКіР).

Своеасаблівай гістарычнай перлінай калекцыі з'яўляецца справа «Описание военных действий Каргопольского полка с польскими мятежниками». Яна ўяўляе сабой арыгінал рукапісу на 238 старонках са звесткамі аб ваенных дзеяннях на тэрыторыі Люблінскай губерні падчас паўстання. Храналагічныя рамкі дакументаў — 12 снежня 1863 г. — 1 верасня 1864 г. Яны напісаны дастаткова каліграфічна і знаходзяцца ў добрым стане захаванасці. Аўтарамі дакументаў выступалі кіраўнікі розных рангаў 1-га, 2-га, 3-га, 4-га, 5-га эскадронаў Каргапальскага драгунскага палка, якія былі пасланы ў ваенную экспедыцыю з мэтай задушэння паўстання на Любліншчыне.

Гістарычная даведка. Каргапальскі драгунскі полк — кавалерыйскі полк рускай арміі, заснаваны ў 1707 г. З 1857 г. насіў назву Каргапальскі драгунскі Яго Імператарскай Вялікасці Вялікага Князя Канстанціна Мікалаевіча полк. Камандзірам у 1863-1864 гг. быў палкоўнік граф Крэйц П.К.

У справу ўваходзяць дакументы ваеннага справаводства. Сярод іх пераважаюць рапарты, данясенні, ваенныя журналы, дакументы ўліку (ведамасці і спісы). Рапарты маюць дзве формы: пашыраную і кароткую. Пры выкарыстанні першай той, хто рапартаваў, падаваў падрабязную інфармацыю ў большасці выпадках наступнага зместу: дата і месца руху эскадрона, яго колькасны склад, дзеянні пры перадыслакацыі, назіранні па мясцовасці, вынік экспедыцыі ці ўзброенага сутыкнення з паўстанцамі. У кароткім варыянце шаблонна прыводзіліся звесткі пра дату і месца знаходжання пэўнага эскадрона. На некаторых рапартах з левага боку змешчаны прыпіскі сінім колерам «к сведению». Данясенні пад назвамі «Описание военных действий эскадрона...» або «Описание экспедиции эскадрона...» па фармаце паведамленняў фактычна аналагічныя рапартам, але напісаны ў больш адвольнай форме.

Дакументы, што пададзены пад назвай «Военные журналы» — гэта свайго роду справаздачы пэўных асоб аб выкананні імі ваенных заданняў. У справе яны прадстаўлены журналамі паручніка Заікіна, Сапожнікава, Шчуко і прапаршчыка Дзьяканава за люты 1864 г. Імі па датах распісаны сутнасць і вынікі даручэнняў.

Па гісторыі паўстання расійскімі дарэвалюцыйнымі і савецкімі гісторыкамі, а таксама сучаснымі беларускімі навукоўцамі надрукавана 10 зборнікаў дакументаў, але ў засеках архіўных і бібліятэчных сховішчаў цудоўным чынам сустракаюцца фенаменальныя тэматычныя матэрыялы.

Дакументы ўліку — гэта ведамасці, спісы і «журналы» рознага вопіснага характару. «Журналы» прысвечаны фіксацыі дзеянняў і маршруту руху пэўных структурных часцей палка з абавязковым запаўненнем графаў: склад атрада, час адпраўлення і прыбыцця, мэта і месца камандзіравання, вынік працы. Усе дакументы афармлены ў выглядзе табліц і запоўнены, улічваючы ваенную педантычнасць, вельмі якасна. Так, маецца «Ведомость о результатах цельной стрельбы 2 эскадрона полка», дзе зафіксаваны даты правядзення стрэльбаў, адлегласць ад мішэні, колькасць удзельнікаў, куляў, якія былі выпушчаны і пацэлілі.

Цікавым па змесце з'яўляецца і «Ведомость делам с польскими мятежниками в 1863 году ...». Вопіс улічваў зместкі па наступных катэгорыях: а) званне частей войск; б) месяц и число; в) место, уезд, губерния; г) состав отряда и начальник оного; д) кто предводительствовал шайкою; е) примечание».

Такім чынам, выяўленыя дакументы дазваляюць прасачыць не толькі ход ваенных дзеянняў, але і даведацца пра склад, агульную арганізацыю расійскіх войскаў і паўстанцкіх атрадаў, іх стратэгію і тактыку, атрымаць колькасныя падлікі забітых, параненых, палонных, спісы ўдзельнікаў, апісанні баталій. Зразумела, што гэтая інфармацыя паказана толькі з пазіцыі членаў расійскай адміністрацыі, якая не ўлічвала сведчанні супрацьлеглага боку (паўстанцкага), таму пазбегнуць некаторай долі суб'ектывізму тут немагчыма. Аднак нельга адмаўляць і наяўную дакладнасць вылучаных крыніц. Яна абумоўлена мэтай іх складання, а менавіта — для ўнутранага службовага карыстання, дзе фальсіфікацыя не была выгаднай, бо заблытвала б саміх жа службоўцаў. У выніку маем найкаштоўны інфармацыйны патэнцыял для стварэння летапісу падзей 1863—1864 гг., дзе, пагаджаючыся з А. Міла-відавым, «военные действия, можно сказать, занимают центральное место. Остальные же проявления революционного движения: манифестации, сопротивления законным властям <...> и т. п. — лишь акссесуары главной исторической драмы, кулисы которой закрылись, как только прекратились военные действия...» А апісаныя дакументы так і просяцца стаць адным са светлых промняў у тунэлі навуковай рэканструкцыі ваеннай гісторыі паўстання як айчыннымі, так і замежнымі даследчыкамі.

Алена ФІРЫНОВІЧ,
кандыдат гістарычных навук,
навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

УВАГА: НОВЫ АДЛІК!

Рэдакцыя газеты «Звязда» абвяшчае конкурс на лепшае апавяданне ў 2013 годзе

Наш конкурс адкрыты для ўсіх — як для прафесійных літаратараў, так і для тых, хто вырашыў толькі паспрабаваць свае сілы, выказаць свае набалелыя думкі ці парадаваць чытачоў сваімі поглядамі на нейкія падзеі ці з'явы. На конкурсе разглядаецца толькі адно апавяданне ад аднаго аўтара (!), памерам да 5 машынапісных старонак (ці да 10-12 тысяч знакаў). Гэта павінна быць апавяданне на беларускай мове, якое нідзе дагэтуль не друкавалася.

Творы накіроўваюцца на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, беларуская газета «Звязда», з паметкай «на літаратурны конкурс». Можна дасылаць апавяданні на электронны адрас: info@zvyazda.minsk.by таксама з паметкай «літаратурны конкурс».

Шаноўныя аўтары! Абавязкова паведамляйце сваё прозвішча і імя (сапраўднае), імя па бацьку, дакладны паштовы адрас, і поўныя пашпартныя звесткі (нумар, кім і калі пашпарт выдадзены, асабісты нумар), а таксама кантактны тэлефон. Калі ласка, напішыце колькі слоў пра сябе: чым займаецеся, калі і пад уплывам чаго пачалі пісаць.

Вядучым конкурсу ў 2013 годзе будзе пісьменнік Алесь Бадак. Менавіта ён выбірае лепшыя апавяданні для друку. Рэдакцыя пакідае за сабой права не рэцэнзаваць і не вяртаць творы.

Лепшыя апавяданні, прадстаўленыя на конкурс, будуць надрукаваны на старонках газеты з выплатай ганарару. Зацверджанае журы (вядучы, прадстаўнікі рэдкалегіі газеты разам з рэдактарам) разгледзіць апавяданні, якія будуць надрукаваны на працягу гэтага года, і падвядзе вынікі конкурсу на пачатку наступнага года з выплатай грашовых прэмій за 1-е, 2-е і 3-е месца.

Чакаем вашых твораў!

МАРУСЬЧЫНА ДАРОГА

Infandum renovare dolorem — *Жудасна зноў уваскрашаць боль. (лац.)*

Анатоль Бігайдараў шмат гадоў аддаў працы ў раённай газеце, дзе на жыццё глядзеў не з кабінетнага акна, а ў шматлікіх камандзіроўках і сустрэчах з самымі рознымі людзьмі. Шмат хто з гэтых людзей станавіліся героямі яго журналісцкіх матэрыялаў, многія — героямі яго апавяданняў. Невыпадкова сам аўтар прызнаецца, што піша пра тых, каго ведае, пра тое, што бачыў на ўласныя вочы, а калі пачуў ад кагосьці, то, як у выпадку з апавяданнем «Марусьчына дарога», спачатку прапусціў праз уласнае сэрца.

Алесь БАДАК.

Гэтую хворую на душу старую звалі Маруська-бежанка...

У вайну немцы з прыхвастнямі сярод белага дня спалілі яе дзеда, маці, чатырох старэйшых сясцёр-школьніц, дзвюх цётак, дваюрадных братоў-немаўлят — словам, амаль усю радню. Сусед-юда, мусіць, каб прыхапіць дагледжаны хутар-«камуну», падказаў акупантам, што гаспадар падворка, былы сакратар сельсавета, — камісар партызанскага атрада, а яго брат — кадравы вайсковец, танкіст.

Сямігадовай Марусьцы тады пашэнціла: пагнала гусей за поплаў, на Рудое балота. Пакуль яна вярнулася, родзічаў, як скаціну, фашысты загналі ў сушню, а дзверы забілі сасновымі шалёўчынамі.

Божухна мілы, Божа!.. Жахлівыя, жудасныя крыкі дзяцей, страшныя стогны і праклёны дарослых чула ці не ўся акруга!

...Ужо калі мінула чэзлы асіннік і выйшла на поплаў, зарослы мурагом, трыпутнікам, дзьмухаўцамі, духмянымі рамонкамі, Маруська ясна пачула злосны, шалёны брэх Босага. Так люта-звяглівабрахаў ён толькі раз, калі марозным і завейным снежаньскім надвячоркам расчуў, як у птушнік, да чубатак, лез-караскаўся тхор...

І тут — тры сухія, з рэхам-пагалоскай, стрэлы: тыч-чах!.. тыч-ччах!.. тыч-ччах!

Перадсмяротнае скавытанне сабакі... Крыкма крычаць людзі... Жах!

Дзяўчынка схамянулася, пужліва азірнулася і зарумзала. Плачучы, падбегла да ссохлага куста лазы, прысела на мурог і ўслухалася. Не адразу, але пазнала родныя галасы... Во дзед некаму штось даказвае... А ето мамка кагось аб нечым просіць... І зноўку старэчы кленч... А ето слёзныя крыкі сясцёр... Васіліны... Анюткі... Каці... Зноў Васіліны... А ето вокліч Валькі...

У какафоніі галасоў Маруська распазнала галашэнне цётак — Вольгі і Рыты...

«Вой, як страшна яны галосяць-прыгалошваюць!.. Зусім як той вясной, калі памерла баба Ганна... Божачкі, няўжо і сягоння ты кагось забраў!?. Каго ж?.. Мо Міцьку? Петрыка? Не-е, етыя й спяць ля сваіх мамак — груднічкі... Босага?.. Босага!.. Нейкія бандзюкі забілі сабаку!..»

Дзяўчынка перастала плакаць, церанула ручкамі па вачах, глыбока ўздыхнула і, сутаргава ікаючы, прыслухалася. Марна! Хутар маўчаў. Як вымер.

«Вецер змяніўся! — даўмелася малая. — Зараз дзьме «чарцянё» — вецер з Рудога балота». Мянушку ветру прыдумала Маруська пасля пачутай ад дзеда Васіля казкі пра цмока, лесуна, іншую нячыстую сілу, якая жыве пасярод Рудога балота, у дрыгве.

Тым часам дзед Васіль то кляў бандзюкоў, то слёзна маліў іх злітавацца — не чапаць хаця б унучкоў і ўнучачак... «А яны ж, яснавяльможныя паночкі, як вырастуць, да скону дзён сваіх будуць дзячыць вам і вашым бацькам за літасць чалавечую!»

Віламі, жэрдкамі з плота, прыкладамі каротких бельгійскіх вінтовак няўмольныя каты з айнзатцкаманды загналі «камісарскіх выпладкаў» у сушню. Адзінаццаць душ. Дзеду, які больш за іншых даймаў сваімі мольбамі, карнікі адбілі нутро і штыком прапаролі рукі і правую нагу.

...Маруська перабегла бярэзнік, які межаваў з плотам іхняга агарода, зірнула направа і ад страху скамянела.

Незнаёмы шэра-зялёны грузавік з брызентавым кузавам млеў-пляжыўся на ліпеньскім сонцы. Крокаў за дзесяць ад веснічак. Насупраць акон бацькоўскага пяцісценка.

Вялікі гурт напаўапранутых вайскоўцаў-чужынцаў гергетаў наўкол студні. Набрыдні паводзілі сябе нахабна: кідаліся крадзенымі гуркамі, зялёнымі памідорамі, вялікімі, але даўкімі — зімовыя сарты — грушамі... Пяцёра гулялі ў футбол гарбузамі... Адзін, чарнявы, з цыгарэтай у роце, вымаў з радняных мяшкоў курэй (хапаў за пер'е, ногі, крылы), а другі, белагаловы, як дзьмухавец, маленькай бліскучай рыдлёвачкай, падхэкваючы сабе, спраўна сек галавы: хэк!.. хэк!.. хэк!.. Крыкучь, у камендатуры іхняй месца... І няхай, нам на ўласным падворку багата пакайней...

Маці фартухом абцерла потны твар, прасушыла вочы і строга, шматзначна, паглядзела на сясцёр, дзеда. Стары знак нявесткі зразумеў, матнуў галавой і шэптам папярэдзіў астатніх: «Ні плачам, ні енкам не напалохайце Маруську: падасць малеча голас — міталем трапіць сюды!»

«Каля хаты і сапраўды пакайней... Толькі за дзетак душа баліць, душа трапеча!.. Так іх шкода, так шкода!.. І не пажылі, бедныя!.. — маці тужліва перахрысцілася, заплюшчыла вочы і ў перадапошні раз звярнулася да свайго хатняга святога — да Міколы-ўгодніка: — Ойча, от ты добра ведаеш, як мы ўсе, каго злыя людзі засунілі ў гэтым хляве, цябе любілі і любім... Але ж ты не адвярнуў лютую смерць... Нават ад бязгрэшных груднічкоў... Не-не, цябе я не вінавачу — на ўсё воля Божая!.. Мікола, заступнік народны, зараз, за хвіліны да смерці, не за сябе прашу, — уратуй маё астатняе дзіцё, і няхай яна жыве і за нас».

Маруська ля сцяны падняла ржавы цвік і шкрэбла, шкрэбла ім па стыку неабразных дошак. Маці спяшалася даказаць:

— Ты, дачушка, бяжы адсюль!.. Вой, не-не, крый Божа, не бяжы, — паўзі, толькі паўзі!.. На локціках і жывоціку... Па разорцы... Па жыцейку... Як шпарчэй — у бярэзнік... Перапэцкала сукенку?.. Сукенку, донька, не шкадуй: от татка з вайны вернецца, ён нам... ён табе... дзве... многа новых купіць... А як жа ж, і Васіліне, і Нюрцы, і Кацюшцы, і Вальцы...

Маруська дашкрэблася! І такі прасунула ўказальны палец у шчылінку: вельмі хацелася дакрануцца да мамкі...

Тая заўважыла краёк руковага пальчыка, хутка нахілілася і дакранулася гарачымі шурпатымі вуснамі да яго. Цалавала і шаптала-даказвала:

— ...І, маё ты цыбатае буслянё, крый цябе Багародзіца, балота не пакідай... Цмокі? Якія цмокі?.. А-а... Няма ўжо іх там: напалохаліся немчуры і паляцелі... Далёка, на Лельчыцкія багны... Так вось, на нашым балоце ты нікога і нічога не бойся: калі хтось і вухне-закугіча, то не звер і не чалавек, а якась птушка... Мамку слухаеш?.. Лапак сасновых нацерабі і сядзь на якой купіне... Сядзі так да ўзыходу сонца... А раніцай, мая ты сірац... Мая ты журавінка, бяжы-ўцякай і з балота... Прыкота, ірад, выхваляўся: «А заўт'я апоўдні мы ўсёй камандай ізноў пад'едзем на камісайскае селішча: паставім к'ёпку...»

Маці перахрысцілася і ўжо не шэптам, ціхім голасам, працягвала:

— ...Як толькі разводнее, бяжы проці сонейка — трапіш на выспу, адтуль — на Ажынную канаву. Па ёй выйдзеш на бальшачок... Вы з дзедам на калёсах не раз ездзілі па ім... Так-так, да бабы Лёдзі, дзедавай роднай сястры... Тым летам яна цябе вучыла чоўнам правіць... Маруська, абавязкова дабярыся да Лёдзі! Яна ж цяпер — твая ма...

Маці схамянулася, адвярнулася.

Дзед, цёткі слухалі апошні дыялог маці і дачкі і засяроджана маўчалі. Марусьчыны сёстры ўпотай плакалі.

...Паліцаі, акром Кайтавеля, які ўсё валэндаўся з паходняй, пабеглі да калодзежа: спёка даймае і нелюдзяў. Насёрбаўшыся сцюдзёнай вады (Карповіч замест зламанага кутага крука скарыстаў кавалак меднага дроту), пакрочылі на даклад да начальніка карнай каманды унтэрштурмфюрара СС Вальтера Шнайдэра. Той, малады, рослы прыгажун, з літоўскіх немцаў, стаяў на надламанай рабіны і, гледзячы на эсэсманаў, якія весела галёкалі вакол калодзежа, шморгаў долу, нібы даіў, буйныя чырвона-аранжавыя ягады.

Юрчанка, як старшы па чыне, пачаў бадзёра дакладваць. Шнайдэр зняў шэрую пілотку, працёр бела-блакітнай хусцінкай потны лоб і роўным голасам зазначыў:

— Хер Юрчанка, здэсь нэт кольхоз... Нэт партбюро... Нэт докляд... Bete und arbeite!.. Малісь і работай! Как чорны бік работай!

— Яволь, хер унтэрштурмфюрар! — выцягнуўся Юрчанка.

Шнайдэр адвярнуўся. Калі паліцай адбег, афіцэр загадаў эсэсманам акружыць сялібу па перыметры агароджы.

...Дзед шапнуў нявестцы: «Усё, выпраўляй унучку! Вось-вось «бобікі» вернуцца з нарадамдазволам на падпал!»

Маруська падала галасок:

— Мамко, а нашы гусі?

— Якія гусі?

— Ну тыя, што я прагнала на балота.

— Гусі?.. А няхай сабе... Няхай жывуць на волі... Абы далей ад етых нелюдкаў (каб іх зямля не трымала!)... А ты, мая крывіначка, — жыві!.. Жыві доўга-доўга!.. Цяпер — падай долу і паўзі адсюль!..

— І не павяртайся, родненькая!.. Не павяртайся... — дадала цётка і ўсхліпнула. Адразу ж, услед, заплакала Васіліна... Дзед, крывячыся ад болю, прыгарнуў да сябе абедзвюх...

Маруська, ікаючы ад горкіх слёз, кінулася ў разору, папаўзла.

Дзяўчынцы памагалі, баранілі яе ад варожага вока, густыя клубы едкага белавата-шызачорнага дыму. Супраць усіх законаў фізікі, яго шары не рваліся ў бясконцую бірузу ліпеньскага неба, а мякка-мякка слаліся-рассцілаліся паверх духмяных бела-ружовых кветачак бульбоўніку і касмеі-самасейкі, накрывалі парасончыкі кропу і каляндры, галавастыя цыбукі часнаку, цалавалі-мілавалі жылкаваты зялёна-ліловы бурачнік, шурпатыя лісты аранжавых пузаноў-гарбузоў...

❑❑❑

...Маруська ўратавалася, выжыла. І дажыла да глыбокай старасці. Вось толькі ўсе мірныя паслявоенныя тыдні, месяцы, гады, дзесяцігоддзі былі для яе адным бясконцым днём. Тым самым, ліпеньскім.

❑❑❑

...Штораніцы, на досвітку, Маруська ціхенька ўставала (жыла яна ў вялікім сучасным аграгарадку, у стрыечнай пляменніцы, у прыватным доме на цэнтральнай вуліцы сяла), паўзком выбіралася на двор і, азірнуўшыся, лезла пад ганак. Там яна спешна апранала звечара прыхаванае рыззё: старую чорную плюшавую жакетку, зялёную вязаную спадніцу да зямлі і дзіравую сінюю каруску.

На нагах — зімою і летам — анучы, аборы, лапці-лазавікі. І дзе толькі разжывалася гэтымі «рарытэтамі»? Мусіць, пляла ўласнаручна...

За плячыма — таксама абавязковы атрыбут — ладны клунак-увязак.

Тутэйшыя школьнікі — мякка кажучы, «вераб'і-разбойнікі», — вядома ж, не маглі не пацікавіцца, што за скарб носіць і ніяк не пераносіць — якраз паўз школьны стадыён! — ссівелая нямая цётка-дзівачка, цётка-вар'ятка?

«Надзейны падмурак і будучыня вёскі» быў моцна расчараваны, калі, замест залатых самародкаў, пабачыў у клунку бязрукую і бязногую ляльку з падсмаленымі коскамі, біты чугунок, іржавую патэльню, чырвоны жаночы бот, паўбохана цвілога хлеба, сухія валошкі і рамонкі, пляшку вады і моцна абгарэлы драўляны абраз (па верхняй частцы адзін са шкаляроў распазнаў Міколу-ўгодніка).

...Праз увесь аграгарадок, напрасткі, выкідваючы далёка наперад сучкасты кій, Маруська шпарка, не азіраючыся, як апантаная, кожную раніцу, у лютую сцюжу і пякельную гарачыню, у снежную віхуру і праліўны дождж, крочыла-спяшалася... Куды? У сваё кароткае, як чэрвеньская вясёлка, даваеннае маленства. Да мамкі, таткі, братоў і сясцёр...

Дваццаць сем кіламетраў да роднай сялібы ёй не здаваліся даллю: дарога дадому заўжды караценькая!

А паселішча таго, бацькоўскага хутара-«камуны», як і бліжэйшай вёскі яе маленства, даўно не існавала. Нават на картах. Фашысты спалілі і хутар, і сяло (блізка ад лесу, ад партызан). Не пакінулі аніводнай хаты. Акцыя адплаты была здзейснена праз тыдзень пасля таго самага дня, як партызаны, помсцячы за Марусьчыну радню, прыйшлі, на папялішчы, расстралялі і спалілі чатырох з сямі катаў-паліцаяў.

...Вярталася ў аграгарадок Маруська позна, з заходам сонца, а ўзімку — пры святле зорак, часцей жа — у глухой цемры. Здарожаная, бяссільная.

З-пад мокрай ад поту гарускі выбіваліся густыя кудлы сівых валасоў. Выраз падрапанага аб кусты твару — спакойна-аніякі, манументальны. Некалі васільковага колеру вочы выцвілі на сухацвет; яны ўсё чыста бачылі, аднак абсалютна не рэагавалі. Не ўспрымалі? А мо не жадалі, адмовіліся ўспрымаць?

...З сярэдзіны сакавіка і па канец кастрычніка каля ярка-жоўтай калонкі, што ў дварысмясцовага «галоўпаштамта», Маруська-бежанка абавязкова спынялася. Відаць, даймала смага. Не здымаючы паклажы, старая даставала з клунка пляшку з-пад шампанскага, напускала ў яе студзёнай вады і прыкладвала да скроняў, шыі, грудзей... Хвілін праз пяць яна стомлена адыходзіла ад калонкі і, шоргаючы лазавікамі, чэпала да елкі, што расла ля самай агароджы. Тут Маруська фартухом — колісь бела-чырвона-чорным — выцірала ўпацелы, бронзава-шызы твар, зрэзаны глыбокімі раўчукамі маршчын, і, азірнуўшыся, сквапна прыпадала патрэсканымі вуснамі да рыльца бутэлькі. Піла, піла, піла... Аддыхаўшыся, старая перавязвала гаруску і — шшарк-шарк, шшарк-шарк — працягвала шлях. Ад калонкі да месца начлегу — крокаў семсот.

...А на золку — зноў у дарогу. І не было канца дарозе, у якую Маруську выправіла праклятая вайна.

Анатоль БІГАЙДАРАЎ.

ГЭТА ВАМ НЕ «ТАМАГОЧЫ»...

У школьным зімовым садзе Круглянскай сярэдняй школе № 2 з кафейнага дрэва можна здымаць ураджай, а пры жаданні таксама смажыць зярняты і — чаму б і не? — варыць каву.

Гэты сад — нібыта зялёны востраў сярод снежнай і марознай зімы. Невялікі школьны пакой запоўнены зелянінай розных адценняў. Адна сценка ў ім люстэркавая, таму адразу здаецца, што сад проста бясконцы.

Кафейнае дрэва — сапраўдная славутасць школьнага саду. Цёмна-зялёнае каляное лісце з пражылкамі, рэшткі адцвілых кветак. Дрэва цвіце час ад часу дробнымі белымі кветачкамі і круглы год дае плады!

— Паглядзіце, плады выспелі, і гэта сапраўдная кава, — не хавае гордасці **настаўніца біялогіі Святлана ЦЭНКЕР**. — Мы прызвычаіліся, што зярняты кавы — карычневага колеру. Але яны становяцца такімі толькі пасля смажання, нармальныя зярняты якраз бледна-зялёныя і вельмі цвёрдыя.

Кафейнае дрэва ў зімовым садзе пасадзілі самі вучні: першы чаранок прывезлі з Батанічнага саду ў 2004 годзе, калі і ствараўся школьны зімовы сад. За гэты час дрэва вырасла вялікае і прыгожае. Тыя вучні школу даўно скончылі. На выпускным балі яны фатаграфаваліся з экзатычным дрэвам на памяць і цяпер робяць гэта штогод на вечары сустрэч. І не толькі яны — усім цікава.

Увогуле, зімовы сад у школе стварылі не толькі дзеля цікавасці: ён дапамагае ў вывучэнні біялогіі і экалогіі, тут можна круглы год назіраць за раслінамі ў натуральных умовах, праводзіць лабараторныя работы.

— Школьнікі ў нас свядомыя, любяць прыроду, — кажа пра сваіх памочнікаў настаўніца.

Тройца аматараў-садаводаў з 6 «А» прыходзіць у зімовы сад некалькі разоў на тыдзень.

— Трэба берагчы прыроду: у кожнага павінна быць хоць адна жывая расліна, — лічыць **11-гадовы Дзіма ЦЭНКЕР**. — Тут мы дыхаем свежым паветрам, а ад камп'ютара вочы псуюцца.

— Мая самая любімая расліна — ружа, — кажа **Саша МІНУЧЫЦ**. — Кветкі добрыя, яны ўпрыгожваюць наша жыццё і наш дом.

— Мне цікава, як з маленькага парастка вырастаюць вялікія і прыгожыя кветкі, — **Даша ЦІМАНАВА** паказвае сваю любімую «падапечную» — яшчэ невялікую дыфенбахію.

Даша Ціманава росціць дыфенбахію з маленькага парастка.

Самому вырасціць расліну — гэта вам не «тамагочы» кармміць. Кветкам патрэбен сапраўдны догляд: гэта буйства зеляніны — вынік штодзённай карпатлівай працы дарослых і дзяцей. Расліны ж хварэюць — напрыклад, у садзе ёсць «лысы» кактус, які скінуў свае калючкі. Кветкам патрэбны ўгнаенні, цяпло, сонца і правільны паліў.

— Вой, калі разам з сябрамі гэтым займацца, то зусім не цяжка, а наадварот, весела, — гавораць дзеці. — Увогуле працаваць у зімовым садзе — ганаровы абавязак у нашай школе. У нас усе любяць расліны.

У зімовым садзе цяпер цвіце ружа. Калісьці яе набылі для школьнага ўчастка, але ёй на адкрытым паветры не спадабалася. Затое ў памяшканні кожную зіму на ёй з'яўляюцца руковыя кветкі.

Яшчэ адна зусім не звычайная расліна — кітайская архідэя. Тонкае доўгае лісце, а пасярод такога куста — доўгі бутон пяшчотнага руковага колеру. Незвычайна прыгожа.

— У нас архідэі не цвілі вельмі доўга. Мы чакалі-чакалі, але аднойчы страцілі цярплівасць і пераставілі іх на задні план, — расказвае Святлана Валер'еўна. — А неяк раніцай прыйшлі і ўбачылі шмат «стрэлак», на якіх з'явіліся кветкі.

Фінікавая пальма з невялікай расліны выросла да статнай прыгажуні. Ліраподобны фікус назвалі так за лісце, падобнае да музычнага інструмента.

— Я параіла б усім трымаць дома фікусы, — гаворыць настаўніца біялогіі. — Яны выраблюць вялікую колькасць фітанцыдаў, біялагічна актыўных рэчываў, якія забіваюць шкодных бактэрый і аздараўліваюць памяшканне.

У зімовым садзе цяпер набірае абароты праект «Экзот з зярнятка». Аднойчы дзеці елі ківі і фейхоа і пасадзілі ў зямлю зярняты. Выраслі ўжо велікаватыя дрэўцы, але цяпер гэтыя субтрапічныя расліны скінулі на зіму лісце і да вясны будуць мець не самы прэзентабельны выгляд.

— Школьнікі яшчэ разлічваюць атрымаць з іх плады! — кажа Святлана Валер'еўна. — Першымі павінны быць фейхоа, бо расліне ўжо 4 гады. Мы прачыталі ў спецыяльнай літаратуры, што ў памяшканні фейхоа зацвітае на 5-ты год, а дае плады на 10-ты. Так што ўсё цалкам магчыма!

Новыя экзоты ў Круглым цяпер будуць расціць з фініка і кафейнага зерня. Можна таксама заняцца і хурмой. Сакрэт тут адзін: трэба падпілоўваць зярнятка, каб прабіўся расток.

— Ведаеце, дзяцей і ў наш камп'ютарны век цікавяць расліны, — кажа Святлана Цэнкер. — Таму што жывыя стасункі з прыродай не заменяць ні інтэрнэт, ні электронныя цацкі.

А што датычыцца кавы з уласнага кафейнага дрэва, то настаўніца біялогіі паабяцала паспрабаваць пасмажыць зярняты, памалоць і зварыць. Ну хаця б з цікаўнасці. А можа, будзе смачна?

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

г.п. Круглае.

Зярняты кавы — ураджай з кафейнага дрэва.

Саша Мінучыц і яе любімая руковая ружа.

■ Птушкі ў горадзе

РАТАВАЦЬ ВАДАПЛАЎНЫХ ТРЭБА З РОЗУМАМ

У апошнія гады найбольшая колькасць зімуючых вадаплаўных птушак у Беларусі назіраецца ў Мінску, менавіта таму тут у рамках нацыянальнай кампаніі «Зімовыя ўлікі птушак 2013» ужо трэці раз прайшлі сінхронныя ўлікі вадаплаўных і каляводных птушак.

Супрацоўнікі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя разам са спецыялістамі з Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» наведалі вадаёмы і вадацёкі сталіцы, якія не замярзаюць. Улікі праводзіліся па 8 маршрутах. Як вынік — 15 відаў птушак агульнай колькасцю 5 777 асобін. Канчатковыя вынікі будуць падведзены пасля завяршэння ўлікаў у канцы месяца, што дазволіць атрымаць дакладны малюнак міграцыйных працэсаў вадаплаўных птушак у Беларусі.

— Асноўная мэта ўлікаў — выяўленне відавога і колькаснага складу зімуючых у краіне птушак, тэндэнцыі колькасці, а таксама магчымыя змяненні ў птушыных паводзінах зімой у сувязі з глабальным пацяпленнем, — паведамілі ў Мінпрыроды. — Улікі — важны элемент экалагічнага маніторынгу Рэспублікі Беларусь, а таксама частка міжнароднага ўліку вадаплаўных птушак, які ахоплівае звыш 25 тысяч месцаў у больш чым 100 краінах свету і з'яўляецца адной з найбуйнейшых сусветных схем маніторынгу птушак.

Карыстаючыся выпадкам, Мінпрыроды нагадвае, што падкормліваць вадаплаўных птушак з мэтай выратавання трэба толькі пры адсутнасці адкрытай вады ў зімовы перыяд і ўсталяванні ўстойлівых маразоў (тэмпература ніжэй за мінус 15 градусаў на працягу трох і больш дзён). Акрамя таго, варта памятаць, што вадаплаўныя птушкі могуць есці ежу, якая не з'яўляецца іх натуральным кормам, і ў шэрагу выпадкаў менавіта гэта вядзе да іх гібелі. Найбольш шкоднай ежай для птушак з'яўляецца чорны хлеб, бо ён выклікае цяжкія працэсы браджэння ў страўнікава-кішачным тракце. У якасці корму лепш выкарыстоўваць розныя збожжавыя, але не цвёрдыя, а трохі прарошчаныя. Падыдуць ячныя і аўсяныя крупы з сырой ці варанай гароднінай. Асабліва карысным будзе прарошчанае зерне пшаніцы.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Добрая навіна

ЗІМОВЫ СТАРТ ВЕСЛЯРОЎ

Выхаванцы спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву №6 па веславанні горада Гомеля пачалі трэніроўкі на новай вяслярнай базе, абсталяванай на самым сучасным узроўні. Да цяперашняга часу яны займаліся ў прыстасаваных памяшканнях без належных бытавых умоў. Сярэбраны прызёр XXX летніх Алімпійскіх гульняў у Лондане Раман ПЕТРУШЭНКА адзначае, што ў часы, калі ён пачынаў сур'ёзна займацца вялікім спортам, такіх умоў не было і блізка:

— Тут прасторныя залы для трэніровак з усімі неабходнымі трэнажорамі, ёсць спецыяльныя памяшканні для захавання лодак і іншага інвентару. А ўсё гэта вельмі важна для прафесійнага спартсмена. Тым больш, ёсць усе ўмовы, якія дазваляюць праводзіць зімовую падрыхтоўку. Гэта вялізны крок наперад у параўнанні з тымі ўмовамі, у якіх трэніраваўся я. Аднак лічу, што «селекцыю» спартсменаў трэба праводзіць на невялікіх базах у маленькіх гарадах — асноўная колькасць іх прыходзіць менавіта адтуль. А такія вялікія базы, як гэта, патрэбны для падрыхтоўкі больш кваліфікаваных спартсменаў.

Новая вяслярная база — завяршальнае звяно ў развіцці інфраструктуры вяслярнага канала, раней пабудаванага ў горадзе над Сожам. Дарэчы, на раку адсюль адкрываецца вельмі прыгожы від. Прадугледжана, што ў сезон лодкі адразу з базы можна будзе спусціць на ваду. Цяпер у Гомелі можна будзе не толькі арганізаваць на належным узроўні навучальна-трэніровачны працэс, але і праводзіць абласныя і рэспубліканскія спаборніцтвы па акадэмічным веславанні і веславанні на байдарках і каноэ. **Міністр прыродных рэсурсаў і старшыня Беларускай асацыяцыі каноэ Уладзімір ЦАЛКА** адзначыў, што новая база — доўгачаканы падарунак для падрыхтоўкі спартсменаў, якія ставяць сусветныя рэкорды. Прынамсі, у склад нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па веславанні акадэмічным і веславанні на байдарках і каноэ ўваходзяць 145 спартсменаў з Гомельшчыны, а гэта — трэцяя частка:

— Веславанне на байдарках, каноэ і акадэмічнае для Гомельшчыны — брэндавыя віды спорту, летась мы тры медалі на Алімпіядзе ў Лондане заваявалі. Думаю, што спартсмены школы алімпійскага рэзерву адпрацуюць такі цудоўны падарунак на будучай алімпіядзе ў Рыа- дэ-Жанейра.

Пакуль у спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву №6 займаецца 300 навучэнцаў. Плануецца, што іх колькасць у самы блізкі час павялічыцца да 500. Між тым, тут паклапаціліся і аб развіцці іншых відаў спорту: валейбола, баскетбола, лыжнага. Таму ёсць прасторныя гульнявая і трэнажорныя залы, медыка-аднаўленчы цэнтр, майстэрні для рамонту інвентару і абсталявання, саўна і многае іншае... Гэта ўжо пяты аналагічны спартыўны аб'ект, які быў здадзены ў эксплуатацыю на Гомельшчыне за апошнія чатыры гады. Яго адкрыццё прымеркавана да святкавання 75-годдзя з дня заснавання Гомельскай вобласці. **Старшыня аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК** адзначыў, што ўнікальная база дазволіць прыцягнуць да заняткаў спортам яшчэ большую колькасць дзяцей і моладзі:

— Вельмі важна, што наша дзяржава накіроўвае вялікія сродкі на развіццё спартыўнай інфраструктуры. Бо грошы, якія ўкладваюцца ў моладзь, з'яўляюцца самым надзейным унёскам у будучыню.

З уводам у строй спартыўнага збудавання створана 20 новых працоўных месцаў, у тым ліку і для трэнераў. Займацца тут змогуць не толькі выхаванцы спартыўнай школы па веславанні, але і простыя гамяльчане. Прадугледжана, што ў памяшканні будуць аказвацца і платныя паслугі. На стварэнне спартыўнага аб'екта было выдаткавана Br28,2 млрд.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

■ Вольны час

З СУМЁТАЎ — У ЛЕТА!

Рэпартаж пра пошукі цяпла і яркіх фарбаў у зімовым горадзе

Стаміўшыся ад беспрасветнага холаду на вуліцы, многія пачынаюць марыць пра адпачынак і цёплае лагоднае надвор'е ўжо ў студзені, адразу пасля зімовых святаў. Вядома, на пляжах у Егіпце ці Індыі зараз выдатна. Галоўныя «складанасці» тут — узяць водпуск на працы і заплаціць грошы за пуцёўку. А вось як знайсці для сябе кавалачак лета і прыемных уражанняў, не выязджаючы за межы снежнай Беларусі? Тут трэба падумаць... Пра некаторыя варыянты карэспандэнты «Звязды» вырашылі даведацца больш падрабязна.

Наталіць «сонечны голад»

Тут ехаць нікуды не трэба, размова пра добра вядомую рэч — салярыі. Да нядаўняга часу лічылася, што гэта выключна жаночая працэдура. Тым не менш цяпер і некаторыя маладыя хлопцы не саромеюцца паляжаць ці пастаяць пару хвілінак пад лямпамі. У Мінску наведванне салярыя можна знайсці на любы кашалёк. Кошты — ад 2,5 да 8 тысяч рублёў за хвіліну загару. Можна знайсці і яшчэ больш танны салярый, калі, напрыклад, натрапіць на той, што прадастаўляе зніжкі студэнтам.

— Для першых сеансаў дастаткова трохпяці хвілін, — расказала адміністратар аднаго са сталічных салонаў прыгажосці. — Колькасць сеансаў залежыць ад тыпажу знешнасці, тыпу скуры. Гэта вам падкажа спецыяліст, калі вы прыйдзеце на працэдуру. Зразумела, смуглявыя людзі з цёмнымі валасамі і светласкурыя бландзіны загараюць розную колькасць часу. У сярэднім для прыгожага загару варта наведаць прыкладна дзесяць сеансаў.

Ёсць думка, што, акрамя шакаладнага колеру скуры, наведванне салярыя можа дапамагчы папоўніць запас ультрафіялету і стаць своеасаблівай кампенсацыяй сонечнага святла, ад недахопу якога ў зімовыя месяцы псуецца настрой і адчуваецца пастаянная санлівасць. У тым жа салоне нам пацвердзілі, што зімой у іх сапраўды шмат кліентаў, якія не набываюць абанементы і не імкнуцца загарэць да «хрумсткай скарынкі», а наведваюцца пад лямпы раз на пару тыдняў, выкарыстоўваючы салярый выключна як сродак ад «сонечнага галадання».

У любым выпадку, замяняць ці не замяняць натуральнае сонца штучным — справа выбару. Галоўнае, перш чым выбіраць для сябе такі зімовы «рэлакс», даведацца, ці не нашкодзіць гэта вашаму здароўю. Усе абмежаванні па наведванні салярыя павінны вам патлумачыць у салоне, дзе такая паслуга маецца.

Папесціцца ў хвалях... басейна

Знайсці ўзімку цёплы бераг, дзе плёскаецца вада, не выязджаючы за межы краіны, магчыма. Калі пастарацца. У сталіцы ёсць некалькі спартыўных комплексаў з басейнамі, ды і многія школы і ўніверсітэты прадаюць абанементы ў свае басейны. Кошт залежыць у асноўным ад навізны басейна, ад тэхналогіі ачысткі вады ў ім і тых паслуг, якія ўваходзяць у кошт аднаго наведвання. Напрыклад, паплаваць 45 хвілін у адным з мінскіх спартыўных комплексаў каштуе 17,1 тыс. рублёў, а разавае наведванне басейна ў іншым пацягне ўжо на 60 тысяч рублёў. Сума расшыфроўваецца проста: акрамя звычайнага плавання, у наведванне ўваходзіць, у прыватнасці, і саўна, таму час наведвання павялічваецца да 90 хвілін.

Як аказалася, паходы ў басейн — сярод мінчан занятак досыць папулярны. Прынамсі, калі меркаваць па загружанасці ў самыя папулярныя часы — раніцай, пакуль не пачалася праца, увечары і на выхадных.

— Скажыце, калі ласка, у які час найбольш рэальна можна трапіць паплаваць, калі я яшчэ не маю абанемента? — цікаўлюся ў адміністратара (трэба сказаць, тэлефанавала ў будны дзень).

— Пакуль што вольна на 14.00 і на 15.00. Астатнія гадзіны занятыя.

— Не, гэта нязручна. А заўтра які расклад?

Аказалася, заўтра да 12 гадзін басейнам карыстаюцца наведвальнікі саўны, пазней, прыкладна да 14.00 — трэніроўка спартсменаў. А наконт той часткі дня, што засталася, ніякіх прагнозаў даць не змаглі, бо нельга прадказаць, колькі ўладальнікаў абанементаў вырашаць прыйсці. Паводле слоў адміністратара, у будныя дні часцей вольнымі аказваюцца гадзіны каля 11.00 і каля 15.00.

Цяпер пра кошт абанементаў. Нейкую сярэднюю лічбу назваць складана, бо кожны выбірае для сябе «свой» басейн і «сваю» колькасць наведванняў. У такім выпадку, прывядзём максімальныя цэны. Напрыклад, самы дарагі абанемент для дарослага каштуе 279 тысяч. Гэта дазволіць схадзіць у басейн 9 разоў на працягу месяца, сеансы будуць па 45 хвілін. Дзіцячы абанемент на гэтую ж колькасць наведванняў — 270 тысяч. Для абанементаў ёсць шмат іншых варыяцый, як, напрыклад, сямейны для двух дарослых і дзіцяці, аднаго дарослага і дзіцяці, дарослага і дваіх дзяцей. Кошт будзе разлічвацца ў адпаведнасці з вашымі запатрабаваннямі адносна колькасці наведванняў.

Палюбавацца экзатычнымі раслінамі

У месцах, дзе гэтая прыгажосць вырастае і разрастаецца, звычайна цёплае і прыемнае вільготнае паветра, так што, акрамя эстэтыкі, можна яшчэ і сагрэцца з марозу, калі што. Пачалі цікавіцца, дзе ж у Мінску магчыма наведаць аранжарэю і колькі гэта будзе каштаваць. Удалося знайсці тры такія месцы. Па-першае, аранжарэя Цэнтральнага батанічнага сада. Пагуляць сярод зеляніны можна штодзень акрамя панядзелка, з 10 да 20 гадзін. Акрамя 20 тысяч рублёў (ці 10 тысяч, калі вы — студэнт, пенсіянер ці школьнік) за ўваход у батанічны сад, давядзецца аддаць яшчэ 10 тысяч рублёў за наведванне самой аранжарэі.

Наступны варыянт — аранжарэя Рэспубліканскага эколага-біялагічнага цэнтра, які знаходзіцца на вуліцы Макаёнка. Тут рэгулярна праводзяць экскурсіі для школьнікаў. Для групы экскурсія абыдзецца ў 20 тысяч рублёў, для аднаго-двух чалавек — крыху танней. Аранжарэя, вядома, не такая разнастайная, як папярэдняя, але ў гэтую суму ўваходзіць экскурсія па ўсім цэнтры, дзе можна пабачыць яшчэ і заалагічны куток і яго сімпатычных жыхароў, акварыумны клас, а таксама яшчэ шмат цікавага.

Аранжарэя ёсць і на біялагічным факультэце БДУ. Будынак месціцца на вуліцы Курчатава. Асаблівасць факультэцкай аранжарэі ў тым, што яна знаходзіцца на даху, і відаць яе яшчэ здалёк.

Тэлефануем, каб даведацца, колькі каштуе экскурсія:

— Бясплатна! — здзіўляе адказам супрацоўніца біяфака.

Трэба толькі загадзя патэлефанаваць і даведацца, у які час лепей прыйсці. Акрамя прыемна праведзенага часу, тут вы зможаце атрымаць і пэўныя парады па доглядзе раслін, калі цікавіцеся нечым падобным.

Адчуць сябе «спелеолагам»

Калі людзі падарожнічаюць па замежных краінах, часта многім цікава паглядзець на горы, гроты, пячоры і іншыя дзівосы прыроды. Так званыя саляныя пячоры вядомыя сваімі гаючымі ўласцівасцямі. Падыхаць насычаным соллю паветрам, як на моры, лічыцца карысным, напрыклад, для тых, хто часта прастывае, мае хранічныя захворванні органаў дыхання ці праблемы са скурай. У Мінску такая саляная пячора таксама ёсць.

— Спелеатэрапія карысная не толькі хворым людзям, — патлумачылі нашаму карэспандэнту ў цэнтры марскога клімату. — Многія наведваюць сеансы выключна для падтрымання імунітэту. Гэта таксама вельмі спрыяе добраму самаадчуванню на працягу дня.

Пасядзець 30-40 хвілін ва ўтульнай абстаноўцы штучнай саляной пячоры каштуе 40,8 тысячы рублёў да 12 гадзін дня, і 51 тысячу — пасля абеду.

«Пазмагацца» з высокімі тэмпературамі

Звычайна летам людзі нібыта дзеляцца на два лагеры: адны ад спёкі пакутуюць, а іншыя не могуць нацешыцца. Вось якраз для тых, хто жыцця не ўяўляе без высокага градуса, наведванне зімой саўны можа быць сапраўдным выйсцем. Пад высокім градусам маецца на ўвазе, зразумела, тэмпература паветра.

Сталічныя прапановы наконт аказання паслуг аматарам саўны радуюць вока сваёй колькасцю, а вось коштам некаторыя могуць і засмуціцца. Так, звычайная саўна без лішняй раскошы, з досыць простым інтэр'ерам будзе каштаваць 170—180 тысяч рублёў за гадзіну. Можна пайсці з сябрамі, тады сума дзеліцца на некалькі чалавек, але звычайна невялікія саўны робяць агаворку, што наведнікаў павінна быць не больш за 4-5 чалавек.

Больш раскошныя і прасторныя месцы каштуюць даражэй: 250, 300, 350 тысяч за гадзіну.

Сярод шматлікіх аб'яў увагу патэнцыйнага арандатара саўны, які хацеў бы пайсці туды вялікай кампаніяй, можа прыцягнуць наступны варыянт. Катэдж у прыгарадзе Мінска, саўна вялікая, са шматлікімі радасцямі накшталт горак і вадзяных падушак, пры жаданні можна заказаць ежу і напоі... Узровень, відавочна, іншы. Кошты таксама. Гаспадары прасілі 300 долараў за 5 гадзін адпачынку.

Узнавіць летнюю рамантыку

Ночы ўлетку кароткія і цёплыя, самы час для прагулак і рамантычнага настрою. Зімой на халоднай вуліцы нават самыя апантаныя рамантыкі пераключаюцца на думкі пра цёплую вопратку, тут не да шпацыраў ужо. Але калі прыхільнасць да іх з лета засталася, што ж з ёй рабіць? У інтэрнэце ўдалося знайсці цікавы варыянт, які завецца «Кінапакой». Гэта своеасаблівы кінатэатр для невялікай колькасці людзей (на адзін сеанс — не больш за 4 чалавекі), які працуе з 16 гадзін вечара да 8 раніцы, акурат адпавядае часу зімовых прыцемак.

У пакоі маецца зручная канапка і вялікі тэлеэкран з добрай гукавой сістэмай. Кіно вы можаце прынесці сваё, а можаце выбраць з таго, што ўжо ёсць у «Кінапакоі».

Каштуе такое баўленне часу 1,4 тысячы рублёў за хвіліну. Значыць, за прагляд фільма працягласцю ў 1 гадзіну 20 хвілін выходзіць 168 тысяч рублёў. У пакоі можна зачыняцца, прыносіць з сабой ежу і напоі, але нельга курыць.

Ганна ГАРУСТОВІЧ. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Вызволенье, деревне Пекалин ПЕКАЛИНСКОГО СЕЛЬСОВЕТА СМОЛЕВИЧСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

1.	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2.	**Дата, время и место проведения аукциона**	22 февраля 2013 года в 15.00, д. Пекалин, ул. Ленина, 34, Пекалинский сельисполком, зал заседаний
3.	**Продавец и его адрес**	Пекалинский сельисполком, д. Пекалин, ул. Ленина, 34
4.	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	**Лот № 1 –** площадь 0,15 га № 624883601601000071 д. Вызволенье **Лот № 2 –** площадь 0,2033 га № 624883603601000235 д. Пекалин **Лот № 3 –** площадь 0,1423 га № 624883603601000245 д. Пекалин
5.	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6.	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания жилого дома
7.	**Начальная (стартовая) цена продажи**	**Лот № 1 –** 17 693 550 рублей **Лот № 2 –** 63 352 380 рублей **Лот № 3 –** 31 262 910 рублей
8.	**Условия аукциона**	А) продажа по цене не ниже начальной Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9.	**Наличие инженерной инфраструктуры**	д. Вызволенье – электроснабжение; д. Пекалин, ул. Приозерная – электроснабжение, водоснабжение, водоотведение, газоснабжение; д. Пекалин, ул. Ленина – электроснабжение, газоснабжение, асфальтированный подъезд
10.	**Условия оплаты**	За безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11.	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3600627070008 ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиал № 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04901 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
12.	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками**	Каждая среда в 12.00
13.	**Окончательный срок приема документов**	15 февраля 2013 года в 17.00
14.	**Контактный телефон**	8 01776 61 624, 61 634, Vel 314 43 01

Расходы по организации и проведению аукциона (лот № 1 – 1 779 341 рубль, лот № 2 – 1 691 389 рублей, лот № 3 – 2 259 882 рубля), затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

***Примечания:* для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.

3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

УНН 600046601

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 22 февраля 2013 года проводит открытый аукцион

на право заключения договоров аренды земельных участков в Минском районе

		Лот 1	Лот 2	Лот 3	Лот 4	Лот 5
1	**Адрес земельного участка**	Минский район, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 2	Минский район, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 4	Минский район, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 5	Минский район, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 6	Минский район, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 7
2	**Кадастровый номер**	623680604601000728	623680604601000721	623680604601000729	623680604601000726	623680604601000727
3	**Площадь земельного участка**	0,1260 га	0,1287 га	0,1323 га	0,1238 га	0,0747 га
4	**Срок аренды (лет)**	99	99	99	99	99
5	**Целевое назначение**	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома	Для строительства и обслуживания жилого дома
6	**Инженерная инфраструктура ***	электричество, газ	электричество, газ	электричество, газ	электричество, газ	электричество, газ
7	**Расходы по подготовке документации (рублей)**	3 114 420	2 852 560	2 870 790	2 845 090	3 823 340
8	**Начальная цена права заключения договора аренды**	13 400 долларов США	13 687 долларов США	14 070 долларов США	13 166 долларов США	7 944 доллара США
9	**Задаток (рублей)**	23 000 000	23 500 000	24 200 000	22 600 000	13 600 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 22.02.2013 г. в 10:30. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8:00 до 17:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 18.02.2013 г. в 17:00. Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе **на Лоты 1-5** перечисляется на расчетный счет № 3641900000163 Боровлянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2. документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка;

3. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в аренду единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, заключает с ним договор аренды земельного участка, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

**** в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.***

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 22 февраля 2013 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Инженерная инфраструктура *	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Боровлянский с/с, д. Боровляны, участок № 1	623680601101002400	0,1454 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	2 915 967	600 000 000	120 000 000
2	Горанский с/с, д. Байдаки	623681300601000037	0,1285 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	5 106 116	71 000 000	14 200 000
3	Горанский с/с, п. Звенячи	623681306101000074	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ	5 157 538	81 000 000	16 200 000
4	Горанский с/с, д. Крылово	623681310101000087	0,1244 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	5 440 565	84 000 000	16 800 000
5	Горанский с/с, д. Крылово	623681310101000077	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	4 487 519	101 000 000	20 200 000
6	Горанский с/с, д. Крылово	623681310101000079	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	4 487 519	101 000 000	20 200 000
7	Горанский с/с, д. Крылово	623681310101000080	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	4 487 519	101 000 000	20 200 000
8	Горанский с/с, д. Крылово	623681310101000081	0,1432 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	4 662 729	97 000 000	19 400 000
9	Горанский с/с, д. Крылово	623681310101000082	0,1051 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	4 753 830	71 000 000	14 200 000
10	Крупицкий с/с, д. Аннополь	623683900101000175	0,1277 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	5 153 604	80 000 000	16 000 000
11	Крупицкий с/с, п. Аннополь	623683900601000054	0,1429 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, водопровод	3 669 461	43 000 000	8 600 000
12	Крупицкий с/с, д. Дубинки	623683903101000051	0,1613 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	660 566	42 000 000	8 400 000
13	Крупицкий с/с, д. Закружка	623683905101000127	0,1499 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	4 567 073	49 000 000	9 800 000
14	Крупицкий с/с, д. Каралино, участок № 7	623683905601000114	0,1494 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	-	55 000 000	11 000 000
15	Крупицкий с/с, д. Пятевщина	623683908101000384	0,1188 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	4 358 005	65 000 000	13 000 000
16	Михановичский с/с, д. Березина, участок № 4	623684200601000033	0,1445 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	84 000	58 000 000	11 600 000
17	Михановичский с/с, д. Березина, участок № 13	623684200601000038	0,1536 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	84 000	62 000 000	12 400 000
18	Михановичский с/с, д. Гребенка	623684201601000052	0,1508 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	300 000	25 000 000	5 000 000
19	Михановичский с/с, д. Гребенка	623684201601000047	0,2002 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	300 000	33 000 000	6 600 000
20	Михановичский с/с, д. Кайково, участок № 1	623684202601000218	0,1533 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	300 000	59 000 000	11 800 000
21	Михановичский с/с, д. Кайково, участок № 8	623684202601000235	0,1540 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	-	60 000 000	12 000 000
22	Михановичский с/с, д. Кайково	623684202601000268	0,1468 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	3 500 000	100 000 000	20 000 000
23	Михановичский с/с, д. Плебанцы, участок № 3	623684205601000121	0,2414 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, водопровод	2 000 000	94 000 000	18 800 000
24	Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, участок № 17	623684206601000267	0,1365 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	300 000	53 000 000	10 600 000
25	Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, участок № 21	623684206601000226	0,1529 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	105 000	59 000 000	11 800 000
26	Михановичский с/с, аг. Чуриловичи	623684206601000312	0,1494 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	3 350 000	115 000 000	23 000 000
27	Новодворский с/с, аг. Гатово	623684301601000596	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	2 964 247	125 000 000	25 000 000
28	Новодворский с/с, аг. Гатово	623684301601000595	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	2 964 247	128 000 000	25 600 000
29	Новодворский с/с, д. Ельница	623684303101000425	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	2 964 250	105 000 000	21 000 000
30	Новодворский с/с, д. Ельница	623684303101000424	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	2 964 250	105 000 000	21 000 000
31	Новодворский с/с, д. Ельница	623684303101000423	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	2 964 250	105 000 000	21 000 000
32	Новодворский с/с, д. Ельница	623684303101000422	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	2 964 250	105 000 000	21 000 000
33	Новодворский с/с, д. Королищевичи	623684304601000512	0,1050 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	2 910 320	65 000 000	13 000 000
34	Новодворский с/с, д. Мацевичи	623684305101000124	0,1000 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	2 875 500	33 000 000	6 600 000
35	Новодворский с/с, д. Мацевичи	623684305101000125	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	2 875 500	49 000 000	9 800 000
36	Новодворский с/с, д. Мацевичи	623684305101000126	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	2 875 500	49 000 000	9 800 000
37	Роговский с/с, д. Агарки	623685800101000065	0,1491 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	4 968 050	23 000 000	4 600 000
38	Роговский с/с, д Новый Двор, ул. Юбилейная	623685813601000248	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	-	27 000 000	5 400 000
39	Роговский с/с, д. Рогово	623685817101000086	0,1441 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	5 019 470	21 000 000	4 200 000
40	Хатежинский с/с, д. Васьковщина, участок № 1	623687501101000062	0,1417 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, водопровод	3 479 246	150 000 000	30 000 000
41	Хатежинский с/с, д. Васьковщина, участок № 2	623687501101000061	0,1417 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, водопровод	3 479 246	150 000 000	30 000 000
42	Хатежинский с/с, аг. Хатежино, ул. Комсомольская	623687508101001275	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	3 479 246	300 000 000	60 000 000
43	Юзуфовский с/с, д. Гатовино	623688202101000080	0,1445 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, газ, водопровод	4 968 050	26 000 000	5 200 000
44	Юзуфовский с/с, д. Жуковка	623688203101000145	0,1489 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество, водопровод	4 072 945	34 000 000	6 800 000
45	Юзуфовский с/с, д. Масловичи	623688205601000298	0,1349 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	4 968 050	35 000 000	7 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 22.02.2013 г. в 10:00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8:00 до 17:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 18.02.2013 г. в 17:00. Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000163 Боровлянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На Лоты 2-9 перечисляется на расчетный счет № 3641900000150 Горанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 10-15 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 Крупицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лоты 16-26 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 Михановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова,2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лоты 27-36 перечисляется на расчетный счет № 3641900000176 Новодворского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова,2, код 520, УНП 600230217, код платежа – 04901.

На Лоты 37-39 перечисляется на расчетный счет № 3641900000059 Роговского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052358, код платежа – 04901.

На Лоты 40-42 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 Хатежинского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

На Лоты 43-45 перечисляется на расчетный счет № 3641900000147 Юзуфовского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2. документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка;

3. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

**** в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.***

■ Інфарм-укол

ТЫТУНЬ «ДУШЫЦЬ» ПЛОД

Жанчыны-курцы наносяць шкоду не толькі ўласнаму здароўю, але і здароўю нашчадкаў. Нездарма цяжарную з цыгарэтай у руцэ называюць злачынцай.

— Крывяносныя сасуды плода непасрэдна звязаны з сістэмай кровазвароту маці, таму падчас курэння ўсе кампаненты тытунёвага дыму, якія трапляюць у кроў маці, пранікаюць праз плацэнту ў арганізм яшчэ не народжанага дзіцяці, — тлумачыць **медсястра 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына ШАЎЦОВА.** — Арганізм плода працуе ў гэтым выпадку, як акумулятар ядаў тытуню. Канцэнтрацыя вокісу вугляроду ў тканках плода нават вышэй, чым у самой жанчыны. Таму дзіця проста асуджана ў далейшым на розныя захворванні.

● Паражэнне нікацінам у ранніх тэрміны цяжарнасці найбольш небяспечнае, паколькі можа прывесці да глыбокіх дэфектаў развіцця. Уздзеянне нікаціну пасля 4 месяцаў цяжарнасці і пазней, калі фарміраванне плода амаль завершана, можа выклікаць выкідыш, заўчасныя роды, нараджэнне аслабленага дзіцяці.

● У дыме цыгарэт выяўлены мутагенныя рэчывы, якія пашкоджваюць храмасомы — носьбіты спадчынасці. Таму можна сказаць, што жанчына, якая курыць, істотна павялічвае рызыку нараджэння дзіцяці з анамаліямі. Павышаная колькасць угарнага газу ў крыві цяжарнай жанчыны-курца перашкаджае паступленню кісларoду ў арганізм будучага дзіцяці. Калі жанчына выкурвае да 20 цыгарэт у дзень, можна сказаць, што яна на працягу 2,5-5 гадзін штодня падвяргае ненароджанае дзіця «ўдушэнню».

● Даследаванні сведчаць і практыка даказвае, што выкідышы, кровацячэнні, ускладненні пры родах, мёртванароджанні або нараджэнне дзіцяці з дэфектамі — тая цана, якую павінна заплаціць маці-курэц.

● У літры мацярынскага малака жанчыны, якая курыць, змяшчаецца да 0,5 міліграмаў нікаціну. Смяротная ж доза для немаўляці — 1 міліграм на 1 кг вагі. Таму ў такіх матуль нованароджаныя паводзяць сябе неспакойна, нярэдка адмаўляюцца ад «пракуранага малака», а значыць, недаядаюць.

● З наступствамі курэння звязаны кожны выпадак дзіцячай смяротнасці. Дзеці маці-курцоў на працягу першага года жыцця ў 2 разы часцей хварэюць на бранхіт, запаленне лёгкіх, адстаюць у фізічным і псіхічным развіцці.

● У такіх дзяцей павялічваецца рызыка развіцця анкалагічных захворванняў. Нават ва ўзросце 7 гадоў у многіх з іх назіраюцца тыя ці іншыя паталагічныя змены, уласцівыя самім курцам.

ШУКАЙЦЕ СТРАЧАНЫ СЭНС!

Самазабойства — тэма, пра якую не прынята гаварыць у нашай культуры. Аднак для нашай краіны гэта досыць сур'ёзная сацыяльная праблема. Беларусь займае трэцяе месца па колькасці суіцыдаў у Еўропе. У апошнія гады колькасць такіх выпадкаў дасягнула амаль 2,5 тыс. чалавек у год.

Паводле слоў **урача-псіхатэрапеўта 1-й кваліфікацыйнай катэгорыі Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў Аксаны БЯЛАН,** сярод асноўных прычын суіцыдальных паводзін можна назваць страту цікавасці да жыцця, смерць блізкага чалавека, страту працы або выхад на пенсію, хранічныя захворванні, якія суправаджаюцца, напрыклад, пастаянным болевым сіндромам, самыя розныя стрэсавыя сітуацыі.

Амаль палова людзей, якія ўчынілі суіцыд, знаходзіліся ў стане цяжкай дэпрэсіі або пакутавалі ад іншых псіхічных расстройстваў, але не звярталіся па прафесійную дапамогу або не следавалі лячэбным рэкамендацыям. Прычым алкаголь або ўжыванне іншых псіхаактыўных рэчываў значна павялічвалі рызыку суіцыдальных спроб.

Некаторыя ўскосныя прыкметы магчымай трагедыі павінны насцярожыць навакольных:

● змрочны настрой працяглы час;
● «патухлы» позірк;
● пазбяганне кантактаў або, наадварот, гіперактыўнасць;
● неўласцівая неакуратнасць у знешнім выглядзе;
● празмернае ўжыванне алкаголю, нікаціну;
● зніжэнне паказчыкаў у рабоце, вучобе;
● парушэнне сну;
● узмацненне апетыту або адмова ад ежы;
● неразборлівасць у палавых сувязях;
● частыя траўмы;
● канфлікты з законам.

Важная менавіта сукупнасць гэтых момантаў. У чалавека «на мяжы» часта прысутнічае дваякае стаўленне да самагубства. Гэтым і трэба скарыстацца. Лепшае, што можна прапанаваць, — цёплая размова, дэманстрацыя шчырага жадання дапамагчы.

Наогул кожнаму з нас неабходна больш адказна ставіцца да ўласнага псіхічнага здароўя. А для гэтага неабходна:

— вырашаць канфлікты;

— падтрымліваць цёплыя адносіны са сваякамі і блізкімі;

— мець вольны час для хобі;

— гуляць на свежым паветры, займацца спортам.

Калі ж узняць настрой і жыццёвы тонус не ўдаецца больш за месяц, трэба звярнуцца да псіхатэрапеўта.

Інфармацыю аб рабоце псіхатэрапеўтаў Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў можна атрымаць па нумары: 245 61 74. Можна пазваніць і ў службу даверу экстраннай псіхалагічнай дапамогі, якая працуе кругласутачна: 290 44 44.

Святлана БАРЫСЕНКА

ЯКІ ГРЫП «КОСІЦЬ» АМЕРЫКАНЦАЎ І ЕЎРАПЕЙЦАЎ?

Па звестках Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, актыўнасць грыпу на еўрапейскім кантыненце паступова нарастае. Найбольш актыўная цыркуляцыя грыпу назіраецца пераважна ў заходняй і паўднёвай Еўропе, а ва ўсходняй яе частцы назіраецца пакуль што толькі спарадычная актыўнасць вірусаў грыпу або яе адсутнасць. Вірусы грыпу А (H1N1), А (H3N2) і грыпу В цыркулююць паралельна, аднак частата выяўлення вірусаў А (H1N1) узрастае. Колькасць шпіталізацый у сувязі з захворваннем еўрапейцаў на цяжкую вострую рэспіраторную інфекцыю застаецца стабільнай, 8% выпадкаў шпіталізацый звязаны з захворваннем на грып.

Частата зваротаў па медыцынскую дапамогу ў сувязі з грыпападобнымі захворваннямі і ВРІ працягвае расці ў краінах паўночнай і заходняй Еўропы, а таксама ў Ізраілі. У Бельгіі, Даніі, Ірландыі, Нідэрландах захваральнасць перавысіла ўстаноўлены эпідэмічны парог.

У Беларусі таксама адзначаецца рост захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі, аднак захваральнасць знаходзіцца на неэпідэмічным узроўні. Сярод захварэлых пераважае дзіцячае насельніцтва — 54,1%. Вынікі вірусалагічнага маніторынгу сведчаць аб спарадычных выпадках цыркуляцыі вірусаў грыпу А (H1N1), а таксама аб цыркуляцыі негрыпозных рэспіраторных вірусаў.

Апошнім часам у некаторых СМІ з'явіліся паведамленні аб непацверджаных лятальных выпадках у розных частках свету, звязаных з грыпам А (H1N1). Аўтары гэтых паведамленняў называюць вірус грыпу А (H1N1) «свіным грыпам», уносячы пэўную блытаніну. Вірус грыпу А (H1N1) цыркулюе сярод людзей ужо тры гады, і з пандэмічнага ён ужо даўно стаў сезонным. Гэты штам вірусу не мае дачынення да вірусаў грыпу парсюкоў, пра якія паведамлялася ў данясеннях з ЗША.

Да таго ж захворванне на грып і сапраўды можа пагражаць чалавеку смяротным зыходам (асабліва гэта актуальна для людзей, якія маюць хранічныя захворванні), менавіта таму і прапагандуецца актыўна кожны год вакцынацыя насельніцтва ад грыпу.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Форумы

У ТЭАТРАЛЬНЫХ ЗАЛАХ БУДЗЕ ГАРАЧА

Упершыню на форуме «М.@rt.кантакт» пакажуць спектакль пад адкрытым небам, а ва ўніверсітэтах Магілёва адбудуцца чыткі п'ес.

На прэс-канферэнцыі ў Магілёўскім абласным драматычным тэатры аб'явілі: міжнародны моладзевы тэатральны форум «М.@rt.кантакт» пройдзе з 21 па 27 сакавіка.

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама і старшыня арганізацыйнага камітэта форуму Валерый Малашка расказаў, што за 7 гадоў на «М.@rt.кантакце» паказалі больш за 90 спектакляў, якія прадставілі тэатральныя калектывы з 12 краін, а паглядзелі іх больш за 20 тысяч чалавек.

— Самая галоўная мэта форуму — прыцягнуць людзей у тэатральныя залы, вярнуць цікавасць да тэатра, — нагадаў **Валерый Малашка**. — І мне падаецца, што гэта ў нас атрымаецца.

Сёлетняя праграма форуму насычаная: 14 спектакляў, 8 краін. Свае творы пакажуць тэатры з Санкт-Пецярбурга, Масквы, Чарнігава, Рыгі, Ерэвана, Вільнюса, Кішынёва, а таксама Мінска, Магілёва і Брэста. Сярод іх — вядомыя тэатральныя трупы, а ў пастаноўках возьмуць удзел у тым ліку і папулярныя акцёры, якіх гледачы бачаць у любімых тэлевізійных серыялах. Адметнасцю сёлетняга форуму стане ўдзел лялечных тэатраў.

Між тым, у праграме, папярэдзілі арганізатары, ёсць вострыя, спрэчныя і эксперыментальныя спектаклі, якія абавязкова выклічуць сутыкненне меркаванняў крытыкаў і гледачоў. Але ўсе яны цікавыя і знаходзяцца ў межах канцэпцыі форуму: пра моладзь, ад моладзі, для моладзі.



На плошчы каля гарадской Ратушы ў адзін з вечароў (і пры любым надвор'і) адбудзецца спектакль на адкрытым паветры. «Пахаванне Кармэн» пакажа тэатр з Польшчы. Паглядзець на гэта зможа бясплатна любы чалавек. Дырэктар Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра Андрэй Новікаў паабяцаў, што будзе шмат святла, агню і хадуляў, і ўвогуле, павінна атрымацца цікавае відовішча.

Дзеля больш шчыльнага кантакту з шырокай моладзевай аўдыторыяй традыцыйная на форуме чытка п'ес адбудзецца не для вузкага кола спецыялістаў, а ў залах трох магілёўскіх універсітэтаў. Уваход — свабодны, для абмеркавання запросяць усіх зацікаўленых студэнтаў.

Кошт білетаў на спектаклі форуму — ад 40 да 100 тысяч рублёў. Гэта, паводле меркавання арганізатараў, не вельмі значныя сумы, што тлумачыцца бюджэтнай падтрымкай культурнага мерапрыемства. Іншыя — больш значныя — давядзецца заплаціць тым, хто пажадае трапіць на так званыя камерцыйныя спектаклі. Яны сёлета ўпершыню адбудуцца падчас форуму, але па-за яго асноўнай праграмай — пакуль афіша камерцыйных спектакляў удакладняецца. Білеты на спектаклі «М.@rt.кантакту» паступілі ў продаж 21 студзеня.

Ілона ІВАНОВА

ЗДЫМАЧНАЯ ПЛЯЦОЎКА — СТАНЦЫЯ ДУБІЦА

Чыгуначная станцыя Дубіца — самая паўднёвая ў Брэсцкім раёне — не раз прыцягвала рэжысёраў, якія здымаюць кіно аб падзеях канца XIX — першай паловы XX стагоддзяў. Стала вядома, што ў апошнія дні студзеня тут пройдуць здымкі эпізодаў украінска-расійскага фільма «Святіцель-хірург».

Гэта будзе першы мастацкі фільм пра жыццё святіцеля Лукі (Валянціна Война-Ясенецкага) — аднаго з ярчэйшых і трагічных лёсаў XX стагоддзя. Фільм «Святіцель-хірург» пачалі здымаць ва Украіне восенню. У Дубіцы плануецца адзняць адзін з самых трагічных эпізодаў — пагрузка эшалона вязняў для адпраўкі ў лагер. Галоўную ролю выконвае Віталь Бязрукаў — бацька «зоркі» расійскага тэлеэкрана Сяргея Бязрукава.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Даты | Падзеі | Людзі

859 год — першыя летапісныя згадкі пра племянны саюз крывічоў, групу ўсходніх славян, якія займалі тэрыторыю верхняга цячэння Дняпра, Заходняй Дзвіны, Волгі, паўднёвай часткі басейна Чудскога возера. На думку некаторых навукоўцаў, назва «крывічы» азначае «блізкія па паходжанні» («па крыві»), іншыя даследчыкі спасылаюцца на паганскага першасвятара Крыва-Крывейту.

1937 год — у Маскве, у Кастрычніцкай зале Дома Саюзаў, пачаўся другі працэс над буйнымі дзеячамі партыі, вядомымі прадстаўнікамі «ленінскай гвардыі». Першы працэс, які завяршыўся пакараннем смерцю Зіноўева, Каменева і іншых актыўных апазіцыянераў, прайшоў крыху раней. Галоўнымі фігурантамі другога працэсу былі Пятакоў, Радэк, Сакольнікаў і Серабракоў. Хоць гэта былі постаці не такія значныя, чым падсудныя на папярэднім працэсе, суд над імі меў вялікае значэнне. Яго мэтай было паказаць, што трацкісты ў СССР яшчэ недабітыя, і падрыхтаваць наступныя працэсы — над лідарамі правых Бухарыным і Рыкавым і над ваеннымі. Усеагульную ўвагу прыцягнула тое, што на гэтым працэсе ў адпаведным кантэксце было ўпершыню згадана імя маршала Тухачэўскага. Гэта зрабіў Радэк, які актыўна «супрацоўнічаў» з абвінавачаннем, — беспрынцыпны авантурыст, якога яшчэ Чэрчыль у 1917 годзе назваў адным з галоўных нягоднікаў, вінаватых у рускай трагедыі. Большасць падсудных было расстраляна. Радэку захавалі жыццё, але праз два гады, згодна з афіцыйнай версіяй, ён быў забіты ў лагеры крымінальнікам.

1942 год — нарадзіўся (вёска Малышэвічы Слуцкага раёна) Уладзімір Міхайлавіч Калешка, беларускі вучоны ў галіне мікра- і наназлектронікі, інфарматыкі, інтэлектуальных сістэм, доктар тэхнічных навук, прафесар. Заслужаны радыст СССР, заслужаны вынаходнік СССР. Аўтар навуковых прац і вынаходак па мікра-, акуста-, бія- і наназлектроніцы, мікрапрацэсарных сэнсарных сістэмах і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Было сказана

Максім БАГДАНОВІЧ (1891-1917), паэт, перакладчык, публіцыст:

«Баронячы наш народ, мы павінны бараніць і нашу культуру. І што б там ні было, а гмах яе, калісьці распачаты, павінен быць збудованы да канца».

Zамор'е Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

ПАВЕТРАНЫ ПАЦАЛУНАК З ДАСТАЎКАЙ

Сінгапурскі даследчык з Лабараторыі сацыяльнай робататэхнікі Хуан Самані стаў шырока вядомым дзякуючы свайму вынаходніцтву — кісенджару. Так вучоны назваў прыладу, здольную імітаваць і перадаваць пацалунак на адлегласці.

Знешне кісенджар нагадвае свінню-скарбонку невялікага памеру. Прылада мае пару штучных сенсарных вуснаў, якія ўзнаўляюць рухі.

Калі вы пажадаеце перадаць свой пацалунак на іншы кантынент, варта толькі ўзяць «свінку» ў рукі і страсна пацалаваць сіліконавыя вусны кісенджара.

Атрымальнік пацалунка робіць тое ж самае — і другая прылада са стапрацэнтнай дакладнасцю паўтарае рухі вашых вуснаў, аднаўляючы такім чынам рэальны пацалунак. Праўда, рамантычны настрой крыху збівае дзіўная асаблівасць робата: кожны раз, калі да яго дакранаюцца вуснамі, кісенджар рохкае, як сапраўдная (ва ўсіх сэнсах) свіння...

Тым не менш, калегі вынаходніка мяркуюць, што кісенджар мае вялізны камерцыйны патэнцыял і пры масавым выпуску будзе вельмі папулярным, асабліва ў азіяцкіх краінах.



СУДОКУ. *У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетці, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.*

					4			
6		9	1	2				4
4				5	3	1		
	3	4				6		5
				3				
2		5				8	3	
		7	4	1				3
1				8	2	9		7
			7					

Адказы на скандоку + судоку

Па гарызанталі: Гаршок. Сякагор. Агат. Гаюн. Азу. Кпр. Наган. Лягуш. Ха. Бэрэ. Літ. Ясакр. Знаца. Утора. Мак. Кардыя. Арэх. Таф. Іваді. Гг. «Абан». Сяржант. «Гаўпінка». **Па вертыкалі:** Хурма. Сіроп. Ратні. Прарэктар. Ротгар. Бэкхэда. Бэрун. Ржад. Аратар. Га. Сагоп. Энгрэма. Ачея. Кулага. Су. Атава. Кодэ. Арэса. Амфібрахій.

Судоку: адказы гл. у табліцы.

7	1	3	8	9	4	5	2	6
6	5	9	1	2	7	3	8	4
4	2	8	6	5	3	1	7	9
8	3	4	2	7	1	6	9	5
9	6	1	5	3	8	7	4	2
2	7	5	9	4	6	8	3	1
5	8	7	4	1	9	2	6	3
1	4	6	3	8	2	9	5	7
3	9	2	7	6	5	4	1	8

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.10	17.33	8.23
Віцебск	9.06	17.17	8.11
Магілёў	9.00	17.23	8.23
Гомель	8.50	17.27	8.37
Гродна	9.24	17.50	8.26
Брэст	9.19	17.57	8.38

Месяц

Першая квадра 19 студзеня. Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Анатоля, Макара, Паўла, Рыгора.*
К. *Марыі, Фернанды, Раймунда, Яна.*

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— А як вы жывяце з вашым мужам?
— Вой, ведаеце, выдатна: ён вешае мне локшыну на вушы, а я акуратна намотваю яе яму на рогі...

За крадзеж з адэскага супермаркета жанчыну прыцягнулі да суда.

— Грамадзянка Цыпяровіч, — пытаецца суддзя. — Што менавіта вы скралі?

— Маленькую бляшанку з кансерванымі персікамі. У ёй было ўсяго шэсць персікаў.

— Шэсць персікаў, так... Суд прысуджае вам шэсць сутак турэмнага зняволення, па адным дні за кожны персік.

Жанчына забіта горам і ледзь не страчвае прытомнасць, а яе муж ускоквае з месца і крычыць:

— Ваша чэсць! А яшчэ яна скрала бляшанку зялёнага гарошку!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 25.903. Індэкс 63850. Зак. № 383.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 22 студзеня 2013 года.